# ГІСТОРЫЯ АДНАГО ЗЛАЧЫНСТВА

**апавяданьні і аповесьць**

KAMUNIKAT.org

**Бібліятэка часопіса Маладосьць**
**Менск**
**1993**

**ЗЬМЕСТ**


**Міша з прастрэленым вухам**
**Дзень міру**
**Сьмерць Сьцяпана Кузьміча**
**Гісторыя аднаго злачынства. Аповесьць.**


KAMUNIKAT.org

# Міша з прастрэленым вухам

*апавяданьне*

Узьбягаючы па прыступках, Сьцяпан падняў галаву і ўбачыў валасатыя ногі Нінэль Міхайлаўны. Начальніца стаяла на лесьвічнай пляцоўцы паміж другім і трэцім паверхамі і, мяркуючы па ўсім, некага прабірала.

Гадзіньнік паказваў палову адзінаццатай. Каб не сустракацца з начальніцай такім нязручным часам, Сьцяпан зьбег на другі паверх, разгарнуў «Советскую Белоруссию» і, пазіраючы між радкоў, прыслухаўся.

-- Пра несуноў матэрыял падрыхтавалі? -- пыталася Нінэль Міхайлаўна перасельым ад курава голасам, і ў адказ ёй пачулася запабежлівае лепятаньне асыстэнткі Барановіч.

-- Жук затрымлівае... колькі разоў казала... – лепятала Барановіч, і Сьцяпан, пачуўшы сваё прозьвішча, брыдка вылаяўся.

На свой паверх ён дабіраўся запасным ходам. У левым крыле рэдакцыйнага будынку вось ужо другі год нешта рамантавалі, і запасны ход быў застаўлены розным малярскім начыньнем. Падымаючыся па лесьвіцы, Сьцяпан зачапіўся нагою за бочку з вапнаю, выцяўся лобам аб козлы, а выбраўшыся з гэтага хломазду, доўга абабіваў штаны, са злосьцю плюючы на далоні. Замкнуўшы пазычаным на вахце ключом дзьверы запаснога ходу, ён

паправіў гальштук, з турботлівым выглядам на твары рушыў па калідоры.

Навокал дзынкалі тэлефоны, кляцалі друкаркі, з жаночай прыбіральні далятаў вясёлы сьмех, а з прачыненых студыйных дзьвярэй на калідорны прасьцяг вырываліся зыкі, якія спачатку насьцярожылі, а потым насьмяшылі. Там, за дзьвярыма, нехта пакутліва ўздыхаў, жаласьліва вохкаў і бразгаў шкляным посудам. Сьцяпан зазірнуў у студыю і ўбачыў карэспандэнта абласнога радыё Сяргейчыка. Той сядзеў за мантажным сталом, пакутліва вохкаў і дрыжачай рукой наліваў у шклянку мінскую №2. На карэспандэнтавым твары ляжаў цень пахмельнай хваробы. Сьцяпан кашлянуў, працяў Сяргейчыка гіранічным позіркам, і калега, глынуўшы мінэралкі, зашэрхлым голасам прамовіў:

-- На раён езьдзілі. Да Цярэнція Пракопавіча.

Цярэнцій Пракопавіч Бядак, старшыня прыгараднай гаспадаркі «Шчасьлівы быт», у якога некалі невылазна сядзелі карэспандэнты, даўно ўжо нікога не частаваў, і Сьцяпан зь недаверам зірнуў на калегу.

-- Немцаў суправаджалі. Немцы шпрыцы ў больніцу прывезьлі. Вось Бядак і раскалоўся.

Карэспандэнт керхануў, прачышчаючы глотку, і кіўнуў на тэлефон:

-- Цябе тут начальства шукала.

-- Хто? Нінка?

-- Бяры вышэй. Сам Бацька тэлефанаваў. Загадаў, каб заўтра быў матэрыял па рэфэрэндуме.

-- Як заўтра? Я ж на чацьвер стаю... – прамармытаў Сьцяпан, прысеўшы на край стала.

-- Заўтра! -- гыркнуў Сяргейчык, імітуючы Бацькавы голас. – Перадача на Маскву ідзе. Праграма «Саюз». Чуў пра такую?

-- Чуў, -- выдыхнуў Сьцяпан, прыкусіўшы ніжнюю губу.

-- У мяне цесьць у Бараўлянах ляжыць, у шпіталі. Заехаў днямі... пІхнуў ім мікрафон пад нос, дык яны мне дзьве касэты нагаварылі, -- Сяргейчык хукнуў у жменю, глынуў мінскай №2.

-- Хто нагаварыў? -- не зразумеў Сьцяпан.

-- «Хто-хто»... Вэтэраны. Шпарыць як па напісаным. Ужо два разы ў этэр выходзіў. Толькі і выразаў, дзе клянуць Гарбачова ды пра венікі згадваюць.

-- Якія венікі? -- ізноў не зразумеў Сьцяпан.

-- Ну як якія... Калі мы ў Саюзе – мы што тыя венікі, -- Сяргейчык махнуў у паветры кулакамі, паказваючы, як цяжка зламаць венік, ды нечакана вякнуў, прыціснуў далонь да вуснаў і, закаціўшы вочы, вылецеў у калідор.

Зьбіраючыся з думкамі, Сьцяпан пералічыў дзіркі ў гукаізаляцыйных плітах, якімі былі абабітыя сьцены, дастаў з кішэні нататнік, перагарнуў старонкі, пацягнуўся да тэлефону. Палец з разважлівай павольнасьцю пакруціў дыск, у вуху засьпявалі гудкі, і неўзабаве слухаўка выбухнула пранізьлівым дзявочым голасам:

-- А-я...

-- Там у вас нічога добрага не даюць? -- запытаўся Сьцяпан, аддаляючы слухаўку ад вуха.

-- Грэчку даём. Па два кілё ў рукі, -- адказала дзяўчына, пасьля чаго голас ейны абарваўся, з тэлефонных нетраў данеслася няўцямнае: -- Тушонку не давайце! -- і слухаўка азвалася кароткімі гудкамі.

-- Па два кілё – гэта добра, -- прамармытаў Сьцяпан, глынуў Сяргейчыкавай мінэралкі і ўсхапіўся на ногі.

Адзінаццатая гадзіна, а на вуліцах пустэльна – ні машын, ні людзей. Дакладней, людзі ёсьць. Тоўпяцца ля крамаў у чаканьні іхнага адкрыцьця. А вось машын сапраўды не відно. Толькі і сустрэлася адна хлебавозка, што выехала на праспэкт з падваротні. Даішнікі на скрыжаваньні таксама

некуды пахаваліся: будка іхняя стаіць пустая, і нага машынальна цісьне на понаж. Стрэлка сьпідомэтру паўзе ўгору, застывае на лічбе «80»; унутры радыёкамітэтаўскай ламачыны штосьці грукае, і Сьцяпан, адпусьціўшы прытоплены понаж, з адчаем выдыхае:

-- І калі ўжо разваліцца?

«Масквіч» торгаецца, страляе выхлапнымі газамі.

З-пад колаў хлебавозкі, што ідзе наперадзе, струменіцца белая віхурка. Яна віецца па асфальце, губляецца ў прыдарожных кустах, і калі глядзець на яе, здаецца, што легкавік едзе неяк бокам. Мерачыся абагнаць хлебавозку, Сьцяпан цісьне на сыгнал, вырульвае на сярэдзіну праспэкту і скідвае хуткасьць. Абганяць хлебавозку няма сэнсу: праспэкт наперадзе забіты машынамі, а па сьценах навакольных будынкаў паўзе сінеча міліцэйскай мігалкі. Спыніўшы легкавік, Сьцяпан апускае шкло, глядзіць па баках.

-- Што там такое? -- крычыць ён гарбатаму дзеду, які сунецца па ходніку.

-- Бэнээфаўцы мітынг ладзяць! -- гукае дзед, матлянуўшы сеткай з двума батонамі. Адкашляўшыся, стары крычыць яшчэ нешта, але слоў не разабраць – непадалёку надрыўна гудзе легкавушка.

Чырвоны «жыгуль» з надпісам «Тэлебачаньне» на дзьверцы пралятае міма, узьняўшы ў паветра сьнежную замець. Сьнег іскрыцца на сонцы, халадзіць шчаку. Сьцяпан лаецца, падымае шкло і, не чакаючы, пакуль асядзе зіхоткі пыл, разварочвае машыну.

У чырвоных «жыгулях» паехаў Толік Стральчук з апэратарам. Стральчук – маёр КГБ. Езьдзіць па мітынгах, бярэ інтэрвію ў актыўных мітынгоўчыкаў. Тое-сёе, праўда, і на тэлебачаньне дае, у праграму «Відэарама», але гэта так – дзеля камуфляжу.

-- Выжла, -- мармыча Сьцяпан і заварочвае з вуліцы Ўрыцкага на вуліцу Валадарскага.

Да крамы дарога ня блізкая. Пакуль даедзеш – увесь бэнзын спаліш. Але ехаць трэба: кожны матэрыял, што ідзе на Маскву, Нінэль Міхайлаўна праслухоўвае і ўласнаручна падпісвае ў этэр. Тут мантаж з накладзеным фонам ня пройдзе. Жывая гаворка патрэбная. І каб усе ў адзін голас Саюз падтрымлівалі. Вось і даводзіцца ў вэтэранскую краму езьдзіць, адстаўнікоў запісваць.

Нейкая бабуля бяжыць на чырвонае сьвятло, Сьцяпан спалохана круціць руль, лаецца, а яшчэ праз імгненьне зноўку варушыць вуснамі, рэпеціруючы інтэрвію з адстаўнікамі.

Ля крамных дзьвярэй – цэлая вайна. Адны выходзяць, другія заходзяць, трэція проста стаяць на ганку, і ў краму не прапхнуцца. Сьцяпан прыўзьнімаецца на дыбачках, аглядае натоўп, а згледзеўшы знаёмцаў, кісла пасьміхаецца. Ды і як не пасьміхнуцца, зірнуўшы на таго ж Усьціна Капітонавіча Дуба, былога ваенкама. Змакрэлы, дарэшты разьюшаны, Усьцін Капітонавіч нешта крычыць, трасе пад галавою чырвоным пасьведчаньнем, і па ягоных крыках можна зразумець, што гандляры прыхавалі на складзе нейкі тавар. Побач зь ім махае поліэтыленавай торбаю былая загадчыца парткабінэту Кароткая, а паміж імі, заціснуты з усіх бакоў, торгае лысай галавой былы інструктар ДТСААФ Варывончык. Варывончык трымае над галавой падраны мяшэчак з грэчкаю, і крупы ценькім цурком сыплюцца яму на лысіну.

Позірк Сьцяпанавы адразу ж засяродзіўся на шыракаплечым вэтэране ў бобрыкавым палітоне. Вэтэран, з выгляду вайсковец у адстаўцы, стаяў у самым цэнтры натоўпу і, наставіўшы ўгору палец, штосьці даводзіў свайму суседу па чарзе – лядашчаму дзядку ў аблезлай

вушанцы. Рэпартэрскі нюх падказваў: гэты! -- і Сьцяпан, насунуўшы мікрафон на дзяржак, уплішчыўся ў натоўп.

У сярэдзіну крамы ён пралез сама што: шыракаплечы вэтэран ужо трос дзядка за плячук, дзядок вырываўся, і ўсё гэта магло скончыцца бойкаю.

-- Карэспандэнт рэспубліканскага радыё Жук, -- адрэкамэндаваўся Сьцяпан, на хаду нагаворваючы на плёнку пранікнёны аповед пра вэтэранаў. Згадаўшы рэвалюцыю, першыя пяцігодкі, Айчынную вайну і пасьляваеннае будаўніцтва, ён скончыў пранікнёны аповед ня меней пранікнёным пытаньнем:

-- Дык што ж яны, гэтыя ўмудроныя жыцьцёвым вопытам людзі, думаюць пра тых, хто прагне развалу Саюза?

-- Страляць іх трэба! -- бязь ценю сумневу выдыхнуў шыракаплечы вэтэран і, адпусьціўшы дзедавы плячук, дадаў: -- Я іх у сорак сёмым, пад Панявежысам, цэлую кучу паклаў.

Крыху зьбянтэжаны Сьцяпан падсунуў мікрафон дзеду ў аблезлай вушанцы:

-- Ну а вы, што скажаце?

Дзядок спалохана ўздрыгнуў, выцер кулаком вочы і, зьвёўшы іх да пераносься, зь невыказным жахам паглядзеў на мікрафон.

-- Правільна! Страляць іх трэба, гэтых гандляроў, -- крыкнула, ня цямячы, пра што размова, нейкая кабета, і Сьцяпан пазнаў па тым крыку пэнсіянэрку Кароткую.

Крама напоўнілася бунтарнымі воклікамі, а дзядок у вушанцы, які дагэтуль цэлую хвіліну тросься ад жаху, нечакана падскочыў і, схапіўшы шыракаплечага вэтэрана за кляпу палітону, вісклява загарлаў:

-- Раскажы лепей, як ты ў майго Мішу страляў, гадзіна!

І цяпер ужо дзядок трос шыракаплечага вэтэрана, а той адбіваўся і хрыпла мармытаў:

-- Адчапіся, халера!

Лёгкі халадок нарадзіўся ў грудзіне і паволі падпоўз да сэрца. «Страляў у Мішу... А Міша хто? Брат? А можа баявы сябар? Ахвяра і злачынца – у адной чарзе! Можа атрымацца цікавы матэрыял!» -- падумаў Сьцяпан і, выходзячы з крамы, азірнуўся і пашукаў вачыма аблезлую вушанку.

Цягам двух гадзінаў ён запісаў на плёнку тузін інтэрвію, перачытаў аб’явы, якімі былі абклееныя стаўбуры навакольных дрэваў, выпаліў, седзячы ў машыне, пяць цыгарэт, а ўбачыўшы дзеда, пасьпешна апусьціў шкло:

-- Гэй, дзеду, сядай, дадому падкіну!

Дзядок шморгнуў носам, падышоў на нягнуткіх нагах да машыны, і ніжняя, устаўная сківіца ў ягоным роце дробна застукала па верхніх зубах.

-- Сядай, падвязу, -- паўтарыў карэспандэнт, і дзед з вохканьнем залез на задняе сядзеньне.

-- Што ж ты, стары... апошнія дні дацірaеш, а ўсё калоцісься? -- Сьцяпан насунуў на голаў шапку, з усьмешкаю на вуснах завёў легкавік.

-- Дацірaю... – прашаптаў дзядок. – Але ўсё адно жыць хочацца.

-- Жыць хочацца... -- мусіў пагадзіцца Сьцяпан і голасам сталічнага таксіста запытаў: -- Куды везьці?

-- Вуліца генэрала Мандрыкіна, сто пяцьдзесят, -- быў адказ.

І Сьцяпан, прашаптаўшы з уздыхам: «У Мандрыкаўку...» – выруліў на дарогу.

Ехаць трэба было на другі канец горада, у раён мясакамбінату. Часу бракавала, бэнзыну ў баку амаль не было, але рукі надзейна сьціскалі руль, а вочы з упэўненасьцю глядзелі на дарогу. Надта ж цікавы матэрыял вымалёўваўся – злачынца і ахвяра... ціскаюцца па крупы...

Ды і на мясакамбінат зазірнуць трэба: пра «несуноў» інтэрвію зглямэздаць ды пры выпадку кавалкам якой кілбасы разжыцца.

«Масквіч» едзе па вуліцы Валадарскага, зварочвае на Ўрыцкага, мінае будынак КГБ, і дзядок, адарваўшы нос ад шыбы, з палёгкаю аддзімаецца.

-- Што, дзеду, супакоіўся? -- рагатнуў Сьцяпан, злавіўшы ў люстэрку пажвавелы дзедавы твар. – А то і сківіцы трэсьліся. Маеш, відаць, грахі перад савецкай уладай?

-- Э-эх, добры чалавек! Торбы не цурайся, ад турмы не заракайся. Сядзяць у ёй і грэшныя, і праведныя.

-- Яно так, -- кіўнуў, пасьля хвілі роздуму, карэспандэнт і, кашлянуўшы, трагічным барытонам запытаў: -- Як там... Міша... жывым застаўся?

-- Жывы. Толькі вуха прастрэленае.

Далей ехалі моўчкі. Сьцяпан глядзеў на дарогу, зьбіраўся з думкамі, а калі, нарэшце, сабраўся і хацеў спытаць -- у які годзе гэта ўсё надарылася? -- дзядок яго апярэдзіў і з разважнасьцю ў голасе прамармытаў:

-- А калі ж гэта ён стрэліў?.. Ці то мінулым панядзелкам, ці то аўторкам?

-- А хто ён такі, гэты Міша? -- рыкнуў карэспандэнт рэспубліканскагга радыё, крутнуўшы галавою.

-- Як хто... сабака мой... на двары жыве.

Ад сутыкненьня з бэнзавозкай, якая ехала насустрач, радыёкамітэцкі «Масквіч» уратавала няйначай як Божая сіла. Сьцяпан ашалела крутнуў руль, войкнуў, а выехаўшы на сваю паласу, скрозь зубы працадзіў:

-- Набіўся ты мне на галаву...

Болей, аж да самай Мандрыкаўкі, ён не прамовіў ні слова.

Бэнзын скончыўся ў самы нязручны момант – на павароце, і Сьцяпан нават не пасьпеў выехаць на ўзбочыну.

Разам зь дзедам, упіраючыся плечукамі ў багажнік, яны выпіхнулі радыёкамітэцкую ламачыну на край дарогі, і Сьцяпан, абабіўшы далоні, агледзеў навакольле.

Да мясакамбінату, калі ісьці напрасткі, агародамі, было як рукой дастаць. Карэспандэнт прыслухаўся да немага каровінага рыканьня, перакрываўся ад смуроду, якім было прасякнута паветра, і палез у кішэню па ключы ад багажніка.

-- Можа, да мяне б зайшлі... паабедалі? -- нясьмела прамовіў дзядок, камечачы ў руках папяровы мяшэчак з крупамі. -- Вунь мой дом, за паваротка́й.

-- Другім разам, дзеду, -- буркнуў Сьцяпан, адчыняючы багажнік, а адчыніўшы, раскаціста прысьвіснуў. Вядро, якое заўсёды ляжала ў багажніку, некуды зьнікла, машын на дарозе не было відаць, а гадзіньнік між тым паказваў палову пятае.

«Праз паўгадзіны нікога ня знойдзеш», -- падумаў Сьцяпан і ляснуў вечкам багажніка. Павагаўшыся хвіліну, ён ускінуў на плячук рэпартэрскую сумку, запытальна кіўнуў у бок мясакамбіната.

-- Як я, агародамі прайду?

-- А як жа! На маім агародзе сьцежка ёсьць. Адразу да прахадной і выйдзеце, -- растлумачыў дзядок і, павярнуўшыся, затупаў ускрайкам дарогі.

Чым бліжэй яны падыходзілі да дзедавага дому, тым смуродлівей рабілася паветра. Ад агіднага паху крыві і гною сьвербіла ў носе, і Сьцяпан, заціснуўшы нос рукою, напаўголасу прамармытаў:

-- І як тут людзі жывуць?

Дзядок спыніўся перад дашчатымі весьніцамі, бразнуў клямкаю, кіўнуў, запрашаючы госьця заходзіць, і яны ўвайшлі на падворак. Гаспадар, як бачна, меў клопат з апалам: на двары, у поўным бязладзьдзі, ляжалі збуцьвелыя

дошкі, абломкі мэблі, яшчэ нейкае ламачча, а пасярод двара сядзеў, варушачы хвастом, стары паскубаны сабака. Згледзеўшы незнаёмца, сабака брахнуў, салодка пацягнуўся і, злавіўшы зяпай сьняжынку, пацёгся да сваёй будкі. Пазіраючы на дзедавага гадунца, Сьцяпан прымружыўся, разглядаючы сабачае вуха, а ўбачыўшы засохлую кроў, шчыра падзівіўся -- навошта было страляць у гэтага здыхлю, які з-за старасьці і брахаць ня можа.

Гаспадар узьбег на ганак, сьпешна адчыніў дзьверы.

-- Дык, можа, зойдзеце? У мяне і чарачка знойдзецца.

-- За рулём! -- з годнасьцю вымавіў карэспандэнт, а ўдумаўшыся ў сэнс дзедавай прапановы, скасіў вока на сабачую будку.

-- І што ж ён – вось так, ні з пушчы, ні з поля і стрэліў?

-- Так і стрэліў, -- уздыхнуў дзядок, -- вунь агарод ягоны, адтуль і... – ня скончыўшы фразы, дзядок кашлянуў, зьняў з галавы шапку, і карэспандэнт, абураны такімі паводзінамі суседа, рашуча ступіў на ганак.

У хаце панаваў гэткі ж вэрхал, што і на падворку. Стаяў непрыбраны ложак, на падлозе валяліся пажоўклыя газэты, і зьнявіднае для жаночага вока павуціньне матлялася пад нізкаю стольлю. Мяркуючы па ўсім, дзядок жыў адзін, бяз жонкі.

Сьцяпан плюхнуўся на дзедаву канапу, зьмежыў павекі, слухаючы, як застагналі пад ім спружыны, і міжволі згадаў сваю другую жонку Капіталіну. Лічы, два гады мінула, як яны разышліся, а боль і горыч ня выпетрыліся з душы, і да шчымлівых успамінаў пра цёплыя Капчыны вусны, пра ейныя гарачыя грудзі дамяшалася прыкрае адчуваньне ўласнае закінутасьці і адзіноты. Вось ужо і пяты дзесятак разьмяняў, старасьць блізка, а дзе тая жонка? Дзе тыя дзеці? Дачка вунь ліста ніколі не напіша, дарма што літаратурны інстытут скончыла.

За сьценкай, нібыта падслухаўшы ягоныя думкі, азваўся гаспадар:

-- Адзін жыву... як той кол пры дарозе. Захварэеш, дык вады няма каму падаць. Газу во таксама не даюць. Хаджу па Мандрыкаўцы, палкі зьбіраю. Трэба ж у печы паліць...

Слухаючы дзедавыя нараканьні, Сьцяпан упёрся локцямі ў калені і са скрухаю падумаў: «Так і скончу жыцьцё, як гэты дзед. У якой-небудзь халупе з надворнай прыбіральняй». Карэспандэнт абхапіў рукамі голаў, доўга сядзеў незварушна, аж пакуль не дачуўся вясёлага дзедавага вокліку:

-- Што маем, тым і прымаем!

Стары стаяў у дзьвярах, трымаючы ў адной руцэ патэльню на чапяле, а ў другой – запацелую пляшку.

З хвіліну госьць сядзеў у нерухомасьці, слухаў сквірчэньне яечні, пасьля чаго крэкнуў і ляснуў далонямі па каленях.

-- Пяцьдзесят гадоў – дык гэта росквіт для мужчыны, -- вырвалася са Сьцяпанавай глоткі, і дзядок, спыніўшыся на паўдарозе, спужана перапытаў:

-- А?! Што?!

-- Ды так... Гэта я пра сябе, -- прамовіў Сьцяпан, падхапіўся на ногі і на знак павагі ляпнуў старога па плячы.

... Вось яна, гарэлка! Кульнуў чарку – і сумоты як і не было. І зноўку жыць хочацца, і сэрца б’ецца, як гадзіньнік, і хата дзедавая ўжо не здаецца такой страшнай.

На першую пару госьць з гаспадаром узахапкі чвякалі: госьць мерна і мужна, гаспадар дробненька і запабежліва; неўзабаве налілі па другой, і Сьцяпан, узьняўшы на відэльцы скрылёк кілбасы, захоплена выдыхнуў:

-- Цудоўны закусон. Дзе куплялі?

-- Сабака прынёс, -- як нічога ніякага адказаў гаспадар, а Сьцяпан, кінуўшы жаваць, выпусьціў з рукі відэлец.

-- Як прынёс? Адкуль?

Гаспадар пакруціўся на крэсьле, пакасіўся на рэпартэрскую сумку, што ляжала на канапе, вінавата пасьміхнуўся...

-- А ты, дзеду, жартаўнік, -- госьць дастаў з-пад ног відэлец, агледзеў яго з усіх бакоў і, праглынуўшы недажаванае едзіва, пацягнуўся да чаркі.

Пасьля другой яны даелі яечню, але ўжо без ранейшага смаку, а кульнуўшы трэцюю, госьць задаволена адрыгнуў, дастаў з кішэні пачак «Беламору».

-- Ну, дык навошта ён страляў? -- госьць дзьмухнуў у папяросьніцу, працягнуў пачак гаспадару.

Дрыжачая дзедавая рука памацала пачак, доўга яго мурыжыла, дастаючы папяросіну, і Сьцяпан апёк сабе пальцы, трымаючы запаленую сярнічку. Пытаньне ён задаў проста так, абы не маўчаць, але дзеда яно не на жарт усхвалявала. Стары схапіў са стала талерку, потым кіслы агурок, і твар ягоны зрабіўся гэткім жа, як агурок -- шэрым і зморшчаным.

Не закусваючы, кульнулі па чацьвертай.

-- Ня ведаю, добры чалавек, хто вы, але скажу як на споведзі... – стары прыпаліў папяросу, нервова закашляўся. – ад зайздрасьці стрэліў, паскуда. Убачыў, што Міша кілбасу цягне, -- і стрэліў.

-- Якую кілбасу? -- наструніўся Сьцяпан.

Дзядок сумеўся, разьліў па чарках рэшткі гарэлкі.

-- Я да таго, як на пэнсію ісьці, на мясакамбінаце рабіў. Стралком аховы. Ну і... – стары выпусьціў з рота колца шызага дыму, і яно, не раўнуючы, як той німб, завісла над ягонай галавою. – Іду аднойчы на працу, чую – скавыча нехта. Прыгледзеўся, а гэта шчанюк. Ляжыць пад плотам, і поўсьць у лёд умёрзла. Узяў яго, піхнуў за пазуху і на прахадную прынёс. У нас там, на мясакамбінаце, шмат сабак было. Аўчаркі ў асноўным – аб’ект ахоўвалі. Ну і

Міша прыжыўся, -- стары кашлянуў, сумнымі вачыма паглядзеў на пустую бутэльку. – Жвавы быў сабачка. А розуму ў яго і цяпер... паболей, чым у якога чалавека, -- дзядок п'янавата пасьміхнуўся, прылашчыў даланёю рэшткі сівых валасоў. – Зьбяромся, бывала, на вартоўні пляшку асушыць. Ну і клікнем: Міша, цягні закусь! І ведаеце, пабяжыць у цэх, сьцягне палку «кракаўскай», і нам нясе. Так мы зь ім восем гадоў і адрабілі. А пазалетась я на пэнсію сыходзіў і яго ўзяў. Дажываем цяпер свой век – ён у будцы, я – вунь на тым тапчане, -- дзядок кіўнуў у цёмны кут, шморгнуў носам, расьцёр па шчоках п'яныя сьлёзы.

-- Ну, а ўсё ж такі... на якую халеру страляў? -- запытаўся Сьцяпан. -- Чаму ён там пазайздросьціў?

-- Э-эх, чалавеча, -- стары дапіў гарэлку, перакрывіўся, матлянуў галавой. – Прайдзісьвет гэты таксама ў нас рабіў. Інспэктарам аддзела кадраў. Звольнілі адначас са мною. Ходзіць цяпер па горадзе, юбілейнымі мэдалямі звоніць. Ваяваў, кажа. А дзе там ваяваў, калі яму ў сорак пятым пятнаццаць гадоў было...

Сьцяпан зірнуў на гадзіньнік, нецярпліва пацёр падбародзьдзе.

-- Ну, дык я і кажу... Прыйшоў аднойчы, сеў вунь там, дзе вы седзіце, і пачаў мне байкі баіць. А тут Міша ў дзьверы пашкрабаў. Адчыняю дзьверы, а ў яго кавалак кілбасы ў зубах. Гэты як убачыў, так і заенчыў. Зайздрасьць узяла, што ў мяне кілбаса на стале. «Раскрадальнік сацыялістычнай уласнасьці, -- кажа, -- твайго сабаку адлавіць трэба». Гэта я раскрадальнік, га? Бачылі, які ў яго дом? На дзьвесьце рублёў у месяц такі не пабудуеш.

-- Пачакай, пачакай, -- перабіў карэспандэнт, -- дык што, Міша і цяпер кілбасу цягае?

-- Цягае, -- вымавіў дзядок і апусьціў вочы. – Пэнсія ў мяне малая. Папрашу калі-нікалі: «Зьбегай, Міша, прынясі кілбаскі». Пабяжыць... бывае і прынясе.

Сьцяпан неяк адразу працьверазеў, вылупіў вочы, схапіўся рукой за чэрава.

-- Ды вы не хвалюйцеся. Я з кілбасы скурку зьдзер, і тое месца, дзе ён зубамі трымаўся, выразаў.

Падлога нібы паплыла пад нагамі, і нейкія нязыркія вогнікі мільгнулі ўваччу. Сьцяпан устаў з крэсла, падхапіў з канапы куртку, доўга ня мог патрапіць у рукаво. «Давядзецца, відаць, машыну тут пакінуць, ды на тралейбусе дабірацца», -- падумаў ён той хвіляю і, ускінуўшы на плячук рэпартэрскую сумку, запытаў:

-- Да тралейбуса ці далёка?

-- Ай, во... на камбінаце прыпынак. Пойдзеце праз мой агарод – якраз і выйдзеце. Толькі вы не падумайце чаго. Міша кілбасу тую на год раз, можа, і носіць. Там цяпер новых сабак завялі...

-- Ну а людзі кілбасу цягаюць? -- гукнуў Сьцяпан, ўбіўшыся ў сенцы.

-- Анягож! Цягнуць! І ў штанах, і ў трусах, -- стары зачапіўся нагой за вядро і ціха вылаяўся. – У іх там цяпер новага дырэктара паставілі, Андруковіча нейкага. Дык ведаеце, пайшоў той Андруковіч плот паглядзець... ну, што вакол камбінату. Людзі там дзір панарабілі, дык ён вырашыў дзіры на прыкмет узяць ды забіць потым, каб ня лазілі. Падышоў да плоту, а на галаву маслак зваліўся: перакідваў нехта з боку камбінату. Два тыдні з траўмаю ляжаў і цяпер, кажуць, на працэдуры ходзіць.

На ганку Сьцяпан напоўніў грудзі халодным паветрам і пасьміхнуўся. Аповед гэты ён ужо чуў. Толькі там уздоўж плоту ішоў дырэктар сьпіртзаводу, і на галаву дырэктараву зваліўся не маслак, а грэлка са сьпіртам.

Стары закашляўся, сплюнуў густую сьліну, тыцнуў рукою ў цемру:

-- Вось так, уздоўж паркану, і пойдзеце. Тамака сьцяжына натаптаная. Ву-унь агеньчыкі гараць – гэта і ёсьць прахадная.

Сьцяпан памружыўся на цьмяныя агеньчыкі, падкінуў на плячы рэпартэрскую сумку і, прыслухаўшыся да лянівага Мішавага брэху, рушыў са двара.

У цемрані, густой і непрагляднай, ён хутка зьбіўся са сьцежкі, згубіў зь відавоку паркан і, махнуўшы на ўсё рукою, пайшоў, не разьбіраючы дарогі, па шарпаку, па калена правальваючыся на кожным кроку.

Наперадзе гарэлі агні прахадной. Наперадзе быў доўгі вечар, яшчэ даўжэйшая ноч, панылы, з вогненна-крывавым адценьнем сьвітанак і новы дзень зь яго смугою, шэрымі дамамі і сабачым брэхам на гарадзкіх ускраінах.

Яму згадаўся прачытаны некалі аповед. Герой твору плыў па шырокай сібірскай рацэ і гэтак жа, як і ён, Сьцяпан, апантана глядзеў на агні. Чый гэта быў аповед? Буніна? А можа, Чэхава? Узьбіўшыся на нешта цьвёрдае, ён скочыў на купіну леташняй травы, потым на нейкі грудок і нечакана для сябе праваліўся па самыя грудзі ў мокры, крупчасты сьнег. «Караленка!» – згадаў ён прозьвішча пісьменьніка і, праклінаючы дзедаву гарэлку, папластаваў па сьнезе, цягнучы за сабою цяжкую рэпартэрскую сумку.

Да тралейбуснага прыпынку Сьцяпан дабраўся праз паўгадзіны. Змучаны і мокры, ён улез у тралейбус, выбіў сьнег з ботаў, пашкамутаў канцы калашын, зьбіваючы зь іх ледзяную скарынку, і нейкі пасажыр, зь якім яны разам лезьлі ў салён і якога ён бязьлітасна піхаў азадкам, незадаволена выдыхнуў:

-- Ну чё ты?!

Пасажыр, мяркуючы па гаворцы, паходзіў з паўночнай Расеі.

-- Панаехала тут... розных, -- буркнуў Сьцяпан, выпрастаў сьпіну і, сабраўшыся чхнуць, сьлёзна паглядзеў угору. Пахі «Агдаму» і вэнджанай кілбасы казыталі ў носе, ён прыглушана чхнуў, выцер нос рукавом. «Агдамам» несла аднекуль з-за сьпіны, а вось вэнджанай кілбасой... Сьцяпан прынюхаўся, з шумам увабраў паветра і, не стрымаўшыся, зноўку чхнуў, гэтым разам звонка і галасісіта. Кілбасою пахла куртка «чокалы».

-- Ну, чё ты?! -- ужо з пагрозаю выдыхнуў расеец, згледзеўшы на рукаве сваёй курткі празрыстыя смаркачы. -- Выцірай, паскуда!

-- Карцела сказаць «чокалу» пару ласкавых словаў, але сытуацыя прымушала змаўчаць, і Сьцяпан, перакрывіўшыся, выцягнуў насоўку.

-- Аўтабаза. Ёсьць на выхад? -- праскрыгатала з дынамікаў. Пасажыры заварушыліся, і нейкая дзябёлая кабета, наваліўшыся на Сьцяпанаву сьпіну, крыкнула:

-- Ёсьць!

Ён паспрабаваў быў выцерці сам, але «чокала» вырваў з рук насоўку, рашуча пацёр рукаво. Тралейбус гайданула, цётка адхінулася ад ягонай сьпіны і спалохана ўсклікнула:

-- Ай!

Сьцяпан нахіліўся, выглядаючы -- што так уразіла жанчыну, -- і ўбачыў, як між ног у суседа матлялася, выбіўшыся з-пад курткі, тоўстая сардэлька. Тралейбусныя дзьверы разнасьцежыліся, дзябёлая цётка рванулася да выхаду і, зьбіўшы зь нечай галавы капялюш і задзершы сумкаю нечае паліто, выкулілася з тралейбуса. Ля ўваходу загаманілі, замацюкаліся, а «чокала», прыхаваўшы сардэльку пад куртку, склаў рукі на жываце, як гэта робяць каталіцкія сьвятары, і адсунуўся ад Сьцяпана.

Тралейбус з натужлівым гудам праехаўся па вуліцы Валадарскага, збочыў на Ўрыцкага і, пераехаўшы мост, грукнуў усім сваім жалезным начыньнем. Пасажыры

заварушыліся, праклінаючы выбоіны, і з канца ў канец салёну пракаціўся запытальны вокліч:

-- Выходзіце?

На прыпынку каля ГУМа звычайна выходзіла шмат народу – «чокала» таксама закруціў галавою, і Сьцяпан, заўважыўшы гэта, павярнуўся тварам да дзьвярэй.

З тралейбуса вылазілі гамузам, піхаючы адно аднаго ў сьпіны. Ля дзьвярэй ён затрымаўся, прапускаючы жанчыну зь дзіцём, а калі ступіў на зямлю і агледзеўся, «чокала» ўжо бег па пераходу на другі бок вуліцы.

Прабегчыся трухам было зусім ня шкодна, а ў мокрых штанах і пагатоў. Ён у два скокі перасек вуліцу, пабег, натыкаючыся на мінакоў, па ходніку і дагнаў «чокалу» каля самага ГУМу.

-- Эй, таварыш, можна вас на хвілінку? -- крыкнуў Сьцяпан, і той, да каго ён зьвяртаўся, спалохана азірнуўся.

-- Ну чё тебе?

-- Пару словаў дзеля рэспубліканскага радыё, -- голас Сьцяпанаў зьлёгку дрыжэў ад холаду.

-- Дзеля радыё, кажаш? -- «чокала» прымружыў вока, мелькам зірнуў навокал, а ўбачыўшы ля ГУМу міліцыянта з гумовым дручком, тузануў галавой.

-- Скажыце, ці здараюцца на вашым прадпрыемстве факты крадзяжу гатовай прадукцыі? -- задаўшы гэтае пытаньне, Сьцяпан хітравата пасьміхнуўся, падсунуў суразмоўніку мікрафон, і той, ні хвілі не раздумваючы, выдаў:

-- На вялікі жаль, факты такія яшчэ маюць месца.

-- Ну а канкрэтна вы маглі б што-небудзь сказаць?

Суразмоўнік пасураveў, зьвёў да пераносься густыя «брэжнеўскія» бровы.

-- У цэлым калектыў у нас здаровы, -- прамовіў суразмоўнік пасьля лёгкай замінкі, -- дзённы плян выконваем у сярэдзіне на сто і дзьве дзясятых адсотка. Але

ж нездарма кажуць: адзін паганы бычок увесь статак псуе. Вось так і ў нас: не перавяліся яшчэ людзі, гатовыя з-за кавалка кілбасы запляміць свой рабочы гонар. Цягнуць яны па сваіх злачынных сьцяжынах нашае з вамі дабро. Але адміністрацыя і камісія рабочага кантролю, якую я ўзначальваю, паставілі на шляху гэтых, з дазволу сказаць, работнікаў надзейны заслон...

Суразмоўнік гаварыў так спрытна, так ладна, што Сьцяпан нават заплюшчыў вочы ад захапленьня, а калі расплюшчыў і зірнуў долу, дык ізноў убачыў злашчасную сардэльку. Зьбялелая і зморшчаная, сардэлька матлялася між ног суразмоўцы, і Сьцяпан, адшчыкнуўшы яе азалелымі пальцамі, піхнуў у рот, стоена заварушыў сківаіцамі.

-- Можаш! -- прамовіў карэспандэнт, шчоўкнуўшы клявішай.

-- Калега ваш... дзесяць гадоў у Волагдзе на радыё адпрацаваў, -- буркнуў у адказ інтэрв'юер і насупіўся. – У нас там, ведаецце, галадуха, дык я сюды, да сястры прыехаў. Сястра ў мяне тут, за беларусам замужам. Цяпер вось разьнікам працую.

Яны парукаліся, пайшлі ў розныя бакі, і ў Сьцяпана – зь невядомай прычыны – навярнуліся на вочы сьлёзы. Ён спыніўся, выцер сьлёзы рукою і, выпусьціўшы парную аблачыну, крыкнуў:

-- Заўтра... па абедзе... слухай!

Ён наструніўся, чакаючы, што калега адгукнецца, але замест адказу пачуў стогалосы лямант і звон разьбітага шкла. У ГУМе, перад самым закрыцьцём, выкінулі нейкі тавар.

*1991г.*

# Дзень міру
## *апавяданьне*

З прачыненых дзьвярэй струменіць няўтульная жоўтая яснасьць. На кухні рыпаюць масьніцы, і маці, чыркнуўшы запалкаю, зь лёгкім грукатам ставіць на пліту патэльню і чайнік.

Так пачынаецца кожная раніца.

Маша прыўзьнімае голаў, мружыцца на гадзіньнік і, кульнуўшыся на правы бок, зьмежвае павекі.

-- Учора ў гарнізонным цюль давалі, -- прамаўляе маці прыспаным голасам, -- чарга была – аййё! Нават міліцыю выклікалі.

-- Ты ж ці ўзяла? -- пытаецца суседка, цётка Тацяна.

Кухня поўніцца гучным ляскатам і штосьці пляскатае – ці то пантофель, ці то яшчэ нешта, падае на падлогу.

-- Няма ратунку ад прусакоў. Усе тэпці зьбіла, -- гукае маці, штосьці пытаецца ў цёткі Тацяны і голас ейны заглушае густое сіпеньне чайніка.

На гадзіньніку палова сёмай. Пара ўставаць, але ўставаць неахвота, і Маша стоена чакае, калі маці здыме з пліты чайнік і, разьліваючы кіпень па шклянках, голасна клікне: -- Уставайце, соні!

І вось сіпеньне аціхае, у шклянкі з глухім булькаценьнем ліецца кіпень, і цётчын голас, які нараджаецца недзе ў прысенку, прымушае расплюшчыць вочы і прыслухацца.

-- Ці не памёр ужо? Не чуваць штосьці...

За сьценкай, дзе жыве дзед Базыль, пануе ціша.
-- Пайсьці, паглядзець? -- шапоча цётка Тацяна.
Маці маўчыць, стойвае дых, а пачуўшы дзедаву керханіну, грукае табурэтам і з палёгкаю выдыхае:
-- Уставайце, соні!
Люська матчынага воклічу як і ня чуе: ляжыць, убіўшы нос у падушку, і ледзь чутна пасопвае.
-- Уставай, чуеш? -- Маша сядае на ложку, пацепвае спрасоньня плечукамі, ускудлачвае непаслухмяныя Люсьчыны кудзеркі.
За тонкай перабойкаю гучна керхае і брынкае начным вядром дзед Базыль. Маша прыслухоўваецца да гэтых зыкаў і міжволі ўяўляе, як стары сноўдаецца па пакоі, трымаючыся адною рукою за сьцяну, а другою пацiраючы мокрае месца на сподках.
Дзед пасьля хваробы зусім акволеў – ані ў краму схадзіць, ані абеду сабе згатаваць ня можа. Учора бульбу чысьціў, у ложку лежачы...
Маша падхопліваецца, нацягвае калготы, а кінуўшы позірк на белы хвартух, які вісіць на дзьвярной ручцы, згадвае, што сёньня сьвята – Дзень міру.

-- Ты ж глядзі, Люську ўхутвай! -- крычыць маці ад парогу, завязваючы шалік на Люсьчынай шыі.
На вулцы і папраўдзе холадна. Учора цэлы дзень церусіў дождж, і тэрмомэтар паказваў плюс восем, а сёньня пад нагамі парыпвае лядок і ядранае паветра перахоплівае дыханьне, асабліва, калі глытаць яго на поўную губу. Усё навокал пакрытае шэраньню. Шэрань на дрэвах, на кустах, на ганку, зь якога яны зьбеглі, пакінуўшы на пасярэбраных дошках цёмныя паскі сьлядоў.
-- Ой, як прыгожа! -- выдыхае Люська, задзіраючы ўгору свой кірпаты, усыпаны ластаўчыньнем нос. Маша таксама глядзіць угору, сьлізгае вачыма па верхах заінелых таполяў,

па бляшаных дахах, якія бліскаюць усімі колерамі вясёлкі, і міжволі прымружвае вейкі, ратуючыся ад калючага зіхценьня.

-- Праўда, наш дом прыгожы? -- пытаецца Люська, і Маша, нічога не адказаўшы, моўчкі ідзе па сьцяжыне.

Дом, у якім яны жывуць, пабудаваны перад самай вайною. Калі даваць веры дзеду Базылю, пабудаваў яго, а разам зь ім і яшчэ пяць гэткіх жа дамоў-баракаў, нейкі Лазар Майсеевіч. Хто ён такі, гэты Лазар Майсеевіч, Маша і цяпер дакладна ня ведае, але будаўніком ён быў, відаць, добрым. Нездарма дзед Базыль яго ўвесь час хваліць і нават партрэт на кухні павесіў...

Дашчатыя дамкі стаяць ля самай чыгуначнай лініі, пазіраючы на сьвет сваімі памутнелымі ад паравознага дыму вокнамі. Там, за чыгункай, куды глядзяць памутнелыя вокны, віднеюцца шматпавярховыя будынкі, гудуць машыны, мітусяцца людзі, а тут, на Залінейнай вуліцы, пустэльна, ціха, і толькі недзе ў хлеўчуку рохкае галоднае сьвінчо ды сакоча, наракаючы на халадэчу, азалелая курыца.

Маша ненавідзіць свой дом, ненавідзіць гэтую ўсыпаную шурпатым жужалем вуліцу і, калі хто пытаецца – дзе яна жыве? -- дзяўчына заўсёды чырванее і, схіліўшы галаў, шапоча: -- За лініяй.

На пераезьдзе, як заўсёды, стаіць таварняк. Хвост цягніка ня бачны – губляецца ў ружовай смузе, а сам цеплавоз гудзе недзе на станцыі. Ісьці на пераходны мост, вядома ж, неахвота, дый часу бракуе.

-- Глядзі, не запэцкайся! -- гукае Маша, пераскокваючы праз рэйкі. Мінулым разам, пралазячы пад вагонамі, Люська запэцкала паліто каланіцаю, і маці дала ім добрую прачуханку.

-- А што... дзядуля хутка памрэ? -- пытаецца Люська, даючы нырца пад вагоннае чэрава. -- Пытаньне настолькі нечаканае, што Маша, пралазячы пад вагонам, спатыкаецца і б’ецца лобам аб нейкую жалезіну.

-- Як памрэ? Што ты вярзеш!

-- Учора лекарка прыходзіла. З мамаю на кухні размаўляла, а я падслухала. – Люська абабівае спадніцу, зладзеявата шморгае носам, чакаючы сястрыных дакораў – нельга ж падслухоўваць дарослыя размовы, але сястра маўчыць і, пацёршы насоўкаю лоб, пытаецца:

-- Як у мяне... чыста?

-- Чыста! -- адказвае Люська, падхоплівае зь зямлі партфэль, і сёстры ідуць, панурыўшы галовы, на аўтобусны прыпынак.

Людзей на прыпынку – што тых вераб’ёў на кірмашы. Гамоняць, штурхаюцца, цягнуць шыі, выглядаючы аўтобус, але аўтобусаў не відно: не ідуць з прычыны галалёду.

Плыткія лужы, якімі быў заліты асфальт, наскрозь прамерзьлі, пакрыліся намаразьзю, прыхаваўшы ў сваёй празрыстай глыбіні бліскучыя гузікі, прабітыя талёны, піўныя коркі і недакуркі.

Люська ідзе па ходніку, сьцірае падэшвамі боцікаў шэрую намаразь, зь цікаўнасьцю пазірае пад ногі.

-- Ой, Маша, глядзі, што знайшла! -- крычыць Люська аднекуль з супрацьлеглага канца прыпынку, і Маша, апошнім разам зірнуўшы на далягляд, выбіраецца з натоўпу.

-- Пайшлі пехатою, -- Маша бярэ сястру за руку і, зірнуўшы краем вока на цёмны лапік лёду, нерухомее. Там, ля мыска Люсьчынага бота, чырванее, улітаванае ў ледзяную тоўшчу, навюткая дзясятка.

-- Грошы! -- выдыхае Люська, а Маша, тузануўшы Люську за рукаво, спалохана азіраецца.

Дзядзькі за сьпінаю смаляць папяросы, лускаюць семкі, лаяць нейкага Саладуху, які не пасыпаў пяском дарогу і, на шчасьце, не зьвяртаюць на іх зь Люськаю ўвагі. Маша прыпадае на калена, мацае лядок чуйнымі пальцамі. Лёд даволі тоўсты, рукою не растопіш... «Тут вар патрэбны», -- і з гэтаю думкаю дзяўчына хапае сястру за спадніцу, прымушае стаць на тое месца, дзе ляжыць чырвонец і, падымаючыся на ногі, лапоча:

-- Бяры мой партфэль... стой тут і ня рухайся. Я зараз!

Маша бяжыць па ходніку, коўзаецца і раз-пораз азіраецца назад, махаючы рукамі для раўнавагі. Ля чыгункі, дарэшты выбіўшыся зь сіл, дзяўчына на хвілю прыпыняецца і далей ідзе зморaным крокам. Сьпяшацца няма сэнсу – на першы ўрок, беларускую літаратуру, яна ўжо не пасьпявае. Учора цэлы дзень вучыла верш «Камуністы», а аказалася, што дарма. Перавёўшы дых, Маша рухаецца жвавей, дэклямуючы ў такт хадзе «Камуністаў», і шэрхлы жужаль мерна рыпае пад ейнымі нагамі.

Дома, дзякаваць Богу, нікога няма: маці пайшла на працу, а суседка, цётка Тацяна, зь якой яны мелі агульную кухню, выпрывілася, відаць, у краму. Запаліўшы на газавай пліце ўсе чатыры фаеркі, Маша ставіць на адну зь іх яшчэ цёплы чайнік, зь нецярплівасьцю паціраe рукі. Чайнік закіпае на дзіва павольна. Дзяўчына перастаўляе яго з аднае фаеркі на другую, грэе накрыўку чайніка рукою і задыхана паўтарае:

-- Камуністы... гэта слова, як са сталі... Камуністы... гэта слова, як з агню... Маркс і Энгельс нам імя такое далі... Сто гадоў таму назад упершыню...

Нарэшце, калі верш «Камуністы» быў прачытаны пятым разам, чайнік гучна засіпеў і з крывога носіка ягонага ўдарыў парны струмень.

Ручка чайніка пячэ далонь. Маша нацягвае на далонь рукаво сукенкі і, выляцеўшы на ганак, сутыкаецца зь цёткай Тацянай.

-- Машка! Куды ты?! Раджае хто?! -- крычыць суседка, хапае Машу за паліто, але тая вырываецца і бяжыць, брынкаючы накрыўкай чайніка, па надворку.

Суседка выпускае з рук сумку.

-- Зь Люськай што?! Язык прымарозіла?!

«Які язык?» – думае Маша, перакідваючы з рукі на руку гарачы чайнік, і толькі тады згадвае, як Люська прыклала аднойчы язык да зьмерзлай клямкі і як потым яе ратавалі, паліваючы на клямку гарачай вадою.

... Народу на прыпынку паменела. Дзядзькі, што грызьлі семкі і лаялі Саладуху, некуды зьніклі – пайшлі, відаць, пехатою. Замест іх за Люсьчынай сьпінай мітусяцца хлопцы ў чыгуначнай форме; скачуць на адной назе, штурхаюць адно другога ў плячук і з рогатам бягуць за фуражкамі, калі тыя валяцца з галоў ды коцяцца па ходніку.

Люська зусім скарчанела, нават нос сьсінеў ад холаду.

-- Пагрэйся, -- выдыхае Маша, і Люсьчыны рукі абхопліваюць гарачы чайнік.

Напорлівы струмень з цурчэньнем ліецца долу. Укленчыўшы на абедзьве нагі, Маша пaглядае з-пад ілба на лямцовыя буркі, на бліскучыя жаночыя боты, на зьбітыя мужчынскія чаравікі, якія шчыльным кальцом атачаюць яе з усіх бакоў.

-- Што яны там робяць? -- пытаецца дзядзька ў лямцовых бурках, і звонкі жаночы голас паведамляе:

-- Ня бачыце -- дзеўкі грошы знайшлі. Згубіў нейкі п’янюга.

-- Зусім ужо звар’яцела. У кожным нармальным чалавеку п’янюгу бачыш, -- адзываецца сіплы мужчынскі голас, і кабета, счакаўшы хвілю, злавесна сыкае: -- Маўчы, алкаш няшчасны!

Вада ліецца на лёд, пальцы сьлізгаюць па гладкай паверхні і неўзабаве натыкаюцца на ражок змакрэлай дзясяткі.

-- Мандарынаў купяць, -- гукае хтосьці з каўкаскім акцэнтам, а ўладальнік лямцовых буркаў тупае на лёдзе і незадаволена крахтае:

-- Ніякіх мандарынаў! Знайшлі на вуліцы – трэба здаць у Фонд міру.

Дзесьці за пераездам натужліва завывае аўтобус, і шчыльнае кола з чувякоў, чаравікоў і аблямаваных скуранымі паскамі буркаў рассыпаецца.

-- Едзь! -- крычыць Маша сястры, -- я пазьней прыеду, -- і плюхае на лёд рэшткі гарачай вады.

Дома Маша высушыла на прасе мокры чырвонец, потым пабегла да тэлефоннай будкі – дзеду зрабілася блага і цётка Таццяна загадала выклікаць «хуткую», -- і ў школу пасьпела толькі на трэці ўрок.

Зазірнуўшы па дарозе ў I «В», дзе вучыцца Люська, дзяўчына ўзьбягае на свой паверх і супыняецца перад прачыненымі дзьвярыма. У клясе стаіць гамана. Надзея Іванаўна – немаладая ўжо, глухаватая на адно вуха настаўніца, гугнявіць штосьці, павярнуўшыся да мапы, і Маша, незаўважаная нікім, апроч сяброўкі Леры, прасьлізвае ў клясу й займае сваё месца за першай партай. Лера тыцкае яе локцем, маўляў – распавядай, дзе была, але Маша адмахваецца і зморана выпроствае ногі.

Нудны голас Надзеі Іванаўны абрываецца, настаўніца акідвае вучняў суворым позіркам, патрабуючы цішыні, але гамана не сьціхае, і Надзея Іванаўна, пачухаўшы пальцам пераносьсе, працягвае:

-- ... Але па-сапраўднаму вывучаць нетры пачалі толькі пры Савецкай уладзе...

-- Дзе ты была? -- шапоча Лера і, не дачакаўшыся адказу, пакрыўджана адварочваецца.

Хвіліну сяброўка сядзіць нерухома, потым дастае з партфэля сшытак бяз вокладкі, адгортвае старонкі, занурваецца ў чытаньне. Сшытак той вядомы ўсёй клясе: Лерка запісвае ў яго розныя «любошчы», -- і Лёшка Тозік, які сядзіць за Лерчынай сьпінай, вось ужо другі тыдзень спрабуе тым сшыткам завалодаць. Лёшка і зараз цягне галаў, і Лера, убачыўшы гэта, б’е Тозіка сшыткам па галаве.

-- Суседу «хуткую» выклікала, -- шапоча Маша, -- таму і спазьнілася.

-- Каму? Таму дзеду? -- перапытвае сяброўка і, азірнуўшыся, стоена дадае: -- Такую рэч перапісала!

-- Дасталі сшыткі! Усе дасталі сшыткі! -- гукае настаўніца, але ніхто нічога не дастае, і толькі Лерка, яшчэ раз азірнуўшыся, кладзе перад сабою «любоўны» сшытак.

-- Хочаш пачытаць? -- пытаецца Лерка, і геаграфічка, падвысіўшы голас, гукае:

-- Алехнік! Колькі можна балбатаць?!

Лерка аціхае, утульвае галаў у плечы, уважліва глядзіць на настаўніцу і тая, узяўшы са стала ўказку, ідзе да мапы.

-- Запішыце асноўныя каменнавугальныя басэйны, -- указка сьлізгае па мапе і спыняецца на Далёкім Усходзе. Маша мружыць вочы, разглядаючы чорны квадрацік у раёне Ўладзівастока, і адно пытаньне не дае спакою: ці варта казаць Лерцы пра знойдзеныя грошы? Маша падсоўвае да сябе «любоўны» сшытак, скоса глядзіць на завушніцы, якія цьмяным золатам бліскаюць у Лерчыных вушах, і ўздыхае. «Што ёй дзясятка... У яе гэтых дзясятак у кожнай кішэні панапіхана», -- думае Маша і ўнурвае позірк ў сшытак. На старонцы, упрыгожанай партрэтам нейкага замежнага сьпевака і малюнкам прыгажуні ў сінім купальніку, няроўнымі літарамі напісана: «Каханьне дзесяцікласьніка і сямікласьніцы».

«Куплю, відаць, торт. Люська даўно прасіла», -- мітусяцца ў галаве бязладныя думкі, І Маша, чытаючы аповед, аніяк ня можа дапяць да ягонага сэнсу.

... Нейкі дзесяціклясьнік... убачыў на пляжы сяміклясьніцу, якая выкручвала ў кустах мокры купальнік...

-- Ну, як? -- пытаецца сяброўка, і ў гэты момант за сьпінамі іхнымі штосьці бабахае, а над галовамі ўздымаецца жоўты дым.

-- Тозік! Зноў страляеш?! -- голас Надзеі Іванаўны зрываецца на крык, настаўніца сядае ў крэсла і, пасьля паўзы, сьцішана прамаўляе: -- Каму не цікава – могуць выйсьці зь клясы.

З клясы, вядома ж, ніхто не ідзе, і Надзея Іванаўна, уздыхнуўшы, падымаецца на ногі.

-- Вось тут пачытай, тыцкаецца ў сшытак наманікюраны Лерчын палец, -- тут самае цікавае. Далей ужо ня так...

І Маша, зь цяжкасьцю разьбіраючы Лерчыну пісаніну, чытае: «Ён падышоў да сяміклясьніцы, паклаў ёй на грудзі сваю гарачую руку і запалым ад хваляваньня голасам прамовіў...»

-- Запасаў вугалю, як сьцьвярджаюць вучоныя, хопіць яшчэ на тры тысячы гадоў, -- грыміць над Машыным вухам, і доўгачаканы званок заглушае гэтыя прарочыя словы.

Ля Тозікавай парты адразу ж зьбіраецца натоўп: хлопцы рагочуць, ляпаюць Лёшку па сьпіне.

-- Бэрталетава соль ірванула, -- не бяз гонару паведамляе Лёшка Тозік, выцягваючы з партфэля абгарэлыя падручнікі.

У паветры пахне нейкай брыдотай, і Маша зь Лерай выходзяць у калідор.

-- Ведаеш, аб чым я мару? -- пытаецца Лера, страляючы вачыма налева і направа.

-- Ну!

Лера хіліцца да Машы, кранаецца вільготнымі вуснамі мочкі вуха:

-- Каб мяне пацалаваў дзесяціклясьнік!

Дзяўчыны пырскаюць сьмехам, а пачуўшы воклік кляснай кіраўнічкі, разам азіраюцца. Арына Радзівонаўна, падфарбаваная, апраненая ў прыталены жакет зь зялёнага джэрсі, рашучым крокам ідзе па калідоры. На нагах у кляснай кіраўнічкі імпартныя «лодачкі».

Сяброўкі пераглядваюцца, падміргваюць адна адной, і гэта азначае, што Арына Радзівонаўна прыбралася нездарма. Пра яе дачыненьні з Алегам Кузьмічом -- новым выкладчыкам фізкультуры -- балбоча ўся школа.

-- Што, Тозік зноў нешта выбухнуў? -- пытаецца Арына Радзівонаўна, прабіраючыся скрозь вірлівы натоўп.

-- Выбухнуў, ківае галавой Лера, -- ад дыму не прадыхнуць.

Клясная абурана крывіцца, а зірнуўшы на Машу, ускідвае ўгору падмаляванае брыво.

-- А дзе гэта ты сёньня была?

-- У яе сусед захварэў. «Хуткую дапамогу» выклікала, -- тлумачыць Лера, але Арына Радзівонаўна, азірнуўшыся на бокі, перабівае:

-- Лера, я пытаюся ў Машы.

Маша апускае галаў і моўчкі торгае плечукамі, даючы зразумець, што дадаць да сказанага няма чаго.

-- Ну, добра... – Арына Радзівонаўна папраўляе прычоску, ізноў глядзіць на бокі, а ўбачыўшы ў канцы калідору Алега Кузьміча, сьвятлее з твару.

-- Скажыце, што геамэтрыі ня будзе. Хай усе ідуць у залю, -- на хаду прамаўляе Арына Радзівонаўна, і сяброўкі, пасьміхнуўшыся, бягуць у клясу.

Школьная заля ўпрыгожаная папяровымі галубамі, сьцягамі саюзных рэспублік і вялізным лёзунгам: «Не дамо ўзарваць сьвет!», які вісіць над сцэнаю.

Ад гэтага лёзунгу Тозіку няма спакою. Лёшку тузаюць за пінжак, тыцкаюць пальцамі пад драбы, з усіх бакоў гукаюць: -- Не дамо! -- а ён толькі пасьміхаецца ды пакрыўджана лыпае абпаленымі вейкамі. Што зробіш – даводзіцца трываць жарцікі, пагатоў Арына Радзівонаўна ўважліва сочыць за кожным ягоным рухам.

Мінулым месяцам Лёшка праз тыя выбухі траха не разьвітаўся са школай. Даведаліся настаўнікі, што гэта ён, Лёшка Тозік, з габінэту хіміі рэактывы сьпёр і ў бэтонамяшалку самаробную «бомбу» ўкінуў. Бэтонамяшалка якраз на школьным двары стаяла – рабочыя спартзалю рамантавалі. Ну і выбухнула тая «бомба»: шыбы ва ўсім навакольлі здрыгануліся, а брыгадзірка маляроў зь перапуду ў начоўкі з рошчынай упала і доўга там плюхалася.

Лёшка сядзіць на трэцім радзе, акурат перад Машай, захінаючы нямытымі кудламі сівога вэтэрана, які стаіць ля моўніцы і ганіць па пісаным падкопы вашынгтонскай адміністрацыі. Лера тым часам не знаходзіць сабе месца: у клясе Тозік за ейнай сьпінаю сядзіць, пальцам між лапатак тыцкае, а тут яны месцамі памяняліся, трэба ж зь Лёшкам паквітацца! Пракудліва азірнуўшыся, Лёрка кладзе на Лёшкаву сьпіну аркуш паперы з надпісам «тэрарыст», спрабуе прымацаваць аркушык іголкаю, і Лёшка, рэзка павярнуўшыся, хапае пракуду за руку. Лерка войкае, вэтэран перапыняе прамову, а Арына Радзівонаўна злавесна сыкае:

-- Тозік! Зараз жа ідзі сюды!

Клясная тузае Лёшку за плячук, садзіць поруч з сабой, а вэтэран, кашлянуўшы, падвышае голас:

-- Няўжо заходнія маньякі не разумеюць, што сваімі агрэсіўнымі плянамі яны ставяць на карту жыцьці мільёнаў людзей?..

Лёшкавы сябры, абураныя такімі падзеямі, рыпаюць крэсламі, аб нечым шэпчацца, а пашаптаўшыся, разам аціхаюць.

-- Мы, савецкія людзі, цалкам падтрымліваем і адабраем курс нашай партыі на ўмацаваньне абараназдольнасьці краіны, -- прамаўляе вэтэран, і здушаны Лерчын вокліч прымушае прамоўцу ізноў перарвацца і прыўзьняць акуляры.

-- Алехнік, што там у цябе? -- гукае Арына Радзівонаўна ўжо зусім перасельм голасам, і Лера, паціраючы азадак, плаксіва выдыхае:

-- Колюцца... дурні гэтыя.

-- Ну што, абрыдла слухаць? -- пытаецца вэтэран, на што заля адказвае дружным «Не-а!», а Лерка, глытаючы сьлёзы, гугнявіць: -- Зараз... Рыжая ўскочыць.

У залі аціхае водгульле, і выдатніца Людка Беглік, ускочыўшы з крэсла і страсянуўшы капою рудых валасоў, завучана прамаўляе:

-- Іван Пятровіч, раскажыце, калі ласка, пра які-небудзь баявы эпізод.

Зірнуўшы на столь, Іван Пятровіч апавядае вучням пра начны бой у раёне Касторнай, у якім ён зьнішчыў трыццаць гітлераўцаў, і Лера з Машай, пераглянуўшыся, захоплена б'юць у ладкі. Мінулым разам, згадваючы той эпізод, Іван Пятровіч казаў пра дваццаць зьнішчаных немцаў: страты ворага растуць, і гэта ня можа ня радаваць.

На сцэну ўзьнімаюцца першаклясьніца зь першаклясьнікам. Дзяўчынка ўручае вэтэрану кветкі, хлапчына – тоўстую кнігу, і ўсьлед за імі на сцэну ідуць удзельнікі літмантажу. Хвіліну ўдзельнікі бегаюць па сцэне: сьцягваюць долу моўніцу, расстаўляюць крэслы; нарэшце, дзяўчаты, дапамагаючы адна адной, узлазяць на крэслы, а хлопцы становяцца паўколам.

-- Каб ня грымнуцца, -- заўважае Лерка, якой выпала крэсла хісткае і рассохлае. Лерка хітаецца, махае рукамі, а канчаткова згубіўшы раўнавагу, хапаецца за першае, што трапляе пад руку: за Лёшкавы кудлы.

-- Адчапіся, падла! -- рыкае Тозік, і ў гэты момант з-за кулісаў далятае пагрозьлівы вокліч Арыны Радзівонаўны:

-- Алехнік! Стань роўна!

Літмантаж, як заўсёды, пачынае Людка Беглік. Выдатніца пранізьлівым голасам чытае «Рэквіем» Раждзественскага, потым свой уласны верш, потым яшчэ нейкую нісянеціну і, пасьля словаў: «Утверждать на земле коммунизм!», якія Людка дэклямуе з асаблівым натхненьнем, усе сьпяваюць «Марш коммунистических бригад».

-- Бу-дет лю-дям сча-астье, сча-стье на ве-ка-а... – цягнуць Маша зь Лераю, кідаючы позіркі то на рухавы Людчын нос, то на Арыну Радзівонаўну, якая дырыгуе хорам з-за кулісаў. Людчын нос торгаецца ў такт песьні, і сяброўкі з тае праявы душацца ад сьмеху. Пасьля трэцяга куплету сьпяваць ужо няма сілы і Лерка, каб зусім не разрагатацца, прыкусвае зубамі палец.

І вось марш прасьпяваны, нехта з хлопцаў чхае, і заля зноў скаланаецца ад суворага голасу выдатніцы:

-- Они сегодня думают о том, чтобы людей побольше уничтожить...

-- А мы... за домом... строим новый дом... и те дома... хотим ещё умножить! -- гукае Маша, а яе сяброўка, глынуўшы паветра, голасам ня менш суворым, чым у выдатніцы, падхоплівае:

-- Они готовят новую войну, и бомбой атомной грозят народам... -- Лерцы карціць выдаць усю фразу; словы ўжо гатовыя сарвацца зь языка, але яна свойчас спыняецца і штурхае Лёшку Тозіка.

-- Тозік, чуеш, твае чарга! -- шапоча з-за кулісаў Арына Радзівонаўна.

-- А мы... растём... – падказвае Лерка, але Лёшка маўчыць, сапе ў дзьве дзіркі ды тупа пазірае на падлогу.

Заля аціхае. Першаклясьнікі паўскаквалі зь месцаў, умольна глядзяць на сцэну, удзельнікі літмантажу разам анямелі, нават убелены сівізной вэтэран падняўся на ногі і з хваляваньнем перакідвае з рукі на руку падораную вучнямі кнігу, але Лёшка маўчыць, і Арына Радзівонаўна, знэрваваная такім маўчаньнем, з роспаччу ў голасе выкрыквае:

-- А мы... растём спокойно в вышину, под нашим мирным, светлым небосводом!

Выгукнуўшы гэта, клясная пераводзіць дых і ледзь чутна дадае:

-- Звар'яцець можна!

Пасьля задухі, што панавала ў школьнай залі, паветра здаецца салодкім, і ад тае слодычы сэрца робіцца бязважкім, і зьлёгку кружыцца галава. Ад ранішняга лядку няма і сьледу – пад нагамі хлюпае слата, імжа казыча шчокі, а ў засені згалелых таполяў пахне вільгацьцю і прэлым лісьцем.

Сёстры спыняюцца пад дрэвам, з насалодаю ўдыхаюць паветра.

-- А што такое «фонд міру»? -- пытаецца Люська, засяроджана калупнуўшы ў носе.

-- Палец зломіш, -- абзываецца Маша і чухае за вухам, разважаючы – дзе гэта Люська пачула такое, а згадаўшы дзядзьку ў лямцовых бурках, з усьмешкай прамаўляе:

-- Разумееш, у капіталістычных краінах ёсьць людзі, якім няма чаго есьці, -- Маша цытуе па памяці словы Арыны Радзівонаўны пра дапамогу амэрыканскім абяздоленым, але Люська перабівае:

-- А чаму ж яны дзеду Базылю не дапамагаюць?

-- Дзед жа не ў Нью-Ёрку жыве, -- ужо без ранейшай усьмешкі кажа Маша, прыкусвае губу і, махнуўшы рукой, шыбуе па ходніку.

... Учора ўвечары ізноў давялося пісаць лісты. У міністэрства шляхоў зносін і ў абкам прафсаюзаў. Дзед Базыль ужо і асадку трымаць ня можа – вось і даводзіцца ёй, Машы, да незнаёмых дзядзькоў ды цётак зьвяртацца, каб яны дзеду Базылю даваенны стаж залічылі ды пэнсію дабавілі. Дзед жа яшчэ да вайны памочнікам машыніста працаваў – спачатку вадзіў таварнякі, а перад вайной яго, маладога стаханаўца, на пасажырскі пасадзілі. Якраз тады Ленінград-Марыюпаль па новай дарозе пусьцілі. Дзед Базыль ня першы год лісты піша, просячы пэнсію дабавіць, але дзядзькі-цёткі выпіску з працоўнай кніжкі патрабуюць, ці сьведкаў якіх, зь якімі разам паравоз вадзіў. Але дзе іх возьмеш? Працоўная кніжка, разам з астатнімі дакумэнтамі, у сорак першым годзе згарэла, сьведкаў на вайне пазабівала, ды і сама чыгунка – Полацак – Пскоў, -- па якой ён цягнікі вадзіў, толькі на старых мапах засталася; немцы з партызанамі яе так разьдзяўблі, што потым і аднаўляць не ўзяліся.

Дзеда наагул цікава паслухаць. Шмат чаго пабачыў. Асабліва цікава пра вайну распавядае. Пра тое, як немец у першы ж дзень дваццаты разьезд разбамбіў, і яны зь цягнікам пад Ідрыцай захрасьлі. Двое содняў потым на дрызіне ехалі – ён з машыністам, ды два камандзіры з валізамі. Дзеда, як толькі да дому дабраўся, у Вязьму адправілі, у распараджэньне камандаваньня. Паехалі яны з Іванам Пятровічам – гэта з машыністам, значыцца, -- у Вязьму, а даехалі толькі да Смаленска. Нямецкія самалёты на эшалён наляцелі. Цэлую гадзіну бомбы кідалі ды з кулямётаў стралялі. Там жа машыніста і забіла. Беглі яны да

лесу, ад бамбёжкі ратуючыся, -- Іван Пятровіч стары ўжо быў, зь сіл выбіўся. Убачыў пад нагамі вядро, паваліўся і галаву ў тое вядро ўціснуў: схаваўся нібыта. Так яго, ляжачага, кулі і прашылі. Дзед яго сам і пахаваў. Тычку ў грудок уваткнуў ды фуражку чыгуначную павесіў – каб знак застаўся.

Пра ўсё гэта Маша ў лісьце і напісала. Хто ведае, можа і расчуляцца тыя дзядзькі ды цёткі й дабавяць дзеду пэнсію. А то ж на семдзесят рублёў ня надта разжывесься.

Скрозь вулічны шум прарываецца зычны Люсьчын голас:

-- Маша, купі...

Люська стаіць на супрацьлеглым баку вуліцы, паказвае рукою на ятку з марозівам. Машы й самой маніцца паласавацца марозівам, але ласавацца на вуліцы не выпадае: у Люські пашыраныя завалкі – ураз захварэе.

-- Пайшлі ў гастраном. Марозіва ў кавярні возьмем... з сочывам! -- крычыць яна сястры і, зірнуўшы на бокі, перабягае вуліцу.

У гастраноме цёмна ад народу. Даюць жывую рыбу. Сёстры прыўзьнімаюцца на дыбачкі, глядзяць паўзьверх людзкіх галоў, а пачуўшы воклік: -- Болей не займайце! -- ідуць у кандытарскі аддзел.

-- Ну што, вунь той возьмем? -- пытаецца Маша, ківаючы на квадратны пяцірублёвы торт, але Люська зачаравана глядзіць на круглы, васьмірублёвы, з надпісам «С днём рождения!» і вялізнай крэмавай ружай пасярэдзіне.

Восем рублёў за торт – гэта, вядома ж, задарага. А яшчэ зьбіраліся шкарпэткі купіць і шпільку для валасоў.

-- Давай гэты, -- выдыхае Люська, -- ніколі такога ня елі. І маму зь днём нараджэньня павіншуем.

-- Зь якім яшчэ днём нараджэньня? У яе ўжо быў, -- мармыча Маша і пунсавее з твару. «І сапраўды. Чаго

скупендзіцца. Хоць раз маму павіншуем па-сапраўднаму, а то дорым увесь час нейкую лухту», -- і з гэтаю думкаю яна лезе ў кішэнь па грошы.

Прадаўшчыца, дзябёлая цётка ў брудным халаце, нешта жуе, глядзіць на Машу, запытальна торгае галавой.

-- Нам вось гэты, за восем рублёў, -- лапоча Маша, і прадаўшчыца, павярнуўшыся ў бок адчыненых дзьвярэй, гукае:

-- Пятроўна! Ты торт браць будзеш?

-- Не-э! -- даносіцца аднекуль з крамных лёхаў, і цётка, падхапіўшы торт, спрытна пакуе яго ў кардонку.

Дахаты ідуць прыцемкам, пацепваючыся ад золкага ветру. Люська зусім адубела; кашляе, сморкаецца, і халодная кропля вісіць пад носам.

«Дарма столькі марозіва дала. Чаго добрага -- захварэе», -- бядуе Маша і на хаду выцірае мокрую Люсьчыну кірпаўку.

Ля дрывотні, нябачныя ў цемры цётка Таццяна і яшчэ нейкая кабета, грукаюць дровамі, суцішна перамаўляюцца.

-- Спачатку ж у чыгуначную павезьлі, а потым, як агледзеліся, дык у абласную, -- выдыхае цётка ўпалым голасам. – Дарма толькі мучылі чалавека.

-- Гэтыя ўрачы... ні чорта ня знаюць... – уключаецца ў размову кабета, і голас ейны заглушае гуд маняўровага цеплавоза.

Дзьверы дзедавай кватэры адчыненыя, і сноп сьвятла, што цэдзіцца зь дзьвярэй, асьвятляе разьлеглую лужу пад ганкам. Маша ступае на ганак, зазірае ў прысенак, расшпільвае, а потым зноў зашпільвае гузікі паліто.

У пакоі гуляе вецер. Гойдаюцца фіранкі на вокнах, калыхаюцца канцы абруса на стале і нават рукаво старога шыняля, што вісіць ля ўваходу, зьлёгку варушыцца ад проймы. Пад нагамі здрыганаецца падлога і дзесьці непадалёку стамлёна ўздыхае цеплавоз.

-- Ну, як там Іванавіч? -- крычаць зь цеплавоза, і цётка Тацяна, грукнуўшы паленьнем, плаксіва прамаўляе:

-- Памёр Іванавіч.

Маша глядзіць на акуратна прыбраную пасьцель, на расьціснутага прусака пад нагамі і ніяк ня можа дапяць да сэнсу цётчыных словаў.

-- Дзядуля, а мы торт прынесьлі, -- усхліпвае дзяўчына, уціраючы сьлёзы рукавом дзедавага шыняля, -- хацелі цябе пачаставаць.

Зумкаюць шыбы, дрыжыць падлога. Цеплавоз кранаецца зь месца, гудзе на ўсю сваю моц – раз, потым другі, і рэха сіплага гуду зьліваецца з пошумам халоднага ветру знадворку.

KAMUNIKAT.ORG

# Сьмерць Сьцяпана Кузьміча

***апавяданьне***

Адчыніўшы дзьверы, Сьцяпан Кузьміч зірнуў на бляклую шыльду з надпісам «Сакратар парткаму Ананка М.С.» і, з думкаю: «Трэба замяніць»,-- увайшоў у габінэт.

Усё было на месцы: стол, ходнік, чэзлая герань на падаконьні, кніжная шафа з поўным зборам твораў, адсутнічаў толькі сэйф, які дагэтуль стаяў у куце, і промні нязыркага сьвятла асьвятлялі пыльны квадрат на падлозе.

-- Узяў усё ж такі, -- уголас прамовіў гаспадар габінэту.

Сэйф быў толькі звонку сэйфам – унутры гэтай браніраванай пачвары месьціўся бар зь лядоўняй, і таму ня дзіва, што Ананка загадаў перацягнуць яго на новае месца працы.

Плюхнуўшыся ў крэсла, Сьцяпан Кузьміч сашчапіў пальцы рук, задзёр голаў, зьбіраючыся, як бачна, пазяхнуць, і ў той жа міг заўважыў адсутнасьць яшчэ адной рэчы – там, за сьпінаю, дзе ранейшым часам вісеў партрэт Ільліча, тырчэў пакарабачаны цьвік з накручаным кавалкам аборкі.

-- Крыхабор, -- зазначыў гаспадар габінэту, і рука ягоная пацягнулася да тэлефону.

Сьцяпан Кузьміч набраў нумар зборачнага, прыкусіў вусны, слухаючы працяглыя гудкі ў трубцы, а пачуўшы задыханы голас Карозы, запытаўся:

-- Як справы?

Майстар кашлянуў, пачаў нешта гаварыць, але Сьцяпан Кузьміч перабіў яго новым пытаньнем:

-- Як там... Гасьцюгін?.. Жывы?

-- Жывы! -- адказаў Кароза пасьля паўзы, і гэтая паўза абазначала, што Гасьцюгін хаця і выпіўшы, але справу рабіць здольны.

-- Хай зойдзе! -- гукнуў Сьцяпан Кузьміч і, падсунуўшы да сябе настольны каляндар, паклаў слухаўку.

Лісткі календара былі густа ўсыпаныя Ананкавай пісанінай: «Патэлефанаваць першаму», «Дастаць шыфэр трэцяму», «Сабраць складкі ў зборачным». А сёньняшні дзень, першага лістападу, быў пазначаны дзіўнаю фразай: «Аформіць Леніна па шостым разрадзе». Фраза гэтая прывяла Сьцяпана Кузьміча ў глыбокі роздум. Ён спахмурнеў, пацёр даланёю патыліцу і пасьля хвіліны роздуму адсунуў каляндар на край стала. «Хацеў, відаць, Леніна па шостым разрадзе аформіць... якім-небудзь ганаровым сьлесарам, а грошы сабе ў кішэнь пакласьці», -- і, пятым разам зірнуўшы на цьвік за сьпінай, уголас прашаптаў: -- Хапуга!

... Пра тое, што Ананка пайшоў на падвышэньне, Сьцяпан Кузьміч даведаўся толькі ў пятніцу, калі вярнуўся з санаторыю. Паведаміла яму гэтую навіну жонка. Грэта Міхайлаўна не паленавалася прыехаць на вакзал, і не пасьпеў муж скочыць з вагоннай прыступкі, як жонка плюснула яго ў шчаку і ўсхваляваным голасам выдала:

-- Ананку ў ЦК узялі. У прамысловы аддзел. Цябе на ягонае месца садзяць.

Пасьля санаторыю ён амаль не адчуваў сардэчных перабояў, а тут, пачуўшы такое, схапіўся за грудзіну. Супыніўшыся пасярод пэрону, Сьцяпан Кузьміч заплюшчыў вочы, укінуў у рот валідоліну і ачуўся толькі, як у сьпіну яму заехалі падарожным баулам. Тут жа, на пэроне, жонка распавяла пра разьвітальны банкет на загараднай базе,

згадала – хто напіўся, а хто – не, і ў дадатак паведаміла, што генэральны дырэктар плакаў і гразіўся пакласьці партбілет, калі прамысловасьцю будуць кіраваць такія, як Ананка.

Два дні – суботу і нядзелю – новасьпечаны сакратар парткаму не адыходзіў ад тэлефону: званілі сябры і знаёмыя. Сябры пыталіся пра здароўе, пра сочынскае надвор'е, пра цэны на хурму... Пасьля кожнага такога званку Сьцяпан Кузьміч ляскаў падцяжкамі, з робленай незадаволенасьцю прамаўляў: «Замарылі», -- але пры кожным новым званку кідаўся да тэлефону, абганяючы на паўдарозе каханую жоначку. І вось у панядзелак, расьсеўшыся ў Ананкавым крэсьле, ён каторым разам пералічваў прозьвішчы сяброў, якія яго павіншавалі, і за гэтым прыемным заняткам і ня ўцяміў адразу, што гэта там загуло пад бокам.

-- Сьцяпан Кузьміч! Тут да вас наведнік, -- блазнаваты голас сакратаркі пакрыла густое гудзеньне.

Убіраючы фон, ён няўмела шчоўкнуў тумблерам і з жахам заўважыў, што сядзеў з уключаным мікрафонам. Шчокі Сьцяпана Кузьміча наліліся гарачай чырваньню: уваходзячы ў габінэт, ён меў неасьцярожнасьць гучна бухнуць, і гэта магла пачуць сакратарка.

-- Хто там? Гасьцюгін? -- сабраўшыся з духам, запытаў Сьцяпан Кузьміч.

-- Ды не... тут... – сакратарка на імгненьне змоўкла, -- перапытвала, відаць, прозьвішча наведніка – і неўзабаве паведаміла: -- Таварыш Бурых да вас іравецца.

Рыхтуючыся да прыёму наведніка, Сьцяпан Кузьміч узяў асадку, намаляваў на аркушы чорціка, а калі зірнуў на дзьверы і ўбачыў наведніка, асадка высьлізнула з пальцаў і зь ціхім бразгатам упала на падлогу.

У габінэт уваходзіў... Уладзімір Ільліч Ленін. Так, памылкі быць не магло: гэта быў Ленін! Сонечныя бліскі зіхацелі на магутнай лысіне, вострая бародка зьлёгку дрыжэла, а палец правай рукі быў упіхнуты ў кішэню

камізэлькі. Зрабіўшы колькі крокаў, Ільліч утрапёна паглядзеў на Сьцяпана Кузьміча і, зачапіўшыся нагой за дыванок, запытаўся:

-- А дзе... начальнік?

Сьцяпан Кузьміч аддзьмуўся, пацёр рукавом пераносьсе:

-- Вы што, з тэатра будзеце?

Рукі наведніка хваравіта здрыгануліся.

-- Ды так... калісьці акторыў, -- наведнік памацаў дрыжачымі пальцамі прыклееную бародку.

Усталявалася цяжкое маўчаньне, і Сьцяпан Кузьміч, падняўшы з-пад ног асадку, пастукаў ёю па стале.

-- Тут... разумееце, якая справа... – наведнік ізноў памацаў бародку, якая тым часам ужо адклеілася, і, дыхнуўшы піўным перагарам, выгукнуў: -- Таварыш начальнік, не магу я на тым браневіку ехаць.

Сьцяпан Кузьміч дастаў з шуфляды тэлефонны даведнік, пагартаў, шукаючы нумар вар'ятні, і як бы між іншым запытаўся:

-- Гэта яшчэ чаму?

-- Машына тузаецца – не ўстаяць. Ды і ехаць трэба шпарка – ззаду ж павінны матросы бегчы.

Твар Сьцяпана Кузьміча прасьвятлеў. Ну вядома ж, усё гэта былі ананкавыя штукі. Хацеў таварыш Ананка жывога Леніна перад трыбунаю правезьці, чарговым разам вылучыцца. Ну, ды нічога, цяпер мы і самі вылучымся. І Сьцяпан Кузьміч, падняўшыся на ногі, запытаў:

-- Твае прапановы?

Актор зьдзёр бародку, запіхнуў у кішэню:

-- Трэба, каб я на трыбуне стаяў. Будзе хоць за што трымацца.

-- Дык што ж, мы трыбуну на бранявік паставім?

Апошняе пытаньне зьбянтэжыла актора. Актор панурыў вочы, выцягнуў з кішэні бародку, з жалем уздыхнуў.

-- Таварыш начальнік... я там... у тэатры... бутафорыю пазычыў... ну, пінжак там... камізэльку, акторавыя рукі прабегліся па штрыфелях пінжака, паспрабавалі прыляпіць бародку на старое месца, -- чаравікі яшчэ...

-- Ну і... – перабіў яго «таварыш начальнік».

-- Ну і... хлопцы чаравікі да браневіка прыляпілі. Эпаксыднай смалою. Думалі, так стаяць зручней будзе. Ды я ледзь ногі не зламаў.

-- Ну і... – ужо з нецярплівасьцю ў голасе выгукнуў суразмоўнік.

-- Ну... сталі адрываць і падэшвы адарвалі. А чаравікі дваццаць рублёў каштуюць.

Сьцяпан Кузьміч выцягнуў партманэт, адлічыў тры чырвонцы, потым, падумаўшы, выцягнуў яшчэ пакамечаны траяк і, кінуўшы на стол, прашаптаў:

-- Пасьля абеду зайду. Папярэдзь хлопцаў.

Вялізны, мэтраў пяць увышыню, партрэт Леніна сох на восеньскім ветры, прыхінуты да закуранай сьцяны ліцейкі. Тут жа сохлі партрэты членаў Палітбюро, а пасярод двара стаяў, буркочучы рухавіком, зьбіты з фанэрных лістоў бранявік. Сьцяпан Кузьміч падышоў да браневіка, дацягнуўся рукою да верху круглай вежы і не знайшоў там і сьледу прыліплых падэшваў.

«Артыст», -- зазначыў сабе Сьцяпан Кузьміч, хітнуў галавой, і парывы халоднага ветру данесьлі да ягоных вушэй рып нязмазаных дзьвярэй і абрыўкі бязладнай гамэрні. Гэта рыпалі дзьверы катлапункту, які месьціўся поруч зь ліцейкай, і зь якіх – зусім нечакана – выкуліўся нейкі барадаты бамбіза. Бамбіза мацюкнуўся, зачапіў нагою партрэт члена Палітбюро Арвіда Пельшэ і, абапіраючыся рукамі на сьцяну, стаў расшпільваць нагавіцы. Мяркуючы па перапэцканай у фарбу кашулі, бамбіза быў мастаком.

Напярэдадні кастрычніцкіх сьвятаў мастакі мелі звычай працаваць у катлапункце. Малявалі такою пароюшмат, фарба сохла паволі, а на катлапункце, блізу гарачых труб, усё высыхала адным імгненьнем. Мастакі, вядома, пілі і раней: праносілі пітво праз праходную і, зашыўшыся на тым жа катлапункце, квасілі... Але каб вось так... пасярод працоўнага дня... паліваць сьцены... Такога яшчэ не было. І Сьцяпан Кузьміч, раздумваючы, якой кары заслугоўваюць гэтыя апівуды, рушыў наперад.

Дзьверы рыпнулі, у твар дыхнула вільгацьцю, а нага на самым парозе натыкнулася на нешта жывое і мяккае. Сьцяпан Кузьміч падскочыў, зірнуў долу і ўбачыў пад нагамі пляшывую актораву галаву. Актор спаў, паклаўшы галаў на парог і абдымаючы рукою мэталёвую піўную бочку. У памяшканьні было горача, таму, відаць, Бурых і прылёг на парозе.

У глыбіні катлапункту, пад лёзунгам «Слава перадавой савецкай навуцы!», сядзелі трое: вусаты маладзён у цёмных акулярах, нейкі сівабароды здыхляк і дарэшты сп’янелы сьлесар Гасьцюгін. Маладзён сядзеў на ацяпляльнай трубе, жаваў кіслы агурок і прамаўляў:

-- А я табе кажу... твой Шагал... нікчэмнасьць! Разумееш? Нік-чэм-насьць! -- сказаўшы слова «нікчэмнасьць», маладзён змоўк, рашуча заварушыў сківіцамі, і кроплі агурочнага расолу дробна задрыжэлі на гладкім падбародзьдзі.

Здыхляк, да якога ён зьвяртаўся, а разам зь ім і сьлесар Гасьцюгін ужо не маглі нічога сказаць – адно толькі ікалі, і іхныя лядашчыя целы кожным разам адчайна здрыганаліся.

-- Што тут чыніцца? -- выдыхнуў Сьцяпан Кузьміч, паслабляючы гальштук на ўзмакрэлай шыі. Голас ягоны зрываўся ад хваляваньня, а пальцы ніяк не маглі разьвязаць вузел.

Маладзён пакінуў жаваць, утаропіўся на дзьверы, і дзьверы ізноў рыпнулі, гэтым разам настойліва і рашуча.

Сьцяпан Кузьміч азірнуўся. У дзьвярной пройме стаяў барадаты бамбіза. Хвіліну апівуда варочаў бялкамі вачэй, пасьля чаго, раскрыліў рукі і, блытаючы Сьцяпана Кузьміча з нейкім сваім знаёмым, загарлаў:

-- Вася?! Кораш! І ты тут!

У Сьцяпана Кузьміча закружылася галава. Ён адпіхнуў ад сябе п'яную пысу, якая лезла цалавацца і, задыхаючыся ад абурэньня, вылецеў з катлапункта.

Першая думка была: выклікаць міліцыю. Ён нават паскорыў крок, шыбуючы ў бок заводакіраўніцтва, але неўзабаве сьцішыў хаду і пачухаў голеную сківаць. «Ну добра, здам я іх у міліцыю. А хто будзе лёзунгі дамалёўваць? Пушкін? Дый ці варта ўздымаць вэрхал? Яшчэ, чаго добрага, у абкаме даведаюцца», -- згадаўшы пра абкам, Сьцяпан Кузьміч пацямнеў з твару і пужліва агледзеўся. Гадзіньнік на будынку заводакіраўніцтва паказваў палову чацьвертай. «Пайду ў зборачны, да Карозы. З гэтым Гасьцюгіным трэба штосьці рабіць. Далей так доўжыцца ня можа», -- падумаў Сьцяпан Кузьміч, памкнуўся было ісьці, ды неўзабаве ізноў супыніўся... Турбаваць Карозу не было сэнсу. У п'янтоса Гасьцюгіна залатыя рукі: лядоўні ў сэйфы ўштукоўвае, магільныя агароджы зь нержавейкі кляпае. Здаецца, і цяпер некаму агароджу ладзіць... Ці ня цешчы першага сакратара? Такога паспрабуй – здай у міліцыю. І сам там апынесься.

Сьцяпан Кузьміч крэкнуў, уголас прашаптаў: «Заўтра разьбяромся», -- і разважлівай, але напорыстай хадою рушыў да прахадной.

Назаўтра, акурат а дзевятай гадзіне, ён увайшоў у прыёмную і ўбачыў ля дзьвярэй свайго габінэту актора Бурых. Актора было цяжка пазнаць; твар апух, вочы заплылі, а рукі дрыжэлі страшней ад учарашняга. «Абстынэнтны сындром», -- зазначыў Сьцяпан Кузьміч і кіўком галавы запрасіў актора ў габінэт.

Тэатральны растрыга доўга стаяў на парозе, камечыў у руках капялюш, нарэшце сабраўся з думкамі і не сваім голасам прамармытаў:

-- Ёсьць ідэя.

Словы гэтыя разьвесялілі: у такой галаве яшчэ маглі нараджацца нейкія ідэі... Гаспадар габінэту пасьміхнуўся, сеў у крэсла, узьняў на наведніка дапытлівыя вочы.

-- Ёсьць ідэя, -- паўтарыў Бурых і дзеля ілюстрацыі сваёй ідэі намаляваў рукамі ў паветры штосьці падобнае на квадрат. – Памятаеце, я ўчора казаў пра трыбуну? – Сьцяпан Кузьміч, вядома ж, памятаў, але шчыра падзівіўся, што пра гэта памятаў Бурых.

Актор падыштоў да стала, наліў у шклянку вады з графіну.

-- Карацей, зьбіваем з фанэры трыбуну, абцягваем чырвонай матэрыяй, а пад трыбунай «радыста» садзім... з магнітафонам... – зубы акторавы залескаталі па шклянцы, а квадратны коўцік прагна заварушыўся.

Наталіўшы смагу, Бурых аддзьмуўся, выцер рукавом вусны.

-- Запішам на стужку голас Леніна і запусьцім. Уяўляеце? Я стаю на трыбуне і прамаўляю ленінскім голасам. Бацькі горада са штаноў павыпадаюць.

Сьцяпан Кузьміч заплюшчыў вочы, уявіў, як бацькі горада будуць «выпадаць са штаноў», і натхнёна пацёр скроні. Ідэя была, безумоўна, цікавая: пусьціць жывое ленінскае слова – і сам Ленін на трыбуне... Да гэтага, здаецца, яшчэ ніхто не дадумваўся.

-- Ну добра, -- прамовіў гаспадар габінэту, -- зьбівайце трыбуну, а там пабачым. -- Сьцяпан Кузьміч падняўся з крэсла, дэманструючы, што размова скончаная, але наведнік і ня думаў сыходзіць. Бурых стаяў, панурыўшы вочы, і камячыў шматпакутны капялюш.

Сьцяпан Кузьміч пахітаў галавой, выцягнуў з кішэні пару рваных рублёў, кінуў на стол, і Бурых, схапіўшы грошы, вомігам зьнік з габінэту.

Увечары наступнага дня трыбуна была зьбітая, абцягнутая чырвонай матэрыяй і ўмацаваная на кодабе да бляску вымытага «газону». Высозная, падсьвечаная зыркім пражэктарам, яна нагадвала нейкую фэерычную спаруду, і дробны дождж, які сыпаў зь неба і бліскаў у пражэктарным промні, толькі падкрэсьліваў гэтую фэерычнасьць.

Сьцяпан Кузьміч падышоў да «газону» ў той момант, калі хлопцы-«радысты» заканчвалі манціраваць радыёўстаноўку. У адтуліне, што месьцілася з тылінага боку трыбуны, нехта варушыўся, а з гучнагаварыльніка, які стаяў на даху кабіны, вырываліся на прастору сапеньне і просьбы кшталту: «Юрка, пасьвяці. Нічога ня бачу». Тут жа, ля трыбуны, праходжваўся і актор Бурых у грыме. Актор прыкметна хваляваўся; штохвілі керхаў, паціраў потныя рукі, мацаў прыклееную бародку і напаўголасу паўтараў:

-- Як перад прэм’ерай...

Неўзабаве сапеньне ў рэпрадуктары аціхла, заводзкі двор напоўніўся злавесным сьвістам, і нехта ўрачыстым голасам запытаўся:

-- Что такое Советская власть?

-- Гатова! -- вырвалася адразу зь некалькіх глотак, і актор Бурых, уваходзячы ў ролю, ступіў крок наперад і з картавінкай у голасе прамовіў:

-- Очень... очень хаашо!

Рабацягі, што стаялі вакол трыбуны, загаманілі, зарагаталі, але калі на трыбуну ўзышоў жывы Ленін, разам аціхлі.

-- Что такое Советская власть? В чём заключается сущность этой новой власти, которой не хотят или не могут понять ещё в большинстве стран? -- грымнула над людзкімі

галовамі, «газон» скрануўся зь месца, і ўсе, хто знаходзіўся на заводзкім двары, міжволі рушылі сьледам. Сьцяпан Кузьміч рушыў таксама і, глытаючы халодны камяк у горле, дараваў актору прапітыя трыццаць пяць рублёў.

У ноч напярэдадні сьвята Сьцяпана Кузьміча апанавала бяссоньне. Ён доўга круціўся на ложку, два разы піў валяр'янку, а калі, у рэшце рэшт, заснуў, сон прыйшоў трывожны і замарачны. І прысьніўся Сьцяпану Кузьмічу п'янюга Гасьцюгін, які махаў перад ягоным носам разьлівачным каўшом, прысьніўся актор Бурых, які бегаў вакол вогнепырскай вагранкі, дэклямуючы «Чарговыя задачы Савецкай улады», і нават калі ён прачнуўся і прыўзьняў голаў над падушкай, шум дажджу знадворку і далёкі лямант рэпрадуктараў падаліся яму галасамі гэтых п'янюг.

Ранак зеўраў цёмнымі вокнамі. Сьцяпан Кузьміч крыху папесьціўся ў ложку і, пералезшы праз сонную жонку, пасунуўся на кухню гатаваць сьняданак.

Трывожныя прадчуваньні не давалі спакою і потым, калі ён ехаў на завод, і калі выводзіў сьвяточную калёну на месца збору.

«І собіла ж мне зьвязацца з гэтым акторам», -- круцілася ў галаве назойлівая думка, і галава ад тае думкі рабілася ўсё болей цяжкою і тлумнай.

Яшчэ ўчора ідэя правесьці па горадзе «жывога Леніна» здавалася геніяльнаю, а сёньня... Сёньня халодныя сумненьні кроілі збалелае сэрца. «Узгадніць трэба было гэты маскарад. У тым жа абкаме. Усё ж ня Несьцерку павязем, а Леніна», -- з гэтаю думкаю Сьцяпан Кузьміч сышоў на ўзбочыну праспэкта – паглядзець, ці рушылі пярэднія калёны, і ногі ягоныя адчулі лёгкае ўздрыгваньне. Па галоўным пляцы пайшла ваенная тэхніка.

Парывы волкага ветру валілі з ног. У майстра Карозы, які стаяў паперадзе калёны, трымаючы ў руках пераходны Чырвоны сьцяг, вецер зьдзер з галавы капялюш, камсамольскай сакратарцы Аўдошцы ўзьняў спадніцу, а ў партрэта члена Палітбюро Далгіх абламіў дзяржальна, на якім той партрэт трымаўся.

«Як тое будзе?» – уздыхнуў Сьцяпан Кузьміч і, гнаны ў сьпіну парывамі ветру, пашыбаваў у канец калёны даваць апошнія настаўленьні актору.

Актор сядзеў у кабінцы «газону», а побач зь ім, выставіўшы ў акно няголены твар, сядзеў сьлесар Гасьцюгін.

-- Як вы тут... не ўжываеце? -- гукнуў Сьцяпан Кузьміч, скочыўшы на прыступку кабінкі.

-- Кузьміч... крыўдзіце... – не зусім цьвёрдым голасам азваўся сьлесар Гасьцюгін, а актор Бурых, памацаўшы бародку, заклапочана вымавіў:

-- Юркі няма.

-- Якога Юркі?

-- Ну... манцёра... які павінен магнітафон уключыць, -- Бурых вінавата пасьміхнуўся і, тыцнуўшы пальцам у лабавое шкло, дадаў: -- Вунь, ужо ідуць!

Дэманстранты бязладным натоўпам рушылі наперад, шафёр машыны крутнуў ключ запальваньня, а Сьцяпан Кузьміч спалохана крыкнуў:

-- Дык чаго вы седзіце?!

Часу на роздум не было. Сьцяпан Кузьміч адчыніў дзьверцы, ухапіўся рукою за рукаво гасьцюгінскага плашчу:

-- Гасьцюгін, лезь у трыбуну... Магнітафон уключыш.

Сьлесар замармытаў штосьці пра адгулы, зь неахвотаю вылез з машыны, а сьледам скочыў на асфальт і актор.

-- Ленін! Ленін! -- закрычалі навокал, і Сьцяпан Кузьміч, азірнуўшыся, увабраў голаў у плечы.

«Газон» тузануўся, актор з Гасьцюгіным на хаду залезьлі ў кодаб – балазе барты былі адкінутыя – і вокраччу

папаўзьлі да бутафорскай трыбуны. Такія паводзіны «жывога Леніна» разьвесялілі публіку. Публіка зашумела, зарагатала, а нехта нават сьвіснуў. Некалькі чалавек з ачапленьня кінуліся ў той бок, адкуль пачуўся сьвіст, і ў Сьцяпана Кузьміча ад такой праявы затрэсьліся паджылкі.

-- Левая клявіша! Другіх не чапай... – гукаў Бурых, нахіліўшыся да цёмнай адтуліны, зь якой тырчэлі абцасы стаптаных гасьцюгінскіх чаравікаў.

Адтуліна асьвятлілася на імгненьне кволым сьвятлом – Гасьцюгін чыркнуў запалкай, у трыбунных нетрах штосьці бразнула, а за сьпінаю Сьцяпана Кузьміча прагучалі словы, ад якіх ногі сталі ватныя і сьвет перакуліўся дагары нагамі.

-- Таварышы, гэта ж блюзьнерства!

Ня памятаючы сябе, ён кінуўся наўздагон машыне, махнуў рукою, загадваючы актору дзе-небудзь схавацца, але той, па-свойму зразумеўшы такую адмашку, схапіўся за поручні і сьпехам узьлез на трыбуну.

Навокал ізноў зашумелі, але гэтым разам у людзкіх галасах чулася шчырае захапленьне. «Жывы Ленін» выцягнуў з кішэні палатняную кепурку, сьціснуў яе ў кулаку, выцяў кулаком дажджыстае неба. Буханьне аркестру на пляцы патанула ў бурных воплесках.

«Усё цудоўна!» – супакоіў сябе Сьцяпан Кузьміч. Ідучы ўпоравень з машынай, ён налёг грудзінаю на борт і, пазіраючы ў цёмную адтуліну, зь нецярплівасьцю запытаў:

-- Ну, што там у цябе?

-- Цёмна... – заварушыўся ў трыбунным чэраве Гасьцюгін. Сьлесар ізноў чыркнуў запалкаю, здушана выдыхнуў: -- Зараз урублю.

-- Уключаем! -- крыкнуў Сьцяпан Кузьміч, і актор, прылашчыўшы бародку, энэргічна заляпаў бязгучным ротам.

Кляцнуў магнітафон, засіпеў рэпрадуктар, і гулкую прастору скалануў надрыўны тэнар:

--Дире-эвня-а! Диревня-а родная-яя...

Громападобная песьня ўлякнула ня толькі Сьцяпана Кузьміча, але й вадзілу «газона». Вадзіла рэзка тармазнуў, потым з гэткай жа рашучасьцю, зь якой ціснуў на тормаз, націснуў на газ. Машына рванулася, наверсе войкнулі, Сьцяпан Кузьміч спалохана сьцяўся, чакаючы актаравага падзеньня, але Бурых, дзякаваць Богу, утрымаўся на верхатуры і, ці то зь перапуду, ці то з адчаю, галёкнуў на ўсю моц сваіх лёгкіх:

-- Чьто такое Советская в’асть?... В чём заключается сущность этой новой в’асти?..

-- Малайчына, Бурых, -- адно й прашаптаў Сьцяпан Кузьміч, маліцьвенна пазіраючы на актора. Актор шпарыў без запінкі і ня нейкую там адсябеціну, а амаль слова ў слова паўтараў тое, што было запісана на магнітафоннай стужцы. Машына праехала міма ўнівэрмагу, параўнялася з будынкам галоўпаштамту, і новы выбух рогату прымусіў Сьцяпана Кузьміча схапіцца за сэрца.

-- Советкая в’асть неминуемо, неизбежно... победит во всём мире! -- лямантаваў Бурых, не зважаючы на тое, што бародка адарвалася ад падбародзьдзя і матлялася недзе ля вуха.

-- Стой, халера! -- крыкнуў Сьцяпан Кузьміч. – Барада адарвалася! -- Але Бурых не пачуў. На актора найшло праўдзівае шаленства. Ён махаў рукамі, матляўся ў розныя бакі, небясьпечна перавальваўся цераз поручні.

-- Стой ты, халера! -- удругарадзь крыкнуў Сьцяпан Кузьміч і, выхапіўшы зь нечых рук партрэт Л. І. Брэжнева, ляснуў ім па фанэрнай трыбуне. Актор ізноў не пачуў, а Гасьцюгін, які сядзеў у трыбунных нетрах, выставіў з адтуліны азадак і, рухаючыся па-рачынаму, запытаўся:

-- Што, можна вылазіць?

Машына выяжджала на пляц.

Не выпускаючы з рук партрэту, Сьцяпан Кузьміч убіўся ў кабінку, адчайным рухам крутнуў руль на сябе. Разганяючы

натоўп, машына выехала на ходнік, падмяла коламі пару транспарантаў і, ламаючы кусты, завярнула ў правулак.

Дадому прыехалі толькі па абедзе: галоўныя вуліцы былі перакрытыя, апрача таго, трыбуна не праходзіла пад мастамі, і давялося доўга круціцца па завулках, вырываючыся з гарадзкога цэнтру. Шафёр хацеў тут жа, з тэлефоннай будкі, выклікаць «хуткую», але ён запярэчыў; сказаў, што выкліча сам, і, хістаючыся, пайшоў да пад’езду.

Сэрца парывіста грукацела. Сьвет брыніў уваччу, а вушы поўніліся замарачным шумам. І здавалася Сьцяпану Кузьмічу, што ідзе ён не па прыступках, а ўзьбіраецца на палок горача напаленай лазьні – той самай, загараднай лазьні, у якой па суботах мылася начальства. Плюхала вада ў душы, сыкалі палітыя вадою камяні ў парыльні, і з прымыльніку бадзёрым голасам гукаў Ананка:

-- Казаў табе... на браневіку трэба было ехаць.

-- На браневіку... – паўтаралі бяскроўныя вусны, і рукі адчайна хапаліся за парэнчы, і галава ягоная асоўвалася ўсё ніжэй і ніжэй, аж пакуль не знайшла сабе спачын на халодных прыступках.

# Гісторыя аднаго злачынства

***аповед***

Бляшаны рупар на даху аўтастанцыі засіпеў, засьвістаў на высокай ноце, і ў мэталёвых нетрах ягоных нарадзіўся дзявочы голас:

- Валерка, адчапіся!

Праз вузенькае вакно можна было назіраць, як маладая дыспэтчарка замахнулася на Валерку мікрафонам і хлопец, прыхапіўшы пад пахі шыльду з надпісам «Бычкі», зь вясёлым рогатам выбег на падворак.

- Аўтобус на Бычкі зь білетамі на 17-40 адправіцца з другой пляцоўкі. Паўтараем...

Зычны голас сагнаў з рэпрадуктара мух, ўзьняў у паветра чараду галубоў, падняў на ногі бычкоўскіх жанок і бабуль. Жанкі ўскінулі на плечы хатулі з абаранкамі, пабралі за рукі дзяцей і зь непрыхаванаю трывогай паглядзелі ў бок прыстанцыйнага павільёну.

Лапацелі крыламі галубы, плакалі, просячы купіць ім «маножана», дзеці, а ў прыстанцыйным павільёне, вядомым у народзе пад назваю «мардоўня», жыцьцё ішло сваім ладам. Наведнікі «мардоўні» дымілі «Прымаю», гаманілі, уголас

мацюкаліся, не зважаючы на абвестку дыспэтчаркі, і толькі надрыўны вокліч: «Каб цябе парвала!» - прымусіў некаторых зь іх схамянуцца і сьпехам дапіць каламутнае, да рыпеньня на зубах збрыжэлае піва. Мужчыны падаліся да выхаду, і самы маладзейшы зь іх, Іван Бянькоў, перад тым як выйсьці з «мардоўні», пранізьліва ікнуў.

- Што, Ваня, душа з Богам размаўляе? - гукнулі з натоўпу, і Ваня ікнуў другім разам, адчайна страсянуўшы плечукамі.

Убіўшыся ў аўтобус, Іван заняў месца ля прачыненага вакна, з палёгкаю аддзьмуўся і пільным вокам зірнуў на цётку Авадзіху.

- Во лезуць. І заціснуць, калі хочаш, - казала старая, лезучы па праходзе з двума мяхамі камбікорму.

Авадзіха даводзілася Івану роднаю цёткай: мінулым заездам ён сьцягнуў у сваячкі тры літры самаробнага віна і цяпер хваляваўся, ня ведаючы, што скажа на гэта Авадзіха. Але старая, нічога такога не сказаўшы, плюхнулася поруч, задаволена ўскудлаціла пляменьніку чупрыну, і той, чарговым разам аддзьмуўшыся, зірнуў у вакно.

Каля аўтобуса стаялі тыя, каму не хапіла білетаў. Перад Іванавым носам варушыліся потныя патыліцы, бліскалі на сонцы плехі, матляліся на ветры ражкі капронавых хустак, і над усім гэтым людзкім шматгалоўем лунаў, драпежна разявіўшы ляпу, блакітнавокі сіямскі кот.

- Разарваць можа, - крыкнуў Іван бялявай дзяўчыне, якая трымала ката на ўзьнятых руках, пасьля чаго кот разьюшана сыкнуў, а дзяўчына, праціснуўшыся бліжэй да аўтобуса, кволым голасам пралепятала:

- Калі ласка, перадайце Маркіза маме.

«Якой маме?» - хацеў спытацца Іван, ды ў гэты момант кот сігануў у вакно і, правёўшы хвастом па Іванавым носе, зьнік пад сядзеньнем.

- Во халера! - выгукнуў Іван і нечакана зноў ікнуў, уражаны страшэнным лямантам за сьпінай.

- Ай! Ай! Хто гэта там лезе?! - немым голасам крычала завуч Бычкоўскай васьмігодкі Марковіч. Антаніна Пятроўна пашнарыла рукой пад сядзеньнем, схапіла «сіямца» за шкірку, і кот, пакінуўшы чырвоны пісяг на носе бібліятэкаркі Забароські, узьбіўся на голаў нейкаму падпітаму дзядзьку.

- А людцы мае добрыя, а што ж гэта робіцца? - залямантавала старая Авадзіха, калі падпіты дзядзька, ня сьцяміўшы, што да чаго, брыкнуў нагой цётчынага заця, разамлелага мэханізатара Бадунова. Бадуноў не застаўся ў даўгу: заехаў крыўдзіцелю ў лоб, але на гэтым усё і скончылася. Дэбашыраў разьнялі, расьцягнулі ў розныя бакі.

- Паскуда. Увесь нос абдзёр, - усхліпнула за Іванавай сьпінай Ніна Забаронька.

- Духамі прыпячы, - прараіла бібліятэкарцы завуч Марковіч. Крутнуўшы галавой, Антаніна Пятроўна керханула і голасам рэвалюцыйнай камісаршы запыталася:

- Таварышы, чый гэта кот?

Завішчэла сьвінчо ў торбе, Ніна Забаронька шморгнула носам, а дзябёлая кабета, што выцірала абрыўкамі «Ленінградзкай праўды» запыленае сядзеньне, коратка прамовіла:

- Мой!

- Кацька... Зь Ленінграду... - прашаптала за Іванавай сьпінай Ніна Забаронька. - Летась з мужыком разьвялася.

Іван наструніў слых, мерачыся пачуць яшчэ тое-сёе, але ў гэты момант загуў матор і аўтобус паехаў.

- А далібог, пашалелі гэтыя курортнікі. З катамі ў аўтобус лезуць, - гукнула Авадзіха і словы гэтыя былі апошнія, якія

пачуў Іван. Празь імгненьне ён ужо спаў, паклаўшы голаў на нікеляванае біла сядзеньня.

За чыгуначным пераездам аўтобус зварочвае з шашы, нейкі час едзе па асфальце, а даехаўшы да пахілага шчыта з надпісам «Калгас «Шлях камунізму», страсянаецца на выбоінах усімі сваімі бляхамі і жалезкамі. Іван стукаецца лобам у нікеляванае біла, асавела паводзіць вачыма і неўзабаве зноў засынае, тулячыся вухам да цётчынага плечука.

- Во як у чужыць людзях. І галава не трымаецца, - мармыча Авадзіха і, каб пляменьніку ямчэй было спаць, хіліць плячук долу.

Ваня Бянькоў нарадзіўся на станцыі Назарбай Цалінаградзкай вобласьці. Увесну пяцьдзесят чацьвертага маці ягоная, Ларыса Пятроўна, пазычыўшы сто рублёў у суседкі, набыла фанэрную валізу і ад'ехала на асваеньне цалінных і абложных зямлі.

На цаліне Ларыса Бянькова спачатку завашывела, потым зацяжарала і ў лютым наступнага году, на восьмым месяцы цяжарнасьці, падалася дадому, зь вялікай цяжкасьцю ўбіўшыся ў таварна-пасажырскі цягнік.

Дзесьці пад Акмолінскам Ларысе стала блага, яе зьнялі зь цягніка, занесьлі на станцыю, і там, у дзяжурным пакоі чыгуначнай станцыі Назарбай, Іван і зьявіўся на сьвет, прывітаўшы залівістым енкам бяскрайні цалінны абшар.

Бацьку свайго Іван бачыў толькі на фотаздымку - маленькім, пацьмянелым ад часу здымку, які і дагэтуль вісіць над матчыным ложкам і на якім калі і можна што ўгледзець, дык гэта тое, што бацька быў вусатым.

Маці наагул любіла вусатых мужыкоў. Вунь і дзядзька Коля, кватарант іхны, таксама вусы насіў. Добры быў дзядзька. Дзьве зімы ў іх кватараваў, аж пакуль маці яго ня

выгнала. Даведалася, што кватарант жонку з двума сынамі кінуў і ад алімэнтаў хаваўся. Зьехаў дзядзька Коля, нават валізу не прыхапіўшы. А ў валізе «Памятка дэсантніку» ляжала. Маленькая такая кніжачка. На вокладцы нумар напісаны і грыф адпаведны: «За пределы части не выносить!» Памятку тую Іван прачытаў разоў мо дваццаць і так захварэў на парашутызм, што з хаты ўсе прасьціны павыносіў. Парашуты зь іх майстраваў: да ражкоў аборкі прывязваў ды скакаў з суседзкай пуні. Вышыня было, вядома, непаважная... нейкіх пару мэтраў. Але аднаго разу давялося Івану зьдзейсьніць скачок, перад якім самлеў бы і сапраўдны парашутыст-выпрабавальнік, пагатоў скакаць давялося не з парашутам, а з падзертым парасонам. Пад'юдзілі яго на гэта ленінградзкія хлопцы, якія ў вёсцы гасьцявалі. Яны і парасон далі...

«Скочыш, - сказалі, - скрыню ліманаду паставім».

А скакаць трэба было зь сіласнай вежы.

... Ад сьмерці Івана ўратавала куча ссохлага гною, што ляжала пад вежаю, - яна і зьмягчыла ўдар. Толькі нагу і зламаў. Хірург пасьля апэрацыі распытваць узяўся. Маўляў, што ды як. Ці самохаць зь вежы сігануў, ці піхнуў хто, а распытаўшы, яшчэ нейкага прывёў. Сівога такога, з круглявым люстэркам на лобе.

- Вось, - кажа, - Аркадзь Барысавіч, цяжкі выпадак. Парашут у хлопца не раскрыўся.

Аркадзь Барысавіч Івану ў вочы глядзеў, штосьці па-замежнаму мармытаў, а нахіліўшыся да Іванавага вуха, запытаўся:

- Прыпадкі былі?

Прыпадкаў у Івана, дзякаваць Богу, не было, на мэнінгіт ён не хварэў, у пасьцель не мачыўся, але пасьля такіх роспытаў насельнікі палаты сталі глядзець на яго з насьцярогаю і

спачуваньнем, а цёткі на мыліцах, што раз-пораз зазіралі ў палату, цокалі языкамі і напаўголасу прамаўлялі:

- Гэта ж трэба... такі малады, а ўжо чокнуўся.

Першыя тры дні ложак Іванаў стаяў усутыч да ложка дзеда Яўхіма, і ад таго суседзтва Іван і папраўдзе быў блізкі да вар'яцтва. Прычынай таму сталася бясконцая кашляніна і хворыя вантробы восемдзесятгадовага гаротніка. Ратуючыся ад апраметных зыкаў і пахаў, Іван клаў на твар падушку, з галавою ўкручваўся ў коўдру, а ўкруціўшыся, цэлымі гадзінамі пакутваў ад недахопу кіслароду.

На трэція содні дзед Яўхім памёр, і суседні ложак заняў хлопец з пашкоджаным хрыбетнікам. Сусед быў гадоў на пяць старэйшы за Івана і меў надзіва ладную постаць. Атлетычныя цягліцы ягоныя прыкметна пукаціліся пад цяльняшкаю, і гэтыя цяльняшка, а таксама наколка катвігі на левай руцы, наводзілі на думку, што сусед быў зьвязаны з морам.

Паклалі суседа на голыя дошкі, загадалі ляжаць незварушна, але хлопец, пакруціўшыся пару гадзін, зьбег з палаты праз адчыненае вакно і вярнуўся толькі апоўначы.

... Тае начы Івану ня спалася. Ды і як было заснуць, калі ў больнічным садзе сьпяваў салавей, калі пад вокнамі палаты буяла чаромха, а на суседнім ложку ляжаў, пакутуючы на бяссоньне, гэткі ж начны летуценьнік. Яны разгаварыліся, і сусед, які назваўся Станіславам, з горыччу ў голасе паведаміў, што мапэд «Верхавіна» зусім ня слухаецца на спусках і што трэскі ад паркану, у які ён урэзаўся, разьляцеліся па ўсёй вуліцы. Распавёўшы Івану сваю невясёлую гісторыю, сусед абклаў мацюгамі пазванковыя дыскі, якія гэтак недарэчы зрушыліся ў ягонай хрыбціне, і запытаўся:

- А ты што, зь вежы зваліўся?

Крыўднае гэта было пытаньне. У Івана нават шчокі зачырванеліся. Што ж ён, сапраўды, мяшок які, каб зь вежы

падаць? Так і сказаў Станіславу, а яшчэ сказаў, што наступным разам парасон алюмініевым дротам змацуе і што... Хацеў і яшчэ нешта сказаць, ды тут Адстаўнік прачнуўся. Зьвяглівы такі дзядзька, у куце ля самых дзьвярэй ляжаў. Ну і, вядома, заенчыў: спаць яму, хвораму чалавеку, не даюць. Але затое наступным днём пагаманілі яны з суседам як мае быць. Гаманіў, праўда, адзін Станіслаў; Іван больш слухаў, а тое-сёе нават занатоўваў. Занатаваў, прыкладам, пару эстонскіх мацюкоў, запісаў рускімі літарамі эстонскі выраз «Куст сааб оста віна?» («Дзе тут можна ўзяць віна?»), а таксама з асаблівай руплівасьцю перамаляваў са Станіслававага нататніка ў свой сэрыю мудрагелістых «камасутраўскіх» паставаў. Слухаючы «караля мараходкі», Іван міжволі сьціскаў кулакі, раз-пораз заплюшчваў вочы, і яму здавалася, што гэта не Станіслаў, а ён, курсант Бянькоў, б'ецца на танцах у клюбе маракоў, што гэта ён раздае аплявухі салагам і гэта на ягоных, Іванавых, грудзях засынаюць зьняможаныя талінскія прыгажуні.

Пасьля Станіслававых аповедаў Іван доўга ня мог заснуць, і адно пытаньне вярэдзіла душу: ці бяруць у мараходку двоечнікаў? Не запытаўся ён пра гэта і наступным ранкам, бо наступным ранкам была нядзеля і Станіслаў адразу пасьля сьняданку некуды зьнік, а калі вярнуўся, дык у палаце ўжо спалі, і толькі бяссонны Адстаўнік, ды ён, Іван, бачылі, як «кароль мараходкі» лез у адчыненае вакно і вокраччу дабіраўся да ложка. А ў панядзелак у палату ўвайшоў галоўурач і загадаў Станіславу зьбіраць рэчы.

- Учора ў чарзе па віно разам стаялі, - патлумачыў «кароль мараходкі», калі за ўрачом зачыніліся дзьверы, і, накінуўшы на плечы марскі бушлат, які прыхоўваў у тумбачцы, працягнуў Івану шырокую пяцярню.

- Трымай краба, дэсантнік, - прамовіў Станіслаў зь ледзь прыкметнай усьмешкай, якая яшчэ раз перакanала Івана, што

дэсантура - занятак непаважны, і што толькі надзеўшы марскі бушлат, можна адчуць сябе сапраўдным чалавекам.

Праз два месяцы, апошнім днём жніўня, Ваня Бянькоў шкандыбаў па пыльнай бычкоўскай вуліцы, і ўся вясковая дзятва бегла за ім ад самага аўтобусу. Ваня прыпадаў на левую нагу, але пры гэтым ня траціў годнасьці і штохвілі адмахваўся ад матчыных спробаў падтрымаць яго за рукаво.

- Ну чаго ты адмахваешся, - пакрыўджана ўздыхала Ларыса Пятроўна, выцірала няпрошаную сьлязіну і, усхапіўшыся, дадавала: - Можа хоць цяпер за розум возьмесься?

Пераступіўшы парог роднае хаты, Іван выпіў паўлітры адтопленага малака, узяў з паліцы сшытак, сеў пры стале і запісаў у яго прозьвішчы дзевяці падшыванцаў, што гаманкой чарадою тоўпіліся ў прысенку. Такім чынам у Бычках быў створаны Клюб юных маракоў (скарочана КЮМ), і першай акцыяй клюбу была пабудова плыта на Церахоўскай сажалцы.

Два дні на сажалцы - балазе месьцілася яна непадалёку ад школы - бухалі малаткі, зумкалі пілы, і бычкоўскім настаўніцам даводзілася пасьля кожнай перамены выбягаць на двор і заганяць сваіх вучняў у клясы. А пазьней, гэта ўжо як здарылася непапраўнае і плыт перакуліўся на сярэдзіне вадаёму, давялося настаўніцам і ў ваду лезьці, ратуючы жыцьцё першаклясьніка Бадунова.

Пасьля таго выпадку бацька пацярпелага, мэханізатар Бадуноў, пад'ехаў да сажалкі на трактары, на плыт вядро саляры выліў і, паабяцаўшы адлупцаваць сына, як той ачуняе, чыркнуў запалкай. Прыгожае было відовішча: сінія прыцемкі, цёмная вада - і полымя сярод вады шугала. Іван, праўда, усяго гэтага ня бачыў: стаяў у настаўніцкай, натацыі слухаў, сучкі на падлозе разглядаў ды носам шморгаў. І маці за сьпінаю стаяла, таксама носам шморгала ды сына па патыліцы біла.

Івана потым штомесяц на настаўніцкія прачуханкі выклікалі. Ушчувалі ды дзіцячай калёніяй пужалі, а аднойчы, калі ён на школьным двары самаробную «бомбу» рвануў, і вушы накруцілі. Але затое пасьведчаньне за васьмігодку выдалі зь вялікай радасьцю. Іван нават іспытаў не здаваў. Завуч Марковіч, праўда, абуралася, патрабавала Івана на другі год пакінуць. Ды настаўніцы адно рукамі замахалі. Гэтак ім Ванька Бянькоў надакучыў.

Першыя дні маці кожнага вечару пасьведчаньне з шуфляды даставала, шэптам перачытвала, а прачытаўшы, прамаўляла:

- Можа, у рамеснае якое ўваб'ецца?

Ведала Ларыса Пятроўна, што сын яе пра нейкую мараходку трызьніць, вось і хацела выпытаць, як там, ды што, ды дзе тая мараходка знаходзіцца. Але сын маўчаў і толькі, як тая маці атэстат, штовечару з кішэні нататнік даставаў і на старонцы зь літарай «М» адрас талінскай мараходкі перачытваў. А аднойчы, акурат пад вечар, пачуў Іван, як штосьці загуло знадворку. І надта ж гэты гул яго ўсхваляваў. Надзеў ён зрэбныя штаны, прыхапіў у кішэню скібу хлеба з маслам і на вуліцу падаўся.

- Вярніся! - крыкнула маці праз фортку. - Куды ты супроць ночы пасунуў?

Але Іван матчыных слоў і не пачуў нават, бо іншымі зыкамі поўніліся ягоныя вушы, і пошум сушылкі, які далятаў з супрацьлеглага канца вёскі, здаўся яму пошумам марскога прыбою.

Цэлы месяц адрабіў Іван на зернесушылцы: разгружаў машыны са збожжам, падкідваў збожжа да шнэкаў, а таксама пілаваў з напарнікам дровы для сушыльнай печы. Працаваў звычайна ўночы, а ўдзень адсыпаўся. Даводзілася, праўда, і ўдзень працаваць, па дзьве зьмены запар. Гэта ўжо як зьменшчык на працу не выходзіў.

Зьменшчыкам у Івана быў Лёшка Мандрык. Лёшкава маці бычкоўскім клюбам загадвала ды квіткі ў кіно прадавала. Лёшка яе часьцяком падмяняў, пускаў Івана ў кіно безь білета. Вось і даводзілася Івану за тое па дзьве зьмены адпрацоўваць.

Лёшка Мандрык, да таго як на сушылку патрапіць, цэлы год у Гомелі на кінамэханіка вучыўся. Ужо зьбіраўся нібыта і «корачкі» атрымліваць, але тут неспадзеўка выйшла. Нехта там на гомельскім вакзале латок абрабаваў, а міліцыя, не разабраўшыся, Лёшку прыблытала. Ну і выгналі з вучэльні. Прынамсі, так пра гэта распавядала Лёшкава маці.

Мандрык і да Гомлі быў хлопцам фанабэрыстым, а ўжо як у горадзе пажыў ды на гарадзкіх танцах пакруціўся, дык і ўвогуле нос у неба ўваткнуў. Нават на сушылку ў белых клёшах заяўляўся. Іван на клёшы (трыццаць сантымэтраў на доле, пояс чорным аксамітам аблямаваны) глядзеў з робленай абыякавасьцю. «Нічога, - думаў ён, краем вока на аксамітны пояс пазіраючы, - уладкуюся ў Таліне, пашыю сабе яшчэ шырэйшыя». І калі Лёшка не бяз гонару ў голасе паведаміў аднойчы, што пашыўка мадняцкіх штаноў трыццаць рублёў каштуе, Іван як бы між іншым зазначыў:

- У мараходцы клёшы дармавыя выдаюць.

Пад час размовы яны якраз дровы пілавалі. Лёшка як пра мараходку пачуў, дык нават з твару зьмяніўся і палец пілою параніў. Пабег дадому палец перабінтоўваць, а вярнуўся толькі пад вечар, з пляшкай «Араматызаванага» ў кішэні. Выпілі яны, закусілі кіслымі яблыкамі і па руках ударылі. Вырашылі разам у мараходку паступаць.

І вось прысьпеў дзень, калі Іван, у калгаснай касе пяцьдзесят рублёў атрымаўшы, прыйшоў дахаты, залез пад ложак і выцягнуў адтуль запыленую валізу - тую, што дзядзька Коля пакінуў.

- У Талін еду. У мараходную вучэльню. Разам зь Лёшкам Мандрыкам, - адказаў Іван на запытальны матчын позірк. І Ларыса Пятроўна, якая ня надта добра ўяўляла, дзе той Талін, але затое добра ведала, хто такі Лёшка Мандрык, з усхліпам прамовіла:

- У Латвію... да літоўцаў... з фулюганам гэтым...

Нездарма ўсхліпвала Ларыса Пятроўна, нядобра пра Лёшку Мандрыка згадваючы. Адчувала матчына сэрца, што ўсё гэта дрэнна скончыцца. Так яно, урэшце рэшт, і сталася. Толькі да Віцебску і даехалі Іван зь Лёшкам. У Віцебску трэба было на рыскі цягнік перасаджвацца, а хадзіў цягнік раз на содні. Цэлую ноч сябрукі на вакзале кантаваліся, мулкія лавы праклінаючы, а на золку прапанаваў Лёшка Івану на вулку выйсьці. Выйшлі яны на вулку, дыхнулі начной прахалоды, Лёшка грошы свае пералічыў і ці-іха так прамовіў:

- Я тут адзін шапік прыгледзеў. Пайшлі, пастаіш на шухеры.

У Івана ад такіх слоў калені затрэсьліся і сэрца ў лядзяк ператварылася, але выгляду не падаў - пасунуўся на кісельных нагах за кампаньёнам, перапужанымі вачыма на Лёшкаву сьпіну пазіраючы.

Кампаньён між тым выйшаў на справу не з пустымі рукамі. Былі ў яго адпаведныя прычандалы: ліпучкі гумовыя, што да шыбаў ліплі, і шкларэз з алмазам. З дапамогай тых прычандалаў Лёшка і ўлез у шапік. Выцягнуў адтуль жмутак пажоўклых газэт, трыццаць капеек грошай і тузін наліўных аўтаручак, пры гэтым шыю парэзаўшы і кашулю ў кроў перапэцкаўшы.

Вылаяліся кампаньёны з такога прыбытку, разапхалі самапіскі па кішэнях і ў пачакальню вярнуліся. Праспалі да раніцы, а раніцою Лёшка на пэрон выйшаў, узяўся асадкі прадаваць - бракавала яму грошай да Таліну даехаць. Тут да

яго міліцыя і прыгледзелася. Ды і як было не прыгледзецца: на дварэ сёмая гадзіна раніцы, а па пэроне скрываўлены хлопец ходзіць, самапіскі з рук прадае. Давялося Лёшку ў міліцэйскі пакой прайсьці, а неўзабаве туды і Йвана даставілі.

Цэлы тыдзень ў каталажцы адседзелі. Лёшка на допыце ўсю віну на Івана зваліў, маўляў, гэта ён, Іван Бянькоў, у шапік залез. Толькі дзядзька ў цывільным, які дазнаньне праводзіў, таму веры ня даў. Нагадаў Лёшку ягоныя гомельскія штукі і справу пракурору накіраваў. Увосень Лёшку судзілі, а Івана, як саўдзельніка, міліцыя ў Баранавічы накіравала - на фрэзэроўшчыка вучыцца. І вось цёплым летнім адвячоркам, адвучыўшыся год у ПТВ, Іван Бянькоў ехаў дахаты і ў прадчуваньні блізкай сустрэчы з домам шчасна пасьміхаўся спрасонку.

- Ну куды?! Куды... вашу маць! - крыкнуў кіроўца, і Йван канчаткова абудзіўся. Шафёр дадаў рухавіку абаротаў, аўтобус скрануўся зь месца, праехаў мэтраў пяць і зноў супыніўся.

- Што, шэф, баісься, каб скаты не згарэлі? - грымнулі ад задніх дзьвярэй мужчыны, і Авадзіха, гідліва павёўшы носам, прашаптала:

- Апівуды няшчасныя!

Пасажыры адзін за адным пачалі выходзіць з аўтобуса, і Йван, якому таксама карцела выйсьці, з прагнасьцю паглядзеў на прыдарожныя кусты.

- Што, Ванька, выспаўся? - запыталася ў Івана цётка Авадзіха.

- Выспаўся, - азваўся той і глыбока ўздыхнуў.

- Саступіў бы месца дзяўчыне, а то зусім гаротніцу заціснулі, - прамовіла Авадзіха і, счакаўшы, дадала: - П'яніцы гэтыя.

Бялявая дзяўчына, якую Іван бачыў на аўтобусным прыпынку, стаяла ўсутыч да цёткі, трымаючы на сваіх плячах дарэшты ахмялелыя галовы.

- Чуеш, Ванька? - цётчын локаць тыцнуў пляменьніка пад бок.

- Ды чую, чую, - незадаволена буркнуў пляменьнік, пералез цераз мяхі з камбікормам і, разьмінаючыся зь дзяўчынай, дакрануўся носам да яе пахкіх кудзерак.

Ад парфумнага паху ў Івана закружылася галава. Ён замружыўся, увабраў у сябе паветра і нечакана з агідаю вякнуў. Гэта мэханізатар Бадуноў, паклаўшы на Іванаў плячук сваю сівую галаву, дыхнуў у твар густым смуродам часныку, гарэлкі і гаруча-змазачных матэрыялаў. Іван тузануў плечуком, галава мэханізатара хітнулася, папаўзла долу і празь імгненьне знайшла сабе прытулак, заклініўшыся між пульхнатых грудзей калгаснай бухгальтаркі Крыштаповіч.

Аўтобус натужна загуў на пад'ёме. Правёўшы сумным позіркам кілямэтровы слуп, які павольна праплыў за вакном, Іван яшчэ больш скурчыўся, і абражаны нюх ягоны зноў адчуў п'янкі парфумны пах: дзявочыя валасы, бязважкія, нібыта аблачынка, панадна сьвяціліся на сонцы. Адна валасінка нават казытнула яму ў носе, і, каб ня чхнуць у такі нязручны момант, ён адвёў нос убок і зь цікаўнасьцю скасіўся на дзявочыя калені. Дзяўчына, відаць, адчула гэты позірк, бо ў наступнае імгненьне калені дзявочыя стуліліся і таропкія пальчыкі пацягнулі долу паркалёвую сукенку.

- Дапаможаш мяхі несьці, - гукнула, як заўсёды ня ў час, цётка Авадзіха, і Йван пасьля такіх слоў густа пачырванеў. Адсунуўшыся на колькі магчама ад бялявай дзяўчыны, ён пацёр твар далоньню і ўжо без ранейшай апантанасьці стаў глядзець у вакно. Аўтобус зьбягаў з гары, за вакном зацятай чарадой ляцелі кусты і дрэвы, а па шкле паўзла, час ад часу шаруючы лапкамі празрыстыя крылцы, маленькая шэрая

мушка. Каб не глядзець на дзявочыя калені, Іван зачапіўся вачыма за мушку, але тая, паблукаўшы па шкле, зьнікла зь відавоку.

Аўтобус між тым пад'яжджаў да гатаўскай паваroткі. Гатаўцы, жыхары суседняй з Бычкамі вёскі, паўскоквалі зь месцаў, уголас загаманілі, і над Іванавай галавой праплылі да дзьвярэй ганарысты гусак у кашы і віскліві парсюк у торбе.

- Маша, выходзім! - прагучала сярод людзкой гаманы, і па тым, зь якой заклапочанасьцю бялявая дзяўчына страсянула кудзеркамі, Іван зразумеў, што паклікалі яе. Гатаўскія цёткі, узьняўшы над галовамі хатулі і пакункі, рушылі да выхаду. Прапусьціўшы наперад дзяўчыну, Іван выхапіў з-пад ног сваю пашарпаную валізу, выпрастаўся на поўны рост, і цётка схапіла яго за руку.

- Ванька, куды ты? Дапаможаш мяхі несьці! - рэкнула Авадзіха, ды нябож высьлізнуў зь цётчыных шчымётаў, налёг на сьпіну бухгальтаркі Крыштаповіч, і тая пацягнула яго па салёне, кленучы цісканіну, п'янюгу Бадунова, які засьлініў ёй выхадную кофту, і ўсё сваё непрыглядное ўдовінае жыцьцё.

Уздоўж бальшака шчытнай сьцяною стаяў перасохлы алешнік. Ён суха трашчаў пад нагамі, шамрэў каляным лісьцем, а патрапіўшы за каршэнь, непрыемна казытаў узмакрэлую шыю. Адсюль, з пагорку, зарасьнікі ссохлай вольхі здаваліся адным бязьмежным морам, сярод якога пукатымі выспамі паўставалі чорныя плямы выжарын.

Калісьці тут, на гэтым пагорку, стаяла вёска Гатава. Яшчэ й дасюль можна было ўбачыць сярод дзікатраўя ланцугі заімшэлых валуноў і аскепкі зьзелянелай цэглы. Вёску немцы спалілі за два тыдні да падыходу Чырвонай Арміі. Ужо і савецкія самалёты над галовамі лёталі, і кананада чуваць была, ды не ўратаваліся гатаўцы. Партызаны з брыгады «Няўмольныя» ля пераезду дывэрсію ўчынілі: пусьцілі пад адхон дрызіну з капою саломы. Немцы пасьля таго і

вызьвeрыліся. Уварваліся ў вёску на матацыклах, людзей у кучу пазганялі, а хаты падпалілі. Добра яшчэ, што хоць не стралялі. Адно патрымалі з паўгадзіны, карабіны на баб наставіўшы, пагергеталі па-свойму дый паехалі ўпрочкі. Не было ў немцаў часу стралянінай займацца.

Адразу па вайне гатаўцы ў зямлянках жылі, якія яшчэ партызаны павыкопвалі. Ладныя былі зямлянкі: сухія, двухнакатныя і, галоўнае, непадалёк ад роднага папялішча. Жанкі на папялішча кожны дзень хадзілі - ежу ў печах гатавалі ды на гародчыках поркаліся. Тамака ж, на месцы партызанскай базы, і адбудоўвацца пачалі. Сёньня ў Гатаве дваццаць пяць гаспадароў засталося. Астатнія разьбегліся па белым сьвеце. Хто ў Ленінград зьехаў, хто на лесапавал завэрбаваўся, а большасьць на цаліну падалася, абложную зямлю асвойваць.

І зарасьлі гатаўскія пагоркі палыном ды алешнікам.

А пару месяцаў таму, перад майскімі сьвятамі, над гэтымі мясьцінамі генэрал Карзо пралятаў. Той самы Карзо, які ў вайну «Няўмольнымі» камандаваў. Генэрала перад тым у Вярхоўны Савет абралі, вось ён і паляцеў на вайсковым вэрталёце сваю акругу агледзець. Пабачыў былы партызан, што зямліца, за якую ён кроў праліваў, пустазельлем пазарастала, і нават мацюкнуўся ад абурэньня. А неўзабаве ў небе над Гатавым самалёт зьявіўся. Кукурузьнік сельгасавіяцыі. Цэлы дзень лётаў ды нейкую халеру сыпаў. Ад той халеры зь яблынь квецень асыпалася, камары ды мухі зьвяліся, а ў бухгальтаркі Крыштаповіч сабака акалеў, дохлымі мышамі аб'еўшыся. Але затое і алешнік лясну ўся. Ссох увесь дарэшты - аніводнага зялёнага лісьціка не засталося.

У гэтыя ссохлыя нетры і занурыўся Іван і добрую хвіліну стаяў там у нерухомасьці, скіраваўшы напорлівы струмок на куст перасохлай брызгліны. Высока ў небе сьпявалі птушкі,

выў пад гарою аўтобус, шапацела пад напорлівым струмком сухое лісьце, а душа поўнілася спакоем і развагаю. Але новыя зыкі, што нарадзіліся за сьпінаю, прымусілі схамянуцца і таропка зашпіліць нагавіцы. Там, за сьпінаю, затрашчала ламачча, пачуўся дзявочы голас:

- Куды ты пабег, нягоднік? - і Йван, якому зусім не выпадала сустракацца зь дзяўчынаю ў такім нязручным месцы, сьпехам прыхаваўся за куст.

Дзяўчына бегла, спрытна пераскокваючы праз лаўжы, і, відаць, так і не заўважыла б Івана, калі б сам ён не заварушыўся ў кустах, зьбіваючы з лобу пякучых лясных мурашоў.

- А-а... гэта вы... - пралепятала прыгажуня, згледзеўшы скурчаную Іванаву постаць, сарамліва адвяла вочы, пабегла, чапляючыся караценькай спадніцай за альховыя галіны, а Іван, вылезшы з мурашніку, шчыра пашкадаваў, што ня можа праваліцца скрозь зямлю, ратуючыся ад ганьбы.

Ён выцягнуў з кустоў валізу, страсянуў, спраўджваючы, ці не пабіліся купленыя ў Віцебску чатыры пляшкі віна, і ў той самы міг адчуў, як штосьці цёплае і мяккае кранулася пяткі. Гэта кот Маркіз, наставіўшы хвост дудой, цёрся пысай аб ягоны чаравік, прымусіўшы Івана спачатку пудліва падскочыць, потым аддзьмуцца і, нарэшце, падхапіць ката пад пахі і зь вясёлым адчаем рушыць на дарогу.

Дзіўныя рэчы чыніліся з Іванам. Дагэтуль ён аббягаў дзяўчын за кілямэтар, а тут выйшаў на прасёлак, прычакаў, калі прыгажуня выйдзе з кустоў, і, не зьміргнуўшы вокам, уручыў ёй вуркатлівага ўлюбёнца.

Дзяўчына ўзяла ката, кіўком галавы падзякавала Івану, а хлопец, якому праглася новых подзьвігаў, скіраваў хаду да таўшчэзнай сумкі, што стаяла пры дарозе.

- Ой, што вы... Зараз дзядзька Коля прыедзе... Мама з жанчынамі на вёску пайшла... - пралепятала дзяўчына, але Іван быў няўмольным.

Ён падышоў да сумкі, ухапіўся за ручкі і, адарваўшы сумку ад зямлі, пашкадаваў аб сваім учынку. Сумка, якую ён наважыўся паднесьці, важыла ня меней, як два пуды.

- А вы што... у Гатаве жывяце? - запыталася дзяўчына, калі Іван, хістаючыся і керхаючы, зрабіў колькі крокаў.

Крыўднейшае пытаньне цяжка было і прыдумаць. Іван панурыў вочы, выпусьціў з рук сваю пашарпаную валізу, потым сумку і з рашучасьцю ў голасе выдыхнуў:

- У Баранавічах, Берасьцейскай вобласьці. - Пасьля чаго абабіў нагавіцы і акрыялым голасам дадаў: - Хутка вобласьць да нас перанясуць. Берасьце да мяжы блізка.

Ён хацеў яшчэ сказаць, што ў Баранавічах хутка пусьцяць тралейбус, але дзяўчына войкнула і паказала пальцам на валізу. У паветры запахла сьпіртным, а жоўты пясок пад валізаю набрыняў чырвоным вінам.

- Усё з-за мяне, - прамовіла дзяўчына, азірнулася і голас ейны набыў адценьне адчаю: - Зьбег, зьбег, нягоднік.

Іван схамянуўся, кінуўся ў той бок, куды паказала дзяўчына, і доўга гойсаў там у пошуках ката, аж пакуль дзяўчына не паклікала яго радасным воклічам:

- Вярнуўся!

- Ведаеце, ён у мяне ў кватэры жыў, - паведаміла спадарожніца, калі Іван вылез з альховых нетраў, - вераб'ёў толькі праз акно бачыў, а тут... - ня скончыўшы фразы, дзяўчына змоўкла, прыслухалася і, кіўнуўшы ў бок Гатава, прамовіла: - Дзядзька Коля едзе.

Дзесьці на вёсцы ажываў, глуха чхаючы маторам, матацыкл калгаснага брыгадзіра Баркоўскага.

«Абавязкова пра шапік спытае, ці яшчэ пра якую халеру», - падумаў Іван і праз імгненьне, не разьвітаўшыся зь дзяўчынай, ужо бег па кустах, цьвелячы наваколье звонам разьбітай бутэлькі.

Вось яна, хатняя ежа. Дзьве талеркі гарачай капусты агораў, а ўдосыць не наеўся. Адкінуўшыся на прыслон кухоннага крэсла, Іван выцер далоньню тлустыя вусны, зірнуў у столь.

- Гэта ж трэба. І трусы, і майку запляміў. Паскудствам гэтам. І з парашком не адмыеш, - стоячы ля печы, маці выцягвала з валізы брудныя сынавы мэтлахі і кідала ў выварку.

- Налі яшчэ, - папрасіў Іван, адчуўшы перамену ў матчыным настроі.

Маці ўзяла талерку, выліла з чыгунка рэшткі капусты.

- Схуднеў як. У заходнікаў. Адныя вочы бліскаюць, - выдыхнула маці, усьпіраючы выварку на гарачую чарэнь.

Жыхароў Баранавічаў Ларыса Пятроўна недалюблівала і называла не іначай як «заходнікамі». І хаця самой ёй бываць у Заходняй Беларусі, а тым больш у Баранавічах, не даводзілася, пад уплывам аповедаў сваёй сястры Авадзіхі, якая езьдзіла па вайне ў Заходнюю мяняць шынялі на крупы, у яе склалася наконт «заходнікаў» пэўная думка.

- Лёшку Мандрыка з турмы выпусьцілі, - прамовіла маці, памешваючы палкай у варцы. - Па амністыі. Страшны стаў - з нажом ходзіць.

Іван адклаў лыжку, рыпнуў крэслам, засяроджана паглядзеў на ліпучку, што вісела пад столлю. Ліпучка была чорная ад мух і вагалася ад гарачага паветра, якое струменіла ад печы.

- Ты ж глядзі, зь ім не вадзіся.

- З кім? - не зразумеў Іван.

- «З кім, з кім...» Зь Лёшкам Мандрыкам, з п'янтосам гэтым, - маці так імпэтна крутнула палкай, што на чарэнь пралілася вада і хата напоўнілася злавесным сыканьнем.

- І Мандрычыха не адстае. Кожны дзень п'яная, - маці выцерла рукі, падхапіла зь цьвіка цыратавы хвартух і, мармычучы яшчэ нешта пра Мандрычыху, пайшла даіць карову.

Іван даеў трэцюю талерку і зноў утаропіўся на ліпучку. Вось ужо цэлую гадзіну ён спрабаваў узнавіць у памяці аблічча бялявай дзяўчыны, зь якою ехаў у аўтобусе, але ўяўленьне не спрацоўвала.

- Маша! - прамовіў ён нарэшце, заплюшчыўшы вочы і замест мілага дзявочага тварыка ўявіў перапэцканую крывёю фізіяномію Лёшкі Мандрыка.

- Эх, Маша, Маша, - ужо з адчаем у голасе прашаптаў Іван, устаў з-за стала і пасунуўся ў прысенак шараваць гуталінам выхадныя «коры».

Да пачатку кінасэансу заставаліся лічаныя хвіліны, а глядзельная заля была амаль пустая. Толькі на першых радах тырчэла некалькі хлапечых галоў ды колькі дзяўчынёшак сядзелі ля ўваходу, слухаючы бязглуздыя Мандрычышыны аповеды. Мандрычыха, як заўсёды, была на падпітку. На ёй быў той самы пакамечаны пільчак, на пільчаку вісела тая самая мэдалька, і вярзла яна ўсё тую ж самую нісянеціцу.

- Таварышы! Не паверыце! Такі быльнік! Такі быльнік! Вышэй галавы! - прамаўляла загадчыца клюбу, зьвяртаючыся да дзяўчынёшак. Летась Мандрычысе, як работніку культуры, давялі плян - выбраць тры соткі палеглага льну. Выбрала яна яго ці не - невядома, але пра свае пакуты і пра быльнік, які рос з ільном, яна распавядала кожнаму стрэчнаму.

Адвёўшы вочы ад амбразуры, Іван ускудлаціў непаслухмяную чупрыну, ізноў зірнуў у залю. Апрача яго ў

кінабудцы былі яшчэ трое: кінамэханік Лябёдка, які спаў на перамотачным стале, і браты Бадуновы - Пецька і Юрка. Старэйшы, Пецька, наладжваў кінапраектар, а маладзейшы, Юрка, той самы, што некалі ледзь не ўтапіўся ў сажалцы, перамотваў стужку.

- Дзе гэта ён? - запытаўся Іван, мяльком кіўнуўшы на Лябёдку.

- Карпачысе ячмень малацілі. Траян на камбайне, а ён снапы кідаў, - растлумачыў Пецька, запраўляючы стужку ў праектар. - Траян п'яны з камбайну зваліўся...

- І жняярку пагнуў, - уставіў слова Юрка, але брат незадаволена махнуў на яго рукою:

- Круці хутчэй! Яшчэ тры часткі перамотваць!

Юрка налёг на корбу, барабан загуў на высокай ноце, але нечакана гудзеньне абарвалася і стужка зь вясёлым шапаценьнем зазьмяілася па падлозе: гэта кінамэханік Лябёдка закінуў спрасоньня нагу на барабан і абарваў стужку.

- Колькі разоў казаць - адразу спыняй! - крыкнуў Пецька, а Іван, адарваўшыся ад амбразуры, параіў:

- Вы яго стрыножце, каб ня брыкаўся.

Заля між тым напаўнялася людам. Мандрычыха, адной рукой адрываючы ад пачка білеты, а другою трымаючы загаслую папяроску, віталася з кожным і п'янаватым голасам прамаўляла:

- Таварышы! Такі быльнік!

Іван пацёр намуляны аб цагліны лоб, уздыхнуў і з горыччу падумаў: «Ня прыйдзе!» Ён зірнуў на Пецьку Бадунова, і Пецька, па-свойму зразумеўшы такі позірк, завёў кінапраектар.

«Візыт савецкай партыйна-ўрадавай дэлегацыі ў Народную Рэспубліку Баўгарыю», - ударылі ў вочы зыркія тытры, Іван заплюшчыў вочы, а калі зноў расплюшчыў і ўбачыў, як Брэжнеў цалуецца зь нейкім лысым, гідліва скрывіўся і выйшаў з кінабудкі.

Надвор'е было што трэба. Павяваў цёплы ветрык, у гародах натхнёна цвыркалі конікі, а паветра поўнілася духмяным пахам скошанай канюшыны. Надвор'е шаптала: пакінь свае турботы, упадзі ў капу маладой саломы, закінь за галаў рукі і глядзі, глядзі, не адрываючы вачэй, на сьветлую вохру захаду, на зыркую Мілавіцу, на сярпок зялёнага маладзіка, каб праз шмат гадоў згадаць гэты вечар і дрыготкай рукою расьцерці па шчацэ старэчую сьлязіну.

Але Іван ня ўпаў у капу. Ды і куды было падаць, калі адзіная капешка, што стаяла наўзбоч Карпачысінага агароду, была занятая камбайнэрам Траянам. Раскінуўшы рукі, Траян скаланаў навакольле магутным храпам, і навакольныя конікі трашчалі напаўсілы, а то й зусім заміралі, калі камбайнэр чухаў нос і ўсчынаў храпці ўжо на зусім жудлівых абэртонах. «Ну і храпе», - падумаў Іван, пералез цераз тын і, прайшоўшыся па жорсткім іржышчы, выйшаў на гатаўскую дарогу. Ён і сам ня мог уцяміць, што яго прывяло сюды, на гэтую затканую туманом праселіцу, і толькі прыслухаўшыся да біцьця ўласнага сэрца, якое трапятала ў прадчуваньні сустрэчы зь дзяўчынай, зразумеў, што гэта яно, сэрца, не давала нагам спакою.

- Сьпіць з дарогі, - прамовіў ён уголас, згадаўшы, што Люську Халімонаву прывёз на матацыкле Сашка Собалеў, а другая гатаўка, Манька Цыкіна, прыехала ў клюб на вэласыпедзе.

Пасьміхнуўшыся сваім думкам, Іван пастаяў з паўгадзіны, паўздыхаў, прагна ўглядаючыся ў канец дарогі, дый пацёгся

назад у клюб, апусьціўшы голаў і з дакорам мармычучы сабе пад нос імя ленінградзкай прыгажуні.

Ён ішоў па Карпачышыным агародзе, калі суладзьдзе вечаровых зыкаў парушыў гучны строкат. Намагаючыся ўгледзець, хто гэта там едзе па прасёлку, Іван узьлез на сьцірту саломы, потым, наступіўшы на соннага Траяна, пабег да камбайну і ўжо адтуль, зь верхавіны сьлізкага ад вечаровай расы бункера, убачыў, як матацыкл скаціўся з гары, як падкаціў да клюбу, і ў кволым сьвятле адзінага на ўсю вёску вулічнага ліхтара, угледзеў знаёмую постаць.

... Пецька Бадуноў устаўляў у кінапраектар чацьвертую частку, калі дарэшты закаханы Іван уляцеў у кінабудку.

- Як назва? - запытаўся ён задыханым голасам, і Пецька, не адрываючы вачэй ад стужкі, адказаў:

- «Анёл у цюбецейцы».

У промні праектара плыў тытунёвы туман, а на экране тузін усходніх кабет бегалі адна за адной пад музыку папулярнай песьні «Ты куда, Одиссей?»

- Таварышы! Пакіньце паліць! - крыкнула зь першых радоў Мандрычыха, і новая порцыя дыму турбулентна замітусілася ў промні.

Адчуваньне таго, што Маша недзе тут, у залі, прыемным сьвербам адбівалася пад сэрцам. Іван пачухаў грудзіну, зірнуў на Юрку, які па-ранейшаму круціў корбу, рашуча падышоў да стала. Рукі Іванавы прагнулі работы. Ён адціснуў Юрку ўбок, паклаў руку на корбу і, пераможна крэкнуўшы, з шалёным натхненьнем стаў перамотваць стужку.

З адчыненых дзьвярэй вырываўся на начны прастор голас Валерыя Абадзінскага. Песьня, якую сьпяваў Валеры, называлася «Что-то случилось». Пасярэдзіне залі кружыліся пары: бібліятэкарка Забаронька з настаўніцай Кніповіч ды дзьве малалеткі з Зарэчанскай вуліцы. Астатнія дзяўчаты

сядзелі ўздоўж сьцен, зачаравана глядзелі на модныя туфлі настаўніцы і, таемна бліскаючы бялкамі вачэй, аб нечым горача шапталіся. Юрка Бадуноў быў адзіным хлопцам, які сядзеў у залі. Кружэлкі з запісамі Абадзінскага зайгралі настолькі, што сьпявак у двух месцах пачынаў заікацца, і Юрка, седзячы ля радыёлы, мусіў няўлоўным рухам перасоўваць іголку.

Хлопцы гуртаваліся на ганку. Усе яны - ад малога Толіка Манькіна да боўдзілы Ваські Бохана - зацята палілі папяросы, жартам валтузіліся і казелілі вочы на дзевак, што сядзелі з залі. Васька Бохан, двухмэтровы дурыла, які прыйшоў на танцы ў пацёхканым камбінэзоне, стаяў у дзьвярной пройме і не выпускаў дзяўчат з клюбу нават па пільнай патрэбе.

- Нінка, хто гэта табе нос падзер? - крыкнуў Васька Бохан бібліятэкарцы Забароньцы, калі Валеры Абадзінскі чарговым разам заікнуўся.

- Хто трэба, той і падзер, - азвалася бібліятэкарка і, прыкрыўшы нос рукою, пасунулася разам з настаўніцай да выхаду.

- «Ты куда-а, Алексей?» - засьпяваў Васька Бохан, блытаючы Адысея з Аляксеем, паспрабаваў ухапіць Забароньку за кофту, але тая, вырваўшыся, стукнула Бохана кулаком па хрыбціне.

Ад таго кухталя ўнутры ў Ваські штосьці бразнула, з вуснаў выпала папяросіна, і ўсе, хто стаяў на ганку, спалохана паглядзелі на небараку. Той вінавата вылаяўся, падняў з-пад ног недакурак і ў наступнае імгненьне ўжо запіхваў у залю дзьвюх малалетак з Зарэчанскай вуліцы, якія таксама хацелі выйсьці на падворак.

Седзячы на прыступках, Іван паліў папяросу, скоса зазіраў у залю і сьцішаным голасам распавядаў вясковай дзятве зьмест кінафільму «Фантамас супраць Скотлянд-ярду».

Пачуўшы бразгат у боханаўскім нутры, ён перарваў аповед, паглядзеў на Бохана, і дзятва зь нецярплівасьцю тузанула яго за рукаво:

- Ну, што далей?

Іван пачухаў патыліцу, згадваючы, што там было далей, але ў гэты момант ля могілак чхнуў матацыкл і ўсе гамузам усхапіліся на ногі. Бледнае сьвятло фары кранулася навакольных дрэваў, высьветліла бібліятэкарку Забароньку, якая, здушана войкнуўшы, зьбегла з дарогі, і неўзабаве да клюбных прыступак падкацілі на прапыленым «Каўроўцы» Юрка Гуль з Лёшкам Мандрыкам.

Юрка зь Лёшкам толькі месяц таму вярнуліся з калёніі і цяпер «абмывалі» свабоду, езьдзячы штовечару ў азярышчанскі рэстаран. У адрозьненьне ад Лёшкі, які рабаваў шапікі, Юрка патрапіў за краты, пабіўшыся на танцах з двума віцебскімі студэнтамі.

Заглушыўшы «Каўровец», Юрка першым зьлез з матацыкла, зьняў з галавы танкісцкі шлем і, выхапіўшы з рота ў Толіка Манькіна папяросу і ўпіхнуўшы ў свой, накіраваўся ў клюб.

- Ну, хто тут сёньня ёсьць? - запытаўся Юрка Гуль, стукаючы кулаком па далоні, а Лёшка Мандрык, які ішоў сьледам, спатыкнуўся на прыступках і паваліўся на ганак.

Лёшку паднялі, абабілі ад пылу нагавіцы.Увайшоўшы ў залю, Лёшка з ікаўкай у голасе запытаў:

- Гэта што там за чувіха?

У залі зноў зайграла музыка. Гэтым разам Юрка Бадуноў завёў «Ладу» - улюбёную песьню Юркі Гуля. Падпяваючы сьпеваку Мулярману, Юрка немым голасам гаркнуў: - Л-лада! - і клюбныя шыбы дробна зазьвінелі ад грукату ягоных чаравікаў.

...Усе, хто стаяў на ганку, даўно ўжо былі ў клюбе, і толькі Іван дагэтуль не рашаўся ўвайсьці, а калі нарэшце ступіў на парог, да вушэй ягоных даляцеў адчайны вокліч ленінградкі:

- Адчапіцеся, вы п'яны!

Музыка абарвалася, пачуўся зычны пляскач, і Маша, зачырванелая і ўсхваляваная, зьявілася ля дзьвярэй. На міг яна спыніла свой пагляд на Іване, пагардліва хмыкнула і ўжо нясьпешным крокам пайшла да матацыкла.

Усё гэта доўжылася імгненьне, Іван не адразу і ўцяміў, што, уласна кажучы, адбылося, добрую хвіліну глядзеў усьлед дзяўчыне, аж пакуль яго не піхнулі ў сьпіну. Штуршок быў ніштаваты, але ён устаяў на нагах, затое той, хто штурхаў, чарговым разам зачапіўся за прыступкі і ляснуўся вобзем. Матацыкл чхнуў, Лёшка Мандрык гучна вылаяўся, а Іван зачаравана паглядзеў у цемру.

- Я кароль зоны... - прамармытаў Лёшка Мандрык, калі матацыкл суціх за паваротам.

«Кароль зоны» падняўся на ногі, лізнуў садраную далонь, а ўбачыўшы перад сабой былога кампаньёна, узрадавана выгукнуў:

- Ваня, кораш!

Лёшкавыя скрываўленыя пальцы ўхапіліся за штрыфель пінжака, прабегліся па Іванавай шчацэ, і Йван, піхнуўшы былога кампаньёна ў грудзіну, са злосьцю вылаяўся.

Такое абыходжаньне засмуціла Мандрыка.

- Ты што, казёл, не пазнаеш? А можа западло лічыш, га? - правая, непараненая рука кампаньёна палезла ў кішэню шырокіх штаноў, а Іван, адчуўшы, што Лёшка палез па нож, прыязным голасам вымавіў:

- Я тут віна прывёз... прынясу зараз...

Цьмянае месячнае сьвятло высьвечвала няроўны, напалову сьцёрты надпіс: «Посторонним лицам вход воспрещён!» Надпіс гэты зрабіў некалькі гадоў таму кінамэханік Лябёдка, падкрэсьліваючы тым самым, што заходзіць у кінабудку мелі права толькі абраныя асобы. Асобы тыя цэлымі днямі сядзелі ў кінабудцы, гуляючы ў карты, п'ючы гарэлку, а Юрка Гуль зь бібліятэкаркай Забаронькай там і ночы бавілі, выкарыстоўваючы пры гэтым падзерты матрац, што ляжаў у куце.

Перакінуўшы з рукі на руку сетку з «чарнілам», Іван узяўся за ручку дзьвярэй, пацягнуў на сябе, ды нечакана замёр, прыслухоўваючыся да галасоў за дзьвярыма.

- Чувіха - я маўчу... - прамаўляў Лёшка Мандрык, штохвілі чыркаючы запалкамі.

Памаўчаўшы, Лёшка з глухім прысьвістам выпусьціў дым з роту і, мацюкнуўшыся, працягваў:

- Я да яе падыходжу... кладу руку на калена... а яна не варушыцца...

Пасьля гэтых слоў рыпнула крэсла, і кінамэханік Лябёдка сіпла і недаверліва выдыхнуў:

- Ідзі ты!

- Бля буду... - азваўся Лёшка і зноўку чыркнуў запалкай. - Вяду, значыцца, вышэй і раптам чую - у яе панчохі на падвязках.

- Гы-гы-гы, - гамзата рыкнуў Лябёдка й захоплена запытаўся: - А яна?

- Не варушыцца! - гаркнуў апавядальнік. І Йван, усутыч наблізіўшыся да дзьвярэй, з трывогай падумаў: «Пра каго гэта ён?» Пад нагой рыпнула дошка, ён застыў на месцы, а Лёшка Мандрык, з шумам выпусьціўшы дым, прамовіў:

- Калі ўжо гэты фраер прыйдзе?

Кроў хваляй прыліла да твару. Іван пастаяў хвілю, узважваючы Лёшкавы словы, патупаў дзеля прыліку, нясьмела ўвайшоў у кінабудку.

Пілі ўтрох - Іван, Лёшка і кінамэханік Лябёдка, які тым часам ужо праспаўся і прагнуў пахмяліцца. Чакалі яшчэ Юрку Гуля, ды той не прыйшоў - цягаўся, відаць, недзе зь Нінкай Забаронькай.

Лёшку разьвезла пасьля першай шклянкі - балазе ён ужо быў добра падпіты. Вочы Лёшкавы ашклянелі, зь ніжняй губы зьвісла празрыстая нітка сьліны, а галава пачала сутаргава торгацца ў розныя бакі. Такі несамавіты Лёшкаў выгляд надаў Івану сьмеласьці, і ён, як бы між іншым, запытаўся ў былога кампаньёна, навошта той чапляўся да гарадзкой дзяўчыны. У адказ Лёшка ўзьняў на Івана ашклянелыя вочы, з працяглымі паўзамі выдыхнуў:

- Ты што... мяне... за казла лічыш?

Жылаватая Лёшкава рука балюча сьціснула запясьце, і Івану не заставалася нічога іншага, як схапіцца за пляшку. Булькаценьне віна як быццам ацьвярэзіла кампаньёна. Ён утаропіўся на мутны струмень, яшчэ раз згадаў казла, але гэтым разам без усялякае злосьці, і прагнай рукою пацягнуўся па шклянку.

«Кароль зоны» ўжо адпачываў, паклаўшы галаў на край перамотачнага стала, калі ў дзьверы загрукалі і знадворку пачуўся зычны лямант Мандрычыхі:

- Лёша, ты тут?

- Ту-ут ён, - азваўся Лябёдка, дапіў «чарніла» і пад роспачны грукат і лямант знадворку пайшоў адчыняць.

- Гэта ты, паразіціна, яго напаіў? - рэкнула Мандрычыха ў Лябёдкавы твар, а згледзеўшы Івана, зьмяніла тон і злавесна прасіпела: - Прыехаў! Ізноў будзеш Лёшу са сьвету зжываць?! - ускінуўшы на карак абмяклую сынаву руку, Мандрычыха

напялася, з вохканьнем пацягнула Лёшку да выхаду, пры гэтым з нагі сынавай зваліўся чаравік, а з кішэні штаноў выпаў, гучна бразнуўшыся аб падлогу, бліскучы ножык.

- З нажом ходзіць, - буркнуў Лябёдка, калі маці з сынам выкуліліся на падворак.

Гаспадар кінабудкі падняў ножык, паклаў на стол, потым, падумаўшы, падхапіў згублены Лёшкам чаравік і, разнасьцежыўшы дзьверы, шпурнуў яго ў цёмнае неба.

- Лорка! Твая карова за быком пабегла! - крыкнулі на другім канцы вуліцы, і Йван абудзіўся.

Знадворку зарыпеў калаўрот, у калодзеж з глухім плёскатам палілася вада, а маці, бухнуўшы вядром аб край бэтоннай цымбравіны, голасна запытала:

- Міронаўна, ці ёсьць што ў краме?

- Крупы даюць! Па тры кілё на рукі, - адгукнулася суседка Міронаўна, і Йван салодка пацягнуўся.

Тут, на гары роднай хаты, нават сны сьніліся не такія, як у інтэрнаце. Сьнілася штосьці прыемнае, да болю шчымлівае... Іван напружыў памяць, сьцяў павекі, але згадаць мінулы сон яму так і не давялося: на доле бразнула вядро і пачуўся ўсхваляваны матчын голас:

- Ванька, сьпіш?

Сплю! - адказаў Іван і незадаволена кульнуўся на бок.

- Уставай, вяпрук. У краме крупы даюць... Возьмеш тры кілё. А я пабегла карову пераймаць.

Іван пазяхнуў, споўз з капы сьвежага сена (маці ўсьперла на гару першы ўкос канюшыны), штурхануў паддашкавыя дзьверцы.

«Колькі гэта часу?» - падумаў Іван, прыслухоўваючыся да матчыных крокаў, а згледзеўшы сярод бульбоўніку рухавы

хвост ката Барыса, зразумеў, што блізіўся час абеду. Кот Барыс заўсёды прыходзіў дахаты разам з кароваю, каб выпіць сподак малака. Зьлезшы з гарышча, Іван зайшоў за хлеў, потым доўга і бязмэтна блукаў па двары, аж пакуль ня ўбачыў на ганку хаты падзертую сумку. «Крупы!» - згадаў ён нарэшце і, закінуўшы сумку за сьпіну, рушыў у краму.

Бычкоўская крама ламілася ад народу. Апрача круп давалі яшчэ і «Трайны» адэкалён. Пазалетась адэкалён на вёсцы ўжываў толькі алькаш Гарашчэня, на якога глядзелі як на вар'ята, але, пачынаючы ад мінулага году, сьпіртное пад час уборкі ў краму не завозілі, і мясцовыя п'янчугі пераключыліся на адэкалён.

- Траян! Куды точысься?! - грымелі ля прылаўка жаночыя галасы. - У мяне штучны тавар! - адказваў Траян і Йван, паслухаўшы людзкую гаману, заняў чаргу і выкуліўся з крамы. Трэба было недзе змарнаваць час. Можна было, вядома, пайсьці ў кінабудку, паслухаць кружэлкі, але на слупе, што стаяў ля клюбу, наддзіраўся гучнагаварыльнік - адзнака таго, што ў клюбе сядзела Мандрычыха, а з Мандрычыхай яму сустракацца не хацелася.

Па радыё перадавалі нейкую гутарку. Мужчынскія і жаночыя галасы захоплена распавядалі аб роскваце калгаснага жыцьця, і Іван міжволі прыслухаўся.

- Гарантаваная аплата ў калгасах крута зьмяніла жыцьцё сяльчан, - урачыста барытоніў мужчына.

- Сяльчане ідуць у магазіны, каб набыць тавары працяглага карыстаньня, - падтакваў мужчынскаму голасу жаночы.

- Во, курва, толькі тры штукі дала, - гукаў за Іванавай сьпінай мэханізатар Траян, які таксама выйшаў з крамы. - Скончыўся, кажа... А сама дзьве ўпакоўкі ў падсобцы хавае, - мэханізатар расьпіхаў па кішэнях «Трайны» і, зірнуўшы на Йвана, запытаўся: - Ты, Ванька, дзе зараз?

- У Баранавічах, - адказаў Іван, пазіраючы ў бок гатаўскай праселіцы.

- А-а... Баранавічы... Ведаю. У войску на губе там сядзеў, - згадаўшы пра войска, Траян неяк адразу абмяк, пасуравеў і, памацаўшы ў кішэнях справунак, пасунуўся да камбайну, што стаяў на Карпачышыным агародзе.

Цёткі адна за адной выкульваліся з крамы, цiснучы да друзлых грудзей буханкі хлеба і торбы з драблёнай груцай.

- Во як! Летась па пяць кілё давалі, а сёлета толькі тры, - уголас бедавалі жанкі. - І што ўжо будзем курам сыпаць?

Іван сядзеў на скрыні з-пад гаспадарчага мыла, слухаў жаночыя жальбы, і на вуснах ягоных ліпела гіранічная ўсьмешка. «Ну і жывуць людзі. Круп і тых няма. У Баранавічах гэтай груцы хоць заваліся, а тут...» - перапыняючы ўласныя думкі, ён падхапіўся на ногі, зрабіў пару крокаў да крамы і зьнерухомеў на месцы.

На ганку стаяла *яна*... На ёй былі чорныя шорты, квяцістая кашулька, і ў руцэ яна трымала торбачку з крупамі.

«Як жа я ее не прыкмеціў?» - пасьпеў падумаць Іван перад тым, як мазгі ягоныя канчаткова расплавіліся.

Заўважыўшы знаёмца, дзяўчына адкінула з твару кудзеркі, з гульлівым дакорам прамовіла:

- Што ж вы... Я прыехала, думала з вамі пагаманіць, а вы і ў клюб не зайшлі...

«Я заходзіў», - хацеў сказаць Іван, але язык ягоны заняло ад хваляваньня, і замест гэтых слоў дзяўчына пачула няўцямнае мармытаньне.

- Дзіўны вы нейкі... - прамовіла ленінградка і, перакідваючы з адной рукі на другую торбачку з груцай, пайшла да матацыкла.

- Ну што ты стаіш, скажы хоць што-небудзь! - прашаптаў нутраны голас, і Іван, прытрымліваючы рукой дрыготкую сківіцу, ікліва працадзіў:

- А дзе вы... йік... навучыліся...йік... на матацыкле езьдзіць?

Крамныя дзьверы аглушальна рыпнулі і яшчэ адна група вясковых цётак выйшла зь сельмагу.

- Мікола ж захварэў, дык мяне пляменьніца прывезла. Гойсае на матацыкле - аййо!

Голас брыгадзіравай жонкі, цёткі Грыпіны, прымушаў да дзеі. Іван глынуў паветра, спалохана выдыхнуў:

- Вы сёньня на танцы прыедзеце?

- На танцы? - дзяўчына прыўзьняла брыво, крутнула ключ запальваньня. - Я б прыехала, ды ў вас сябры хамаватыя... Шмат сабе дазваляюць.

- Больш не дазволяць! А дазволяць - павырубаю! - выпаліў Іван і, ратуючыся ад суворага позірку цёткі Грыпіны, кінуўся ў крамы.

Загарэлая Лёшкава рука кладзецца на дзявочае калена, паўзе ўгору, дапаўзае да чорных шортаў. Дзяўчына адбіваецца, малітоўна глядзіць на Івана. Ён ідзе да Лёшкі, хапае таго за руку, няўлоўным рухам выкручвае запясьце і, калі Лёшка падае на калені, б'е яго рабром далоні па патыліцы - дакладна так, як рабіў гэта польскі выведнік у пабачаным нядаўна кінафільме. Дзяўчына ўскрыквае, кідаецца яму на шыю, прыціскаецца гарачымі вуснамі, а ў вуха яму, разганяючы шчасьлівыя крозы, тыцкаецца сьцябло канюшыны. Іван пераварочваецца, глядзіць на дзірку ў вільчаку, і галава ягоная ізноў поўніцца невясёлымі думкамі. «Як яго вырубіш, гэтага Лёшку, калі ён на два гады старэйшы і ножык у кішэні носіць? - думаў Іван, неадрыўна пазіраючы на дзірку. - Пырне пад бок - зьбірай тады кішкі з падлогі». Іван уявіў, як ён упадзе з распоратым чэравам, і адбіткі сьвятлявай

дзіркі ліхаманкава заскакалі ўваччу. Вочы памутнелі, напоўніліся сьлязамі, але празь імгненьне зноўку бліснулі, і Іван з такою рашучасьцю падхапіўся на ногі, што на момант згубіў арыенціроўку і ляснуўся галавою аб крокву. Гарышча здрыганулася, увушшу бухнулі званы, і матчын голас, які прагучаў знадворку, дарэшты патануў у замарачным звоне.

- Ванька, чуеш? Пасячы крапіву сьвіньням! - крыкнула маці, а Іван, перакрывіўшыся ад болю і памацаўшы пабітую макаўку, пачаў шнарыць па кішэнях у пошуку грошай.

Ня сёньня сказана: усё геніяльнае надзіва проста. І сапраўды, ці варта лезьці ў бойку, падбіраць вантробы з падлогі, калі можна папросту падпаіць «караля зоны» і пакласьці дзе-небудзь пад плотам. Ды і віна шмат ня трэба - ад пляшкі валіцца. Толькі ж дзе яе ўзяць, гэтую пляшку? У Бычках ні віна, ні гарэлкі ўжо другі месяц ня бачылі. Адно каньяк «КВ» прадаюць. Пятнаццаць рублёў бутэлька. Летась Гарашчэня браў пляшку, ад пахмельля ратуючыся, дык казаў - піць няможна, поскудзь такая і сьмярдзіць клапамі. Адзінае, дзе можна было разжыцца пляшкай, гэта ў магазыншчыцы. У Пракопаўны - а жыла яна ў Гатаве - у хаце заўсёды віно было. І Іван, пастукаўшы секачом у карыце, падаўся са двара.

Муж магазыншчыцы, дзядзька Хвядос, на шчасьце, быў дома. Дзьверы хаты стаялі прачыненыя, у хаце працаваў тэлевізар і чуўся вясёлы дзядзькаў рогат: паказвалі, відаць, нейкую камэдыю. Іван пастаяў на парозе, крадком увайшоў у прысенак, пастукаў косткамі пальцаў па дзьвярным вушаку. У хаце нешта грукнула, тэлевізар суціх, і наструненую цішу працяў незадаволены воклік:

- Гарашчэня! Па-добраму кажу: ідзі дахаты. А то ж у мяне рука цяжкая. Піхну - і разваліськя, - дзядзька Хвядос мацюкнуўся на астачу і тэлевізар зноў ажыў, скалануўшы хату шалёнымі воплескамі.

Гаспадар хаця і рагатаў, але быў не ў гуморы. «Абрыдзеў, відаць, Гарашчэня, вось і ўсхадзіўся», - Іван уздыхнуў, пачухаў азадак і зьбіраўся ўжо сысьці з прысенку, як раптам дзьверы разнасьцежыліся і перад вачыма паўстала магутная постаць дзядзькі Хвядоса.

- Хто тут? Ты, Ванька? - гаспадар выйшаў у прысенак, зачыніў уваходныя дзьверы на ключ, лёгкім штуршком запрасіў Івана заходзіць.

- Алькаш гэты не дае жыцьця. Стаў яму пахмяліцца, і ўсё тут... - дзядзька Хвядос запіхнуў у штаны трыкатажную майку, і вытатуіраваная русалка на ягонай руцэ махнула Івану шырокім хвастом. - Ну, калі прыехаў?

- Учора, - госьць шморгнуў носам, хацеў уздыхнуць, тлумачачы тым самым прычыну прыходу, але гаспадар зразумеў усё і без уздыхаў.

- Што, бутэлька трэба?

- Трэба! - з клёкатам у горле адказаў Іван і, стаіўшы дых, пачуў, як пад нагамі дзядзькі Хвядоса зарыпелі масьніцы.

Дзядзька сышоў у прысенак, доўга бразгаў там нейкім жалезьзем, суцішна мацюкаўся і неўзабаве ўвайшоў у сьвятліцу з пляшкай «вэрмуту» ў левай руцэ і касмылём павуціньня па правым вуху.

- На вось, бяры. Глядзі толькі, каб Гарашчэня ня ўбачыў, - згадаўшы Гарашчэню, гаспадар хаты мацюкнуўся, скоса зірнуў у вакно. - Са сьвету зжывае. Дай пахмяліцца, і ўсё...

- Ня ўбачыць! - ужо ад парога азваўся Іван, вылецеў на двор, і, азірнуўшыся на хату Баркоўскіх, рынуўся гародамі, прыстасоўваючы бег да мернага булькаценьня віна ў бутэльцы.

Таго вечару Лябёдка круціў фільм з інтрыгуючай назваю «Памылка Анарэ дэ Бальзака». Ратуючы касавы плян,

кінамэханік пусьціў чутку, што ў фільме пакажуць голую бабу, і народу ў клюб набілася як завязаць. Асабліва шмат прыйшло дзятвы. Тыя падшыванцы, што мелі грошы, сядзелі ў залі, астатнія таўкліся на ганку, просячы Мандрычыху пусьціць іх безь білетаў.

- Сёньня не магу. Даўгалёў з праверкай едзе, - казала Мандрычыха, і бычкоўская дзятва, пачуўшы прозьвішча дырэктара раённай кінасеткі, асуджана апускала галовы.

Стоячы разам з падшыванцамі на ганку, Іван прыкметна хваляваўся. Лёшка Мандрык хаця і быў на падпітку, але на нагах трымаўся цьвёрда, і гэта не магло не хваляваць. «Ці хопіць бутэлькі?» - думаў Іван, прыслухоўваючыся да бязладнай Лёшкавай гамонкі. Абкружаны малалеткамі, Лёшка распавядаў ім пра бойкі ў азярышчанскім рэстаране. Доўгія чвэрць гадзіны Іван уважліва слухаў гэтыя аповеды, з насьцярогаю пасьміхаўся, а калі Лёшка, паказваючы, як ён вырубіў нагой азярышчанскага фраера, не ўтрымаўся на нагах і ляснуўся вобзем, з упэўненасьцю ў голасе прашаптаў:

- Хопіць!

На пачатку фільма стужка рвалася ледзь ня кожную хвіліну. Пад час замінак ў залі ўключалі сьвятло, і Іван уціскваў голаў у адтуліну, спрабуючы ўгледзець Машу. Маша сядзела ля сьценкі, і праз амбразуру можна было ўбачыць ейную руку ды абцягнутыя вэльвэтавымі штанамі калені. Гэтыя калені не давалі Івану спакою. Ён круціў галавой у цеснай нішы, пускаў сьліну на падбародзьдзе, а калі Лябёдка зь Пецькам запускалі праектар, стагнаў і пакутліва моршчыўся.

- Лябёдка, адпусьці тормаз! - крыкнулі з залі пад час чарговага парыву.

Лябёдка прыпаў да амбразуры, спрабуючы разгледзець, хто гэта там такі разумны, і ў гэты момант у лоб яму заехалі яблычным агрызкам. Другі агрызак праляцеў ля Іванавага

вуха, і кінамэханік, перакрываючы гамэрню, гойкнуў у адтуліну:

- Чаго ўсхадзіліся?! Фільм трэцяй катэгорыі!

Гледачы былі абражаныя: замест францускага фільму пра мушкетэраў ім круцілі нейкую лухту. У залі сьвісталі, тупалі нагамі, а той-сёй з гледачоў, уголас шкадуючы змарнаваных грошай, сунуўся да выхаду.

«Час!» - мільганула ў Іванавай галаве, і ён, адарваўшыся ад адтуліны, крадком сышоў з кінабудкі. У цемры глядзельнай залі ён міжволі зірнуў у той бок, дзе сядзела Маша, потым - на таўстуна, якога паказвалі на экране, і, набраўшы ў грудзіну паветра, прашаптаў:

- Лёха!

- Навошта ён табе?! - азвалася зь цемры Мандрычыха. - Зноў піць будзеце?

- Будзем! - пачулася ад задніх радоў, і кудлатая Лёшкава галава чорным ценем праплыла па экране.

Зьдзіраючы зубамі мэталёвую галоўку, Лёшка парэзаў сабе губу, але пры гэтым нават не паморшчыўся і прагна глынуў замяшанае на ўласнай крыві «чарніла». Дакладней, нават не глынуў: віно папросту лілося ў ягоную глотку, і коўцік пры гэтым не варушыўся. Падзівіўшыся такому штукарству, Іван пераняў бутэльку, але піць ня стаў - ашчаджаў пітво для сябра.

- Люблю кірнуць, - прамовіў сябра, выціраючы рукавом крывавую пену з вуснаў, - асабліва пад балдою. - Лёшка ўзьняў вочы, і яркі маладзік сьветлымі кропкамі адбіўся ў ягоных зрэнках.

Балдою сябрук называў месяц. Слоўца гэтае ён прывёз з аршанскай зоны, і яно, як і шмат якіх іншых слоў з таго рэпэртуару, намёртва прыліпла да языкоў бычкоўскай дзятвы.

Лёшка плюхнуўся на траву, задаволена адрыгнуў, дастаў папяросу.

- Слухай, хто гэта ўчора мае коры насунуў? - запытаўся ён у Івана, і той, хаця і ведаў, куды заляцеў Лёшкавы чаравік, страсянуў галавою.

- Ну і ваўчары, - прастагнаў сябрук, ізноў прыклаўся да пляшкі, і неўзабаве панурыўся тварам у быльнік.

Танцы, як заўсёды, пачыналіся вальсам, і танчылі яго, як заўсёды, дзьве пары: бібліятэкарка Забаронька са сваім кавалерам Юркам Гулем і настаўніца Кніповіч зь Люськай Халімонавай. Бібліятэкарка вальсавала адмыслова - задзёршы галаў і адкінуўшы назад правую руку, і кавалер ейны, стрымліваючы кружэньне партнэркі, так імпэтна шоргаў чаравікамі, што заглушаў голас Валерыя Абадзінскага. Танчылі, вядома ж, пад «Что-то случилось». У апошнім куплеце сьпявак пачаў заікацца - Юрка Бадуноў, які сядзеў ля радыёлы і павінен быў перасунуць іголку, забавіўся, прапусьціў момант, і кавалер, пад роспачную ікаўку Абадзінскага выгукнуў:

- Юрка... натаўку!

Калі песьня скончылася, бухгальтарка з настаўніцай, а разам зь імі і Люська Халімонава падаліся да выхаду. «Прыдзьвернік» Васька Бохан выпусьціў на двор бібліятэкарку, потым, атрымаўшы грымака, і настаўніцу, а Люську Халімонаву запіхнуў назад у залю.

- Што... што ён табе сказаў? - запыталася настаўніца ў сяброўкі, прабягаючы міма Івана.

- Сказаў, што гатовы хоць сёньня расьпісацца!

Дзяўчаты фыркнулі здушаным сьмехам, пабеглі за клюб, а Іван пасьля такіх слоў зябка перасмыкнуў плячыма. Вечаровы халадок прабіраў да дрыжыкаў, сьцягваў скуру на сьпіне, і,

каб нейкім чынам сагрэцца, даводзілася раз за разам прыпальваў папяросу.

- Харэ лівэр ціснуць! Дзеўкі млеюць! - крыкнуў Юрка Гуль, махнуў рукой малому Бадунову, і хлопцы, што гуртаваліся на ганку, пачалі заходзіць у залю. Юрка Бадуноў завёў хуткі музон, а ягоны старэйшы цёзка забухаў чаравікамі, дэманструючы пабачаны ў азярышчанскі рэстаране мадняцкі танец. Тупаў Юрка Гуль так натхнёна, што са столі сыпалася пабелка, а са стэнду «Новае ў жывёлагадоўлі», які вісеў ля сцэны, звалілася некалькі брашураў. Магчыма, і сам стэнд грымнуўся б долу, ды тут у пройме ўваходных дзьвярэй зьявілася Мандрычыха і пагрозьліва загадала:

- Пакіньце мазгатаць!

Загадчыца клюбу прайшла па залі, рашуча вырвала штэпсэль радыёлы. Каб даняць загадчыцу, Юрка Гуль яшчэ хвіліну скакаў бяз музыкі, а калі Мандрычыха, плюнуўшы ў ягоны бок, пайшла да дзявярэй, рушыў за ёю сьледам.

Іван стаяў ля сьцяны і ўсім сваім выглядам паказваў, што памірае ад суму. Ён раз-пораз пазяхаў, крывіўся, кідаў пужлівыя позіркі на Юрку Бадунова і з жахам чакаў, калі Юрка завядзе павольную музыку. І вось Юрка ўключыў радыёлу, паставіў на дыск гнуткую кружэлку, і навакольны сьвет напоўнілі шчымлівыя акорды «Анжэлы». «Анжела, ты на счастье мне судьбой дана-а...» - зацягнуў Абадзінскі, а знадворку, заглушаючы сьпевака, надрыўна гаркнулі:

- За капыты, за капыты бярыце!

З начной цямрэчы выплылі падэшвы зношаных чаравікаў, і ў залю, наперад нагамі, унесьлі Лёшку Мандрыка. «Кароль аршанскай зоны» быў у поўным «вырубоне».

- Цяжкі, халера! - выдыхнуў Юрка Гуль, трымаючы «караля» пад пахі.

Хлопцы занесьлі Лёшку ў канец залі, усьпёрлі на кучу бязладна зваленых крэслаў, і Юрка Гуль, мяльком зірнуўшы на бібліятэкарку, гучна абвясьціў:

- Запрашаюць жанчыны!

- Паскуда! - выдыхнула Забаронька, выбегла з залі, а Юрка Бадуноў чарговым разам уключыў «Анжэлу».

Слухаючы шчымлівую мэлёдыю, Іван заплюшчыў вочы, уяўляючы, што гэта не Абадзінскі, а ён, Іван, сьпявае прачулую песьню, а калі зноў зірнуў на сьвет, дык убачыў, што Маша ўстала з крэсла і ідзе праз залю ў ягоны бок. Стукалі туфлікі па расссохлай падлозе, парывіста білася сэрца, пранікнёна, зь пяшчотным прыдыханьнем сьпяваў Абадзінскі. Яшчэ была спадзеўка, яшчэ была кволая надзея, што Маша ішла запрашаць некага іншага. Іван зірнуў па баках, ступіў крок да дзьвярэй і пачуў раптам такі мілы і такі лагодны голас:

- Вас можна?

Шаснаццаць гадоў пражыў Іван на сьвеце, а на белы танец яго запрашалі ўпершыню. Ды што там танец... ён і сам да дзяўчат бліжэй як на тры мэтры не падыходзіў, а тут адразу такое... Таму і зьмяніўся Іван з твару, і язык ягоны прысох да паднябеньня, і ня здолеў Іван паведаміць прыгажуні, што ён не танцуе.

- Вас можна? - паўтарыла дзяўчына, і нехта, відаць, Васька Бохан, штурхнуў яго ў сьпіну. Ён прайшоў на ватных нагах на сярэдзіну залі, стаў там як укапаны, і Маша паклала яму на плечы свае танклявыя рукі.

«Анжела, ты одна, одна на свете, Анжела, в добрый час тебя я встретил...»

Трэба было варушыцца, пераступаць з нагі на нагу, хаця б дзеля таго, каб прыхаваць праклятыя дрыжыкі. Падпарадкоўваючыся Машыным рухам, ён зрабіў крок, наступіў дзяўчыне на туфлік і, спалохана падскочыўшы,

ударыў партнэрку нагой ў шчыкалатку. Маша войкнула, адступіла на мэтар, але рук з Іванавых плячэй не зьняла. Разам з апошнімі ўсхліпамі Абадзінскага спакутаваны Іван крутнуўся на абцасах і замест таго, каб правесьці дзяўчыну да месца ці хаця б кіўнуць галавой, неакрэсьлена крэкнуў і выйшаў на падворак.

На падворку было халодна і месячна. Мяккае сьвятло маладзіка высьвечвала кусты ля гатаўскай дарогі, бункер траянаўскага камбайна і нечую пахілую постаць - ці не самога Траяна, - якая краталася між кустоў, то ўзьнікаючы, то зьнікаючы зь відавоку.

Няўдалы танцор сядзеў на ўсходах ля дзьвярэй кінабудкі і, пацепваючыся ад холаду, прыслухоўваўся да галасоў, што далятаялі з клюбу. У клюбе між тым скакалі «шэйковіча». Музыкі не было чуваць: адно зумкалі шыбы ды здрыганаліся ад тупату дашчатыя сьцены.

- Ну чаму, чаму я такі? - шаптаў начны летуценьнік, раз-пораз шморгаючы азяблым носам.

У носе сьвярбела. Іван доўга зьбіраўся зь сіламі, каб чхнуць, а калі сабраўся і ўжо затрос галавой, з адчыненых дзьвярэй клюбу вырваўся вясёлы віскат Люські Халімонавай.

- Адчапіся, нам дахаты трэба!

Чхаць не выпадала - трэба было хавацца, і начны летуценьнік, пацёршы далоньню пераносьсе, пабег на нягнуткіх нагах у бліжэйшыя кусты.

Зарагатаў і аціх Васька Бохан, крыкнуў штосьці няўцямнае Юрка Гуль, і па цэмэнтавым ганку дробна застукалі дзявочыя туфлікі.

- Слухай, а хто ён такі? - запыталася Маша, калі яны зь Люськай падышлі да матацыкла.

- Хто, Васька?

- Ды не... Ну той, дзіўны такі...

- А-а! Дэсантнік! - Люська азірнулася, падбегла да кустоў, за якімі хаваўся начны летуценьнік, і, прысеўшы на кукішкі, прамовіла: - У яго ня ўсе дома. Чокнуўся, як зь вежы падаў.

У цемры мільганула дзявочае сьцягно, ірванулася да каленяў палоска белых майтак, і ў Івана, які аглядаў усё гэта, на момант спынілася сэрца. Ён і ня сьцяміў адразу - пра якога гэта дэсантніка вядзе гаворку Люська Халімонава, а калі сьцяміў і абурана глынуў паветра, у носе ягоным зноў засьвярбела, і ён аглушальна чхнуў. Люська войкнула, пабегла ўпрысядкі да матацыкла, на хаду нацягваючы майткі, а Іван, страсянуўшы галавой, чхнуў ёй усьлед чатыры разы запар.

Дахаты ён ішоў, сьціскаючы кулакі і ўголас лаючы Люську Халімонаву.

«Нічога, яшчэ пашкадуе, - супакойваў сябе Іван. Апанаваны ўласнымі фантазіямі, ён уявіў, як роспачна будзе плакаць Люська Халімонава, і нечакана ступіў нагой у каровіну «аладку». Фантазіі выпетрыліся з галавы, і Іван, выціраючы чаравік аб траву, з рашучасьцю, на якую толькі быў здольны, вырашыў не хадзіць болей на танцы.

Ноччу яму добра спалася. Ён праспаў да абеду і абудзіўся, як і мінулым днём, ад бразгату вёдраў на доле.

- Слухай, тут жа ў Азярышча Карзо прыяджаў, - прамаўляла, гучна бразгаючы вёдрамі, суседка Міронаўна, - дык і гэтая папёрлася... Людзі казалі - лезла нейкую кніжку падпісваць, а той на яе і не зірнуў нават.

- А на каго там глядзець? - падтрымала Міронаўну маці. - Пыса як у той рапухі... і куды ўжо лезеш?

Мандрычыха, а гэта яе абгаворвалі жанчыны, пад час вайны была ў партызанскім атрадзе - мыла там бялізну ды з камандзерам спала. І вось за гэтыя подзьвігі Карзо яе па вайне ў райкам уладкаваў, у аддзел прапаганды і агітацыі. Ад тых

часін жанкі яе і зьненавідзелі, і абгаворвалі пры кожным зручным выпадку.

Паслухаўшы плёткі, Іван занурыў галаву ў падушку, мерачыся паспаць яшчэ якую гадзіну, але тоўшчу падушкі прарэзаў жаночы лямант:

- Бабы, што скажу!

Лямантавала Карпачыха. Іван скінуў з галавы падушку, прыслухаўся.

- Ляжыць у амбуляторыі... і морда ў крыві, - гукала з суседняга агароду Карпачыха. - Карпачыха бегла па гародзе і пад нагамі ейнымі спалохана шамацела капуснае лісьце.

- Уся морда? - перапытала Міронаўна, а маці, пляснуўшы ў далоні, улякнута выдыхнула:

- У каго?

- У Гарашчэні! У п'янтоса гэтага... Пракопаўна краму адчыняла, а тут ён падбег... кажа: «Чаму Лёшку Мандрыку віно прадаяце, а мне не?» - і Пракопаўну за руку схапіў. А тая доўга ня думала. Разгарнулася ды як лясьне замком па лобе. Так лоб і расьсекла.

Карпачыха змоўкла, пераводзячы дых, і цяпер ужо Міронаўна дала волю сваім лёгкім:

- Ці чула ты? Гарашчэню забілі-і! - крыкнула Міронаўна, праўдападобна, цётцы Авадзісе, і на доле зноў зашамацела капуснае лісьце.

... Сонца адбірала вочы. Іван прымружыўся, паглядзеў з-пад рукі ў бок Авадзішанага агароду, на якім тым часам ўжо сабраўся збой жанчын, і, прыпаліўшы папяросу, усеўся на верхняй папярочцы драбінаў.

На душы было пагана, а на двары пустэльна; нават куры некуды пахаваліся, і толькі певень з паскубаным хвастом

стаяў ля дзьвярэй хлеўчука, пазіраючы на Івана круглявым вокам.

«Вунь і певень глядзіць, - падумаў Іван, зацягваючыся пяршывай папяросай. - Відаць, прачуў ужо пра маю ганьбу?» - І, ня ведаючы, чым заняць сьвярблівыя рукі, шпурнуў у пеўня кавалкам бярозавай кары.

Певень падскочыў, залапатаў крыламі, выставіў наперад грудзіну і праз імгненьне прарэзаў сьвет кукарэканьнем, запрашаючы курэй паглядзець на таго, хто так абняславіў сябе на ўчарашніх танцах.

Пасьля абеду маці папрасіла схадзіць па хлеб. Ісьці, вядома, не хацелася: сорамна было зьяўляцца на людзях, але што паробіш... Давялося ўсё ж узяць сетку і рушыць у краму.

Ля крамы гаманіў натоўп. Вясковыя цёткі, павесіўшы на рулі сваіх вэласыпедаў торбы з хлебам, на розныя галасы абмяркоўвалі падзеі сёньняшняга ранку, пад час якіх магазыншчыца Пракопаўна разьбіла пысу вартаўніку Гарашчэню.

Іван азірнуўся, шукаючы вачыма Машын матацыкл, ступіў на сельмагаўскі ганак і пачуў, як недзе непадалёку сіплавата зарагатаў Лёшка Мандрык.

Лёшка стаяў сьпінаю да Івана, праваруч ад уваходу, і, махаючы рукамі, распавядаў Міронаўне, вядомай бычкоўскай пляткарцы, як яно ўсё было.

- Гарашчэня да Пракопаўны падышоў і кажа: «У цябе ў прысенку «вэрмут» схаваны. Дзьве скрыні. Не прадаш - ноччу сам вазьму», - і заграбкі Пракопаўну хапануў. - Паказваючы, як Гарашчэня хапаў магазыншчыцу «заграбкі», Лёшка схапіў Міронаўну за рукаў, Міронаўна адкаснулася, плюнула, а Іван, каб не патрапляць Лёшку на вочы, сьпехам шмыгануў у краму.

Крама ў Бычках - самае люднае месца. Калі не прыйдзеш - увесь час народ таўчэцца. Вясковыя цёткі сюды ня столькі па

справункі прыходзілі, колькі дзеля таго, каб апранахі перамацаць, якія на паліцах віселі. Прыйдзе якая, грудзямі на прылавак наваліцца і давай носам па баках вадзіць:

- А пакажы ты мне, Пракопаўна, вунь тую кофту... - І Пракопаўна давала, хаця і ведала, што кофту тую браць ня будуць, бо яна ўжо тут дзесяць гадоў вісіць.

Лаючы ў душы цётак і штохвілі ўздрыгваючы ад грукату матацыклаў знадворку - крый Бог, Маша прыедзе, чырваней тады, - Іван болей як гадзіну прастаяў у чарзе, а калі, нарэшце, узваліў на карак сетку зь цёплымі буханкамі і выйшаў з крамы, дарогу яму заступіў Лёшка Мандрык.

- Ваня! Куды хіляем? - рыкнуў Лёшка голасам чалавека, які прагнуў пахмяліцца.

Лёшка зазірнуў Івану за сьпіну, адламаў ад буханкі храбусткі акраец. «Кароль зоны» з асалодаю хруснуў скарынкаю, а Іван, апусьціўшы вочы, падумаў: «І як ад яго адчапіцца?» І не пасьпеў Іван уздыхнуць, як ля крамы загуў бэнзавоз і з кабінкі вытыркнулася галава Юркі Гуля.

- Лёха, давай сюды!

- Навошта? - азваўся «кароль», глынуўшы недажаваную скарынку.

- У Азярышча едзем, па піва! - Юрка выцягнуў з-пад сядзеньня поліэтыленавую каністру, а Лёха, адламаўшы ад бохана ладны кавалак, пабег да машыны.

Маці дома не было: на дзьвярах вісеў замок, а за дзьвярною клямкаю тырчэла раённая газэта «Зара камунізму» і аркушык паперы. «Схадзі па камбікорм», - прачытаў Іван на паперцы і пачухаў патыліцу.

Па камбікорм трэба было ісьці да цёткі Авадзіхі. Зяць цётчын рабіў на млынкамбінаце галоўным бухгальтарам. Ну і, вядома, тое-сёе сьпісваў на цешчу. Авадзіха ў горад ледзь не

штодня наведвалася - туды бітоны з «дамагай» везла, а назад мяхі з камбікормам перла. «Дамагу» цётка зь яблычнага соку вырабляла - хмельнае віно атрымлівалася. Мінулай восені Іван сьцягнуў у сваячкі тры літры - трэба было Ваську Бохана падпаіць, каб не чапляўся. Авадзіха пасьля той прапажы доўга супакоіцца не магла, нават брата свайго, міліцыянта Міхнова, выклікала. Міхноў тры дні з рулеткай важдаўся, мераў штосьці каля пограбу; выпіў болей, чым укралі, а злодзея так і не знайшоў.

Ачуўшыся ад одуму, Іван разгарнуў раёнку, зірнуў на зводку ўборкі лубіну, і лічба «0,1%», а менавіта столькі лубіну скасілі ў калгасе «Шлях камунізму», прывідна заскакала ўваччу.

... Цётка сядзела ў пограбе і звонку быў бачны ейны шырокі азадак. Іван прайшоўся па двары, разважаючы - з чаго пачаць гаворку, і пакуль ён гэта рабіў, цётка Авадзіха неяк вельмі хутка вылезла з пограбу і гэтак жа хуценька павесіла на прабой амбарны замок.

- Цяпер ня ўлезеце, - крэкнула Авадзіха, перахапіўшы Іванаў пагляд, - разьвялося фулюганьня... ратунку няма.

Пасьля такіх слоў размаўляць пра віно не было сэнсу. Іван сплюнуў цягуткую сьліну, азірнуўся і рашуча запытаў:

- Дзе камбікорм?

- Вунь, ля плоту стаіць, - кіўнула цётка на латаны мех. - Лорцы скажаш, каб грошы прынесла. Шэсьць рублёў.

- Скажу, - буркнуў Іван, узваліў мех на сьпіну і шырокім крокам рушыў па цётчыным агародзе.

- Чаго ты па бураках пайшоў? - крыкнула наўздагон яму цётка, і пляменьнік, перакінуўшы мех цераз плот, скрозь зубы працадзіў:

- Ды пайшла ты... жмінда няшчасная.

Хаця й заракаўся Іван не хадзіць у клюб, а згледзеў, седзячы на драбінах, бэнзавозку, што з гораду вярталася, і засьвярбела ў душы жаданьне - зірнуць, ці напіўся Лёшка Мандрык. Бо калі напіўся і не стаіць на нагах, дык і хваляваца няма чаго - да Машы сёньня чапляцца ня будзе. Іван праводзіў позіркам бэнзавозку, пачакаў яшчэ хвіліну ў тайнай спадзеўцы ўбачыць на дарозе Машын матацыкл, і толькі потым, пацёршы здранцьвелы азадак, спусьціўся па драбінах долу.

Юрка зь Лёшкам сядзелі ў Лябёдкі: з прачыненага вакна кінабудкі вырываліся іхныя галасы і жаласьлівыя ўздыхі.

- Піва, піва... паперліся як фофаны... - гукаў Лёшка Мандрык, футболячы па цэмэнтавай падлозе пустую каністру.

- Хто ж ведаў... учора прадавалі, - апраўдваўся Юрка Гуль, і пустая каністра зь левага кута пераляцела ў правы.

- Прадава-алі, - голас Лёшкаў панік, чаравікі ягоныя зашоргалі ля бліжняй сьценкі і з прачыненага вакна вылецеў сьлінявы недакурак.

- Перапіхнуцца зь якой, ці што? Чуеш, Юрка? - Юрка прамаўчаў, а Лёшка, дзьмухнуўшы ў папяросу, запытаў: - А што гэта за лярва на матацыкле езьдзіць?

- Зь Ленінграду. Баркоўскага пляменьніца, - Юрка пазяхнуў і, выдыхаючы паветра, мацюкнуўся.

Ад такіх слоў у Івана перахапіла дыханьне. Ён прыціснуўся да сьцяны кінабудкі, наструніў слых, але болей нічога не пачуў, бо Лябёдка завёў сваю перамотку і галасы патанулі ў напорлівым гудзе.

Іван пастаяў яшчэ пару хвілін, а потым пацёгся прэч, асуджана пацепваючы паніклай галавою. І поўныя жаху карціны паўсталі перад вачыма: ён уявіў, як Лёшка будзе цалаваць Машу, як будзе зьдзіраць зь дзяўчыны вопратку, і ў галаве ягонай нарадзілася ідэя. «Перапыніць Машу,

перахапіць па дарозе, як на танцы паедзе», - і апанаваны такою думкаю, Іван рушыў на гатаўскую праселіцу.

Сядзець у кустах давялося аж да цёмнага. Ужо і зоркі высыпалі на небе, і кіно пачалося ў клюбе, а Маша ўсё ня ехала, і якраз у той момант, калі Іван хацеў ужо вылезьці са свайго схову, з боку Гатава пачуўся матацыклетны рокат. Рокат мацнеў, убіраўся ў сілу, сухім трэскам рассыпаўся па кустах, і па тым нязладжаным пошчаку можна было зразумець, што па дарозе ехалі два матацыклы. Іван вытыркнуўся з кустоў, наструніўся і ўпалым голасам прашаптаў:

- Сашка Собалеў.

Колькі часу ён сядзеў у непаразуменьні, потым пацёр рукою лоб і, прадзершыся скрозь кусты, пабег насустрач бязладнаму рокату.

«Спыню на павароце, як Сашка праедзе. Самае зручнае месца», - мітусіліся ў галаве адрывістыя думкі, а вусны раз-пораз паўтаралі кагадзе прыдуманую фразу: «Маша, спыніся... у клюбе бойка!»

Каб апраўдаць гэтую вэрсію, ён на хаду расшпіліў кашулю, пацёр кулаком вока, хацеў яшчэ і нос расквасіць, але перадумаў. І вось ужо праляцела міма, дыхнуўшы ў твар халодным пылам, Сашкава «Панонія», і новым строкатам - мерным і басавітым - напоўніліся вушы, і з жахам адчуў Іван, што забыў тую фразу, якую зьбіраўся выгукнуць.

Матацыкл быў ужо зусім блізка, калі Іван, страціўшы надзею згадаць патрэбныя словы, рынуў на дарогу. У вочы ўдарыла сьвятло ад фары, рухавік «Іжа» завыў на фарсажы, і матацыкл са страшным трэскам абрынуўся ў алешнік.

Хвіліну панавала цішыня, і парушыў яе дрыготкі Машын голас:

- Люся, ты жывая?

- Жывая, толькі нагу парэпала.

Зашамацела лісьце, трэснула галіна, і Люська Халімонава спачатку аддзьмулася, а потым натужліва крэкнула. Мяркуючы па ўсім, дзяўчыны выкочвалі матацыкл на дарогу.

- Хто гэта быў? - запыталася Маша, на хаду абабіваючы спадніцу.

- Ванька Бянькоў. Я ж табе казала, што ён ненармальны.

Матацыкл чхнуў... раз... другі, потым завёўся, і сярод перарывістага матацыклетнага рокату Іван яшчэ раз пачуў усхваляваны Машын голас:

- Ідыёт. Ледзь пад колы не патрапіў.

Дахаты ён цягнуўся, не разьбіраючы дарогі, і вочы ягоныя засьцілі сьлёзы. Сьлёзы пякучай крыўды на Лёшку Мандрыка, на Люську Халімонаву, на сябе самога віхлястымі раўчукамі зьбягалі па твары, бліскучымі пацеркамі дрыжэлі на падбародзьдзі; і жоўты маладзік калыхаўся ў небе, як на хвалях бязьмежнага акіяну, і Траянаў камбайн, што стаяў на ўзьмежку Карпачышынага агароду, здаваўся нейкай вялізнай пачварай, якая выплыла на імгненьне з акіянскіх глыбіняў.

Ідучы паўз камбайн, Іван выцер рукавом вочы, усхліпнуў на астачу, і ўсхліп гэты супаў з глухім бразганьнем пад нагамі. Траян вось ужо другі дзень рамантаваў зламанае матавіла, і навакольле было закіданае рознымі жалязякамі. На прамасьленай ватоўцы ляжала кучка шрубных ключоў, стаяла, дзержаком угору, пудовая кувалда, а пасярод іржышча тырчэла, цьмяна бліскаючы ў месяцавым сьвятле, пакарабачаная манціроўка. Іван зладзеявата шморгнуў носам, пужліва агледзеўся. Страшная думка, ад якой зварухнуліся валасы на галаве, уварвалася ў сьвядомасьць, і падуладныя ёй дрыготкія рукі спачатку прылашчылі валасы, а потым падхапілі пакарабачаную манціроўку.

Бычкоўскую краму - струхлелую, перабудаваную некалі з кулацкай хаты будыніну, - рабавалі ледзь не штогоду. Балазе рабаваць яе было адно задавальненьне. Торкні пальцам у той жа дах - і праб'еш навылёт: дранка на даху зусім збуцьвела. Дарэчы, Хведзька, брат Ваські Бохана, менавіта праз дах і ўлез. Сто рублёў тады ўзяў і дзесяць пляшак мятнага лікёру. Тры дні піў, у лазьні схаваўшыся, а на чацьверты паехаў у Азярышча пляшкі здаваць - тут яго і злапалі. На судзе прасіўся, каб у Сьвярдлоўскую вобласьць паслалі, туды, дзе раней сядзеў. Казаў, дужа там мясьціны прыгожыя. Хведзька Бохан быў адзіны, хто грошы ўзяў. Усе астатнія рабаўнікі - тыя як людзі... Скрыню віна якога выносілі ды пару бляшанак кансэрваў на закуску. Ноччу рабавалі, а раніцай, працьверазеўшы, грошы прыносілі. Вунь электралінейшчыкі, дык тых і ў турму грэх было садзіць. Жылі, небаракі, у кузьні - у хату ніхто не пускаў, бо яны ў суседняй вёсцы адрыну спалілі па неасьцярожнасьці. Вось і давялося электралінейшчыкам у сярэдзіне лістападу ў кузьні жыць, зубамі ад холаду ляскаць. А на кастрычніцкія сьвяты, канчаткова адубеўшы, у краму ўлезьлі. Усю ноч гарэлкаю грэліся ды на гармоніку гралі, а раніцай да Пракопаўны прыйшлі... з пакаяньнем. Таго ж дня сьвятло ў вёску далі і крамныя дзьверы бляхаю абабілі. Але ўсё адно брыгадзір іхны на «хімію» паехаў - як высьветліліся, ён ужо так чацьверты сельмаг рабаваў. І вось, праз два з паловаю гады пасьля тых падзеяў, прабіў і Іванавы час лезьці ў краму.

«Чарніла», па словах вартаўніка бычкоўскай крамы Гарашчэні, стаяла ў прыбудове. «Вазьму пару пляшак, пакладу дзе-небудзь, каб Лёшка ўбачыў... З ночы нап'ецца, а ўраньні міліцыя абудзіць...» - з гэтымі думкамі Іван і падышоў да Гарашчэневай хаты. У вокнах хаты ліпела кволае сьвятло: лямпачка гарэла дзесьці ў прысенку і гэта сьведчыла за тое, што вартаўнік мог зьявіцца на аб'екце ў любую хвіліну.

Дзіўна, але ён зусім не хваляваўся, і толькі даткнуўшыся плечуком да плоту, адчуў, як да холаду манціроўкі, якую хаваў у рукаве, дадаўся непрыемна-казытлівы халадок у пахвіне.

... Плот быў гэткі ж, як сама крама: дошкі шмат дзе падгнілі, трымаліся на адным цьвіку, і Йван, адсунуўшы адну зь іх, спрытна ўлез у дзірку. Трэснула пад нагою кара, прашапацела над галавою начніца, і халадок, які нарадзіўся ў пахвіне, вомігаў разьліўся па ўсім целе. Тут, у закутку, які ўтваралі збуцьвелы плот і крамная сьцяна, захоўвалі некалі лазовую кару. Яшчэ і Іван памятаў, як маці разам зь іншымі жанчынамі хадзіла ў зарэчныя кусты, дзерла там лазовую кару і потым, высушыўшы на сонцы, несла здаваць у краму. Лазу ўжо даўно ніхто ня дзер, а вось плот ды прысьценак, дзе яе захоўвалі, засталіся і паволі буцьвелі на дажджы і сонцы.

Намацаўшы дрыготкімі пальцамі прабой на дзьвярах прыбудовы, Іван выцягнуў з рукава манціроўку і прыслухаўся. Яму падалося раптам, што дзесьці зусім побач трэснула кара і нехта здушана кашлянуў. Анямелымі рукамі ён упіхнуў манціроўку ў прабой, пацягнуў мэталёвае дзяржальна, і амбарны замок з грукатам зваліўся пад ногі. Ён ступіў у прысьценак, памацаў нагою ў цемры, наткнуўшыся спачатку на пустое вядро, потым на нейкае жалезьзе, і нарэшце да вуха ягонага даляцеў такі лагодны і такі жаданы бразгат напоўненых бутэлек. Сунімаючы дрыготку, Іван разапхаў бутэлькі па кішэнях, піхнуў адну бутэльку за пояс штаноў і, наступіўшы ў поцемках на вядро, пакінуў месца злачынства. Прабіраючыся ўздоўж сьцяны, ён паспрабаваў разгледзець этыкетку на бутэльцы, а прачытаўшы дзіўнае слова «ацэтон», спалохана войкнуў. Нейкая шалёная сіла вывернула руку, прыціснула да зямлі; зямля кульнулася дагары нагамі, і разам са звонам разьбітай бутэлькі пачуў Іван злавесны голас:

- Папаўся, зладзюга!

Тое, што адбывалася потым, успрымалася як нейкі вусьцішны сон. Яму заехалі па шыі, павялі некуды ў бок Зарэчанскай вуліцы, потым стукнулі яшчэ раз, хоць ён і не супраціўляўся, і, узьняўшы за каршэнь у паветра, пасадзілі ў матацыклетны вазок. Ён паспрабаваў устаць, яму заехалі трэцім разам, з калашыньня штаноў выпала бутэлька, і ён, плюхнуўшыся на сядзеньне, суціх да часу, з галавою накрыўшыся каляным брызэнтам. Пасьля кухталёў увушшу натужліва зьвінела. Ён амаль нічога ня чуў, і здавалася, што паветра ў лёгкія паступае праз вушы. У вазку трэсла, ад выхлапной трубы перла задушлівым гарам, і на Івана ўжо на першых кілямэтрах дарогі найшло ачмурэньне...

... Яшчэ ў люльцы яго званітавала. Яму паляпалі па шчоках, пырснулі ў твар вады, пацягнулі, трымаючы пад пахі, па нейкім даўгім калідоры і неўзабаве, абклаўшы незласьлівымі мацюгамі, паклалі на жалезны ляжак. Ён удыхнуў халаднаватае, прапахлае прыбіральняй паветра, злавіў краем вуха нечы магутны храп, і суціх незварушна, разважаючы - што гэта было: жахлівы сон, ці хваравітае трызьненьне?

Раніцою яго абудзіў зычны голас:

- Мамедаў, на выхад!

У куце зарыпеў ложак, і той, каго клікалі Мамедавым, усхапіўся на ногі. Сукамэрнік памахаў у паветры рукамі, папрысядаў дзеля разьмінкі і пад незадаволеныя воклічы сяржанта, што стаяў ля ўваходу, выйшаў з камэры.

Іван павярнуўся на другі бок, пацёр зьнямелую шыю - спаць давялося на жалезнай сетцы, - і задумаўся.

«Што рабіць?» - думаў Іван, тупа пазіраючы на брудную сьценку. Ён шмат разоў паўтарыў у думках гэтае пытаньне, але адказу не знайшоў. Адлежаўшы правы бок, ён крутнуўся на правы і ў той жа міг пачуў незадаволены голас каўказца:

- Я патрабую начальніка! Што вы мяне да гэтага хлапчука водзіце?

Потым бразнула завала, і дзьверы з працяглым рыпам адчыніліся. Іван прыўзьняўся на локце, але замест шаргатлівых крокаў пачуў нешта зусім іншае.

- Ну як, званіў? - запытаўся каўказец зьнацку аціхлым голасам.

- Званіў. Ніхто не падымае, - адказалі з калідору, і каўказец, сказаўшы штосьці па-свойму, выцягнуў з кішэні нататнік.

- Пазвані па гэтым, - шапянуў ён, вырываючы аркушык, пасьля чаго дзьверы з бразгатам зачыніліся.

- Эй, ты хто? - выдыхнуў Мамедаў, толькі цяпер заўважыўшы, што ён у камэры не адзін.

- Бянько-оў, - адказаў Іван, ня ў сілах утаймаваць дрыготку ў голасе. У гэты момант ён згадаў Лёшкавы аповеды пра асобаў каўкаскай нацыянальнасьці, якія лютуюць у камэрах, і яму стала не па сабе.

- Што, зарэзаў каго? - запытаўся Мамедаў.

- Ды не... У краму залез, - прашаптаў Іван са свайго кута, намагаючыся не глядзець на каўкасца.

На радасьць Івану, сукамэрнік плюхнуўся на ложак, памаўчаў хвіліну, зь веданьнем справы запытаўся:

- Колькі ўзяў?

- Пя-аць! - усхліпнуў Іван, але пра тое, што ў пляшках было не віно, а ацэтон, прамаўчаў.

- Э-эх! Ці варта было з-за пяці штук рукі пэцкаць? - з запалам вымавіў каўказец і, аглушальна рыпнуўшы спружынамі, кульнуўся на бок.

І сапраўды - ці варта? Думка заварушылася, закружыла ў галаве. Іван уявіў, як роспачна будзе плакаць маці, пачуўшы

пра ягоную бяду, і да таго ірэальнага плачу дадаўся зусім рэальны бразгат дзьвярэй.

- Эй ты, шкет! Выходзь! - загадаў, як адрэзаў, сяржант, і Йван, зваліўшыся з ложка, дробна затупаў да выхаду.

Габінэт, у які яго завялі, быў спрэс застаўлены сталамі ды сэйфамі, і за адным з тых сталоў сядзеў, гартаючы нейкія паперы, малады ружовашчокі лейтэнант. Убачыўшы затрыманага, лейтэнант склаў паперы ў стос, мяльком кіўнуў на крэсла, і Йван зразумеў, што гэта ён, ружовашчокі лейтэнант, злапаў яго каля крамы.

- Што, Гарашчэня, даскакаўся? - мэталёвым голасам прамовіў лейтэнант, калі пад Іванам рыпнула крэсла. - Смаркачы пад носам не абсохлі,а ўжо ў краму лезеш...

- Я не Гарашчэня, - выдыхнуў Іван, і ніжняя губа ягоная плаксіва затрэслася.

- Як не Гарашчэня? - зьніякавеў лейтэнант і ўжо зусім лагодным голасам запытаў: - А хто?

Іван удыхнуў паветра, мерачыся сказаць сваё прозьвішча, але ў гэты міг лейтэнант падхапіўся на ногі і абцягнуў мундур.

- Хвацка ты, лейтэнант... За тры дні працы - два затрыманьні, - прамовіў ад дзьвярэй каржакаваты дзядзька ў шэрым гарнітуры, і па той рашучасьці, зь якой лейтэнант падскочыў на ногі, Іван палічыў, што гэта ўвайшоў генэрал.

- Адкуль? - запытаўся генэрал, зь цікаўнасьцю агледзеўшы затрыманага.

- З Бычко-оў... - прабляяў затрыманы, і мыскі генэральскіх чаравікаў задрыжэлі і расплыліся ў ягоных вачах.

- Што, у краму ўлез? - генэрал прысеў на край стала, чакаючы тлумачэньняў, але Іван маўчаў, і генэрал перавёў позірк на лейтэнанта.

- Напярэдадні сыгнал быў. Бычкоўская магазыншчыца тэлефанавала. Сказала, што ўночы зьбіраюцца ў краму залезьці. Ну я і выехаў... прыхаваўся там...

- Зноў Бычкі, - з уздыхам прашаптаў генэрал. - Даўно ўжо трэба было гнаць гэтага Міхнова, генэрал зьлез са стала, выцягнуў з пачка папяросу, ізноў утаропіўся на Івана.

- Як тваё прозьвішча?

- Бянько-оў, - пралепятаў Іван.

- Бянькоў? - генэрал выпусьціў з роту шызы дым, летуценна паглядзеў на столь. - Гэта ня ты ў Віцебску шапік абабраў?

Пасьля такога пытаньня Іван яшчэ больш сьцяўся, і галава ягоная ўбілася ў плечы.

- Ну?! - пагрозьліва гукнуў лейтэнант.

- Я-а-а-а... - другім разам прабляяў Іван і спалохана заплюшчыў вочы. Ён чакаў грымотнага кухталя, але не дачакаўся.

Генэрал кашлянуў, павольнай хадою прайшоўся па габінэту.

- Што ён там сьцягнуў?

- Пяць пляшак ацэтону. Можа і яшчэ што - уначы не разгледзеў.

- Ацэтону? Яны ўжо там ацэтон п'юць? - генэрал узяў Івана за чупрыну, зьлёгку тузануў угору. - А чарняўскую краму ня ты абабраў? - прыкідваючы, ці мог затрыманы абабраць і чарняўскую краму, генэрал разважліва мыкнуў, зьбіраючыся нешта сказаць, ды тут расчыніліся дзьверы і вясёлы дзявочы голас паведаміў:

- Іван Іванавіч, вас да тэлефону!

Іван Іванавіч шпурнуў у адчыненую фортку папяросіну, выйшаў з габінэту, і лейтэнант зь нейкім дзіўным шкадаваньнем паглядзеў яму ўсьлед.

- Дык як, ты кажаш, тваё прозьвішча? Бянькоў? - лейтэнант узяў у рукі самапіску, патрос яе, каб ямчэй пісала, прыклаўся да паперы. Інтанацыя, зь якой ён гэта сказаў, сьведчыла за тое, што ён згубіў да падсьледнага ўсялякую цікавасьць.

- Бянькоў, - буркнуў Іван і, апярэджваючы новыя пытаньні, дадаў: - Іван Васілевіч.

- Дзе і калі нарадзіўся? - лейтэнант ізноў патрос асадку.

- У пяцьдзесят пятым годзе, на станцыі Назарбай...

- Як-як ты кажаш? Назар...

- Назарбай, - па складах прамовіў падсьледны, - Цалінаградзкай вобласьці.

Пёрка асадкі адчайна рыпнула, лейтэнант шпурнуў асадку на падлогу, вылаяўся і абхапіў рукамі галаў. Ён адседзеў у такой паставе хвіліну, а можа, і болей і ачуўся толькі тады, калі пачуў генэральскі голас.

- Анашыст у капэзэ сядзіць? - запытаўся генэрал, прачыніўшы дзьверы.

- У капэзэ, Іван Іванавіч.

- Пратаколы па Мамедаву да мяне занясі. Я ім сам займуся, - генэрал грукнуў дзьвярыма, а лейтэнант, кашлянуўшы ў жменю, паклаў перад Іванам аркуш паперы.

- Сядай вунь за той стол, - лейтэнант азірнуўся, кіўнуў у кут, а пачуўшы таропкія крокі на калідоры, падхапіўся на ногі. Дзьверы зь ціхім рыпеньнем адчыніліся, і ў дзьвярной пройме паўстала кабета ў караценькай форменнай спадніцы.

- Леванід Сяргеевіч, вы каву піць будзеце? - гульлівым голасам запыталася маладзіца, і той, да каго яна зьвярталася, гэтак жа гульліва адказаў:

- Будзем, Валечка, абавязкова будзем. - Хвіліну лейтэнант з замілаваньнем глядзеў на дзьверы, потым абцягнуў мундур, прылашчыў валасы і, прамовіўшы: - Добра, напішаш іншым разам, - загадаў падсьледнаму падняцца.

Набраўшыся страху ў сьледчым габінэце, Іван вяртаўся ў КПЗ, як у родную хату - з усьмешкай на твары. Плюхнуўшыся на ложак, ён закінуў рукі за патыліцу, і ўваччу паўстаў чыгунок з гарачай капустай.

- Яны нас карміць думаюць? - прасіпеў, чытаючы Іванавы думкі, Мамедаў. - Хоць бы чаю якога прынесьлі, шакалы, - сказаўшы так, Мамедаў скасіўся на Івана, чакаючы, што сукамэрнік падтрымае размову, але Іван змаўчаў, і каўказец, нешта буркнуўшы па-свойму, павярнуўся да сьцяны.

КПЗ - цудоўнае месца для одуму. Вось і Івана апанавалі думкі. І думаў ён, глытаючы сьліну, пра хатнюю кілбасу, пра гарачую капусту, пра сопкую бульбу са скваркамі, і, каб пазбыцца дакучлівых думак, жаласьліва ўздыхнуў.

- Што так уздыхаеш? - гукнуў Мамедаў, якому, відаць, таксама мроілася ежа. - Згадваеш, як касу браў?

- Ды я ня ў касу лазіў, - прамовіў Іван, пацягваючыся. - У падсобку. Хацеў віна ўзяць, а ўзяў... - Іван запыніўся, маракуючы, ці варта казаць Мамедаву ўсю праўду, пасьля чаго ізноў уздыхнуў і ціхім голасам скончыў: - ...пяць пляшак ацэтону.

- Каго-каго? Ацэтону? - сукамэрнік бліснуў вачыма, гаўкліва ікнуў і так адчайна зарагатаў, што панцырная сетка пад ім азвалася працяглым гудзеньнем.

- Ну і шакалы, - прамовіў Мамедаў, нарагатаўшыся ўдосыць. - З-за пяці бутэлек чалавека ў гадзючнік уперлі.

Каўказец падняўся з ложку і, змагаючыся з позехам, прасьпяваў:

- А ты сам адкуль?

- З Баранавічаў, - без асаблівай ахвоты адказаў Іван.

- З Баранавічаў? - мяркуючы па голасе, каўказец ведаў, што гэта за горад і дзе ён знаходзяцца.

Мамедаў прайшоўся па камэры, пацёр рукі, акрыялым голасам зазначыў:

- А я зь Ленкарані. Ты Ленкарань ведаеш?

Ленкарані Іван ня ведаў.

- А Сальяны?

Сальянаў Іван ня ведаў таксама.

- У мяне ў Сальянах брат жыве. Алескерам клічуць. Такога ж узросту, як і ты. - Мамедаў зноў упаў на ложак, пазяхнуў і пачаў распавядаць Івану пра брата Алескера, пра Ленкарань, пра нейкія Талыскія горы, дзе яго, Мамедава, аднойчы злавілі памежнікі. Загаварыўшыся, ён стаў балбатаць па-свойму і прыканцы аповеду спытаўся:

- Прозьвішча тваё як?

- Бянькоў, - з пакутаю выдыхнуў Іван.

- Ну дык што, Бянькоў... Калі хочаш выйсьці з гэтага гадзючніку, я табе дапамагу. А ты мне дапаможаш, як выйдзеш на волю. Згода?

Іван у адказ кісла пасьміхнуўся. Ну чым яму мог дапамагчы гэты каўказец, які ляжаў на суседнім ложку і справаю якога зьбіраўся заняцца сам генэрал? І ўсё ж, каб не пакрыўдзіць таварыша па няшчасьці, Іван кіўнуў галавой і ўголас прашаптаў:

- Згода.

Праз пару гадзін Мамедава паклікалі на допыт. Застаўшыся на самоце, Іван доўга хадзіў з кута ў кут, потым доўга ляжаў на ложку, потым зноў хадзіў, лічачы пры гэтым крокі, і акурат ў той момант, калі ён зрабіў семсот сорак трэці крок, дзьверы камэры расчыніліся, і на парозе паўстаў перацягнуты рамянямі сяржант.

- Есьці табе прынёс, - прабурчэў сяржант, несучы алюмініевую талерку і шклянку гарбаты.

Сяржант паставіў талерку і шклянку на адкідны столік, спытаў Івана, ці хоча той у прыбіральню, і, паправіўшы на рукаве павязку дзяжурнага, выйшаў з камэры.

Іван праглынуў ежу і адчуў сябе весялей - нават замармытаў нейкую песьню з рэпэртуару Валерыя Абадзінскага, але нейзабаве зноў зажурыўся. Сядзець адному ў камэры было страшнавата, таму ён і прыслухоўваўся да кожнага калідорнага зыку, чакаючы вяртаньня Мамедава. Але сыходзіў час, усё радзей чуліся на калідоры людзкія крокі, а калі гэтых крокаў зусім ня стала чутна, Іван зразумеў, што Мамедаў ня вернецца.

Ноччу ён ляжаў, закінуўшы рукі за голаў, глядзеў на цьмяную лямпачку, што гарэла над галавой, і думаў пра маці. У начной цішы яму мроіўся матчын голас. Аднойчы ён нават разабраў словы, якія прагучалі знадворку: «Ваня, не пускаюць да цябе!» Пачуўшы гэта, ён падбег да вакенца, ухапіўся рукамі за краты і доўга наструньваў слых у намаганьня ўцяміць, ці гэта сапраўды быў матчын голас, ці гэта толькі здалося.

Раніцай наступнага дня сяржант вывеў яго з камэры і павёў па сходах на другі паверх. Яны прайшліся доўгім калідорам, павярнулі направа і спыніліся перад дыхтоўнымі, абабітымі чорным дэрмацінам дзьвярыма. Сяржант адчыніў дзьверы, упіхнуў галаву ў пройму:

- Іван Іванавіч... Бянькоў...

Іван увайшоў у габінэт, і першае, што ўбачыў, - гэта партрэт Леваніда Ільліча Брэжнева, які вісеў на сьцяне. Пад партрэтам сядзеў, апранены ў міліцэйскі мундур, Іван Іванавіч, якога Іван лічыў генэралам і які наяве аказаўся ўсяго толькі маёрам.

Іван Іванавіч акінуў цёзку калючым позіркам і, паказаўшы на крэсла, запытаў:

- На Мамедава даўно працуеш?

Іван прысеў самы на край крэсла і, ня ведаючы, што адказаць, прамармытаў:

- Нядаўна.

- А ты, Бяньков, артыст. Пагля дзець на цябе - дык дурыла дурылам. Ніколі б не падумаў, што ты на гэтую свалату працуеш, - сказаўшы слова «свалату», маёр зрабіў паўзу і кіўнуў у бок брэжнеўскага партрэту.

- Сам хоць гэтую брыдоту ня паліш?

- Якую брыдоту? - не зразумеў Іван.

- Ды анашу... анашу... - грымнуў маёр і падняўся з крэсла. - Глядзі, хлопец... Цяпер ты ў нас вось тут... - цяжкая маёрава рука апусьцілася на стос папераў. - Болей не пападайся. Згнаім! І мая табе парада - завязвай ты з гэтымі анашыстамі. Чуеш?

Маёр узяў Івана за шкірку, падвёў да дзьвярэй, і яшчэ празь імгненьне падсьледны вылецеў з габінэту, атрымаўшы пры гэтым ладнага кухталя і ня меней ладнага высьпятка. Акурат у гэты момант па калідоры ішла знаёмая кабета ў кароценькай спадніцы, і Бяньков, падаючы долу, міжволі схапіў яе за голыя калені.

- Ай, ай, хто гэта? - ускрікнула маладзіца, падскочыла на месцы, а маёр, задаволена рагатнуўшы, растлумачыў:

- Гэта яму на разьвітаньне. Каб болей не пападаўся.

Стогнучы і трымаючыся за бакі, Іван выйшаў на двор, дацягнуўся да бліжэйшай лавы і, прысеўшы на левую кумпячыну, перавёў дых. Балела ня толькі ніжэй сьпіны, але і сама сьпіна, і карак, і галава, і суворы міліцыянт з плякату, што вісеў на суседнім будынку, замарачна мітусіўся ўваччу. Ён прымружыўся, пацёр павекі і ўбачыў перад сабою задаволеную фізіяномію Мамедава.

- Паехалі, абмыем свабоду, - прамовіў каўказец і паказаў рукой на шэрую «Волгу», якая стаяла непадалёку...

KAMUNIKAT.org